Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЛІПЕНЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 132 (27742) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Вось яно якое, наша лета!**



**Хадзіце на здароўе!**



**Як выжыць у «эпоху габлінізацыі»**

СТАР. 6

*ЛІЧБА ДНЯ*

**153 дамы**

***са звышнарматыўнымі тэрмінамі будаўніцтва агульнай плошчай 866,1 тыс. кв. м уведзены сёлета ў эксплуатацыю за першае паўгоддзе. Такім чынам, у краіне ўсе запланаваныя да ўводу дамы са звышнарматыўнымі тэрмінамі здадзены ў эксплуатацыю своечасова. Асноўнай прычынай з'яўлення праблемных жылых дамоў паслужыла нясвоечасовае і нерытмічнае фінансаванне будаўніцтва жылля, а таксама вынік працы нядобрасумленных забудоўшчыкаў і будаўнічых арганізацый.***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 26° |
| Віцебск | + 26° |
| Гомель | + 29° |
| Гродна | + 26° |
| Магілёў | + 28° |
| Мінск | + 27° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.07.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10260,00 | ▲ |
| Еўра | 13910,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 298,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 874,49 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

14132

9 771990 763008

# АРЭНА Б'Е РЭКОРДЫ

**На «Барысаў-Арэне» прайшоў дэбютны еўракубкавы матч. Мясцовы БАТЭ ў другім кваліфікацыйным раўндзе Лігі чэмпіёнаў прымаў албанскі «Скендэрбеу». Паядынак адзначыўся не толькі адсутнасцю галоў, але і адмысловым рэкордам стадыёна: гульню наведаў 12671 глядач. Так масава на новы стадыён у Барысаве яшчэ не хадзілі.**

СТАР. 3




Фота Надзеі БУЖАН.

■ Май на ўвазе

## РЫХТУЙ ТЭЛЕВІЗАР ЛЕТАМ

### ДА ПОЎНАГА АДКЛЮЧЭННЯ АНАЛАГАВАГА ТЭЛЕВЯШЧАННЯ ЗАСТАЛОСЯ МЕНШ ЗА 10 МЕСЯЦАЎ



**Ужо ў верасні аналагавы сігнал перастануць перадаваць станцыі ў населеных пунктах Гродна, Новая Стража (Слонімскі раён) і Геранёны (Іўеўскі раён). Усяго да канца гэтага года аналагавае вяшчанне будзе спынена на шасці станцыях, на апошніх сямнаццаці — у першым паўгоддзі 2015-га.**

Для звычайных карыстальнікаў адключэнне аналагавага сігналу можа азначаць поўную адсутнасць «карцінкі» на тэлевізійным экране, калі тэлепрыёмнік не мае магчымасці прымаць сігнал у лічбавым фармаце. Таму падрыхтавацца да пераходу на «лічбу» раяць ужо цяпер.

Першы спосаб, які дапаможа зрабіць змены ў сістэме вяшчання незаўважнымі, — набыццё новага тэлевізара. Большасць сучасных тэлепрыёмнікаў абсталявана дэкодарамі лічбавага сігналу і не патрабуе дадатковых тэхнічных прылад. Другі шлях, які падыходзіць уладальнікам сучасных тэлевізараў без лічбавага дэкодара, а таксама тым, хто па розных прычынах не хоча мяняць свой стары прыёмнік, — набыццё спецыяльнай прыстаўкі, якая дэкадзіруе «лічбу» ў нізкачастотны сігнал, «зразумелы» нават для самых старых тэлевізараў.

**Начальнік упраўлення электрасувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі Павел ПЕТРУЛЕВІЧ** зазначыў, што пераход на лічбавы сігнал будзе максімальна бязбольным для ўсіх грамадзян краіны.

СТАР. 3

■ На кантролі

## КІРАЎНІКІ БУДАЎНІЦТВА ЯК НА ДАЛОНІ

### З 2016 года ў краіне збіраюцца ўзводзіць 100% энергаэфектыўнага жылля

**У Дзяржстандарце падвялі вынікі пашыранага пасяджэння калегіі, прысвечанай пытанням павышэння якасці ў будаўніцтве, у якой прыняў удзел намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль КАЛІНІН.**

**Першы намеснік дырэктара Дэпартамента кантролю і нагляду за будаўніцтвам Юрый БУЛАХАЎ** паведаміў, што, нягледзячы на скарачэнне сёлета колькасці зарэгістраваных аб'ектаў, якія будуюцца, на 26% у параўнанні з аналагічным перыядам 2013 года, колькасць выяўленых дэфектаў павялічылася... на 41%.

### Далёка да ідэалу

Яшчэ больш уражлівымі аказаліся вынікі праверак, праведзеных інспекцыямі дзяржаўнага нагляду за тэхнічнымі рэгламентамі і стандартамі Дзяржстандарта. Так, з пачатку года было праверана 136 юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць вытворчасць, выкарыстанне на будаўнічых аб'ектах і рэалізацыю ў гандлёвай сетцы будаўнічых матэрыялаў і вырабаў айчыннай і імпартнай вытворчасці. Праверкам падвергlaся больш за 630 найменняў жалезабетонных канструкцый і вырабаў, бетонных сумесяў, цэменту, вапны, цэглы, фарбаў, эмаляў, грунтовак, тратуарных і керамічных пліт, вырабаў з драўніны і пластмасы.

СТАР. 2

# КІРАЎНІКІ БУДАЎНІЦТВА ЯК НА ДАЛОНІ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У выніку былі выяўлены парушэнні патрабаванняў тэхнічных нарматыўных прававых актаў і абавязковага пацвярджэння адпаведнасці ў 134 (98,5%) юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

Прыведзеныя лічбы сведчаць як пра ўзмацненне кантрольных і наглядных функцый і мер, якія прымаюцца органамі Дзяржстандарта, так і пра тое, што пытанне павышэння якасці ў будаўніцтве па-ранейшаму застаецца актуальным.

Таму з боку камітэта будзе ўзмоцнена комплекснае ўзаемадзеянне інспекцый Дзяржбуднагляду, дзяржнагляду за тэхнічнымі рэгламентамі і стандартамі, упраўленняў па наглядзе за рацыянальным выкарыстаннем паліўна-энергетычных рэсурсаў, падкрэсліў **старшыня Дзяржстандарта Віктар НАЗАРАНКА.**

## ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ КОЖНАГА ДЫРЭКТАРА

Аналіз вынікаў нагляднай дзейнасці паказвае, што асаблівую ўвагу неабходна надаваць падбору кваліфікаваных кадраў і ацэнцы іх прафесійнай прыдатнасці. З гэтай мэтай Указам Прэзідэнта Беларусі № 26 «Аб мерах па ўдасканаленні будаўнічай дзейнасці» прадугледжана пашырэнне інстытута атэстацыі. Упаўнаважанай арганізацыяй па правядзенні гэтай працэдуры як для кіраўнікоў і спецыялістаў, так і для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў вызначана РУП «Белбудцэнтр».

Прынамсі, цяпер дзеючыя кваліфікацыйныя атэстаты маюць больш за 30 тысяч спецыялістаў будаўнічай галіны краіны. Для ўзмацнення персанальнай адказнасці ўдзельнікаў будаўнічай дзейнасці на сайце РУП «Белбудцэнтр» (www.bsc.by) вядзецца агульнадаступны Рэестр кваліфікацыйных атэстатаў кіраўнікоў і спецыялістаў будаўнічай галіны, дзе адлюстроўваецца тэрмін дзеяння атэстата з указаннем функцый і спецыялізацыі.

**Патрэбна, каб існаваў механізм пазбаўлення нядобрасумленнага падрадчыка магчымасці выступаць на рынку.**

Пры атэстацыі юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў ацэньваецца іх адпаведнасць такім кваліфікацыйным патрабаванням, як забяспечанасць арганізацыі кваліфікаваным персаналам, матэрыяльна-тэхнічнымі рэсурсамі, вопытам працы, наяўнасцю неабходных дазвольных дакументаў.

Атэстаты адпаведнасці выдадзены 134 юрыдычным асобам. Прымяненне гэтай працэдуры, якая ажыццяўляецца на працягу месяца, ужо дазволіла выявіць і прадухіліць некаторыя моманты, якія маглі негатыўна адбіцца на якасці будаўніцтва.

Працягваючы абмеркаванне тэмы забеспячэння неабходнай якасці будаўнічых работ і гатовай будаўнічай прадукцыі, **намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Сяргей ЛАСТАЧКІН** выказаў меркаванне, што дасягнуць гэтага можна, радыкальна змяніўшы патрабаванні да заказчыка. «Тая сістэма, якая сёння створана, у тым ліку атэстацыя на першы і другі клас адказнасці, патрэбна для таго, каб існаваў механізм пазбаўлення нядобрасумленнага падрадчыка магчымасці выступаць на рынку, лічыць ён. Усе астатнія функцыі павінен узяць на сябе заказчык. Пакуль не станем больш жорстка патрабаваць з яго, ніякай якасці не забяспечым. Менавіта з заказчыка ў першую чаргу павінен пытаца Дзяржбуднагляд, а ўжо потым з усіх астатніх».

У якасці аргумента Сяргей Ластачкін прывёў еўрапейскую практыку, дзе якасць аб'екта залежыць ад тэхнічнага нагляду, і прапанаваў падрыхтаваць адпаведны нарматыўны дакумент. У рамках аказання метадычнага садзейнічання на калегіі прынята рашэнне аб распрацоўцы рэкамендацый па ўжыванні СТБ ISO 9001 з улікам спецыфікі будаўнічай галіны. Увесці іх у дзеянне мяркуецца з 1 студзеня будучага года.

## ГАЛОЎНАЕ НЕ КОЛЬКАСЦЬ, А ЯКАСЦЬ

Падводзячы вынікі праведзенай на калегіі дыскусіі, выказаных яе ўдзельнікамі прапаноў і заўваг, Анатоль Калінін адзначыў відавочныя перавагі і дасягненні беларускай эканомікі. Той факт, што 85% прадукцыі прадаецца на экспарт сведчыць пра яе дастаткова высокі ўзровень якасці. Аднак з кожным днём становіцца ўсё складаней канкурыраваць.

На жаль, у сферы будаўніцтва, якая мае важнае эканамічнае і сацыяльнае значэнне, далёка не ўсё добра. Спажыўцы будаўнічых паслуг і прадукцыі прад'яўляюць, у тым ліку і праз сродкі масавай інфармацыі, справядлівыя прэтэнзіі. У гэтай сувязі ўвядзенне атэстацыі юрыдычных асоб і прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць дзейнасць у галіне будаўніцтва, разглядаецца як інструмент іх кваліфікаванай і непрадузятай ацэнкі. Пры гэтым віцэ-прэм'ер перасцярог адпаведныя службы ад імкнення да колькасці: «Няхай на рынку застанецца 20-30 арганізацый, якія будуць мець неабходны патэнцыял і рэсурсы. Дробныя альбо далучацца да іх, альбо збяднеюць, паколькі ўкараніць сістэму патрабаванняў да якасці пад сілу толькі буйной будаўнічай або вытворчай арганізацыі».

Гаворачы аб энергаэфектыўным жыллі, Анатоль Калінін засяродзіў увагу на тым, што «мы не настолькі багатыя, каб будаваць проста квадратныя метры. Да 2016 года трэба выйсці на будаўніцтва 100% энергаэфектыўнага жылля».

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Парламенцкі дзённік

# ПАРТНЁРЫ І СЯБРЫ

## Новы пасол Сербіі сустрэўся са старшынёй Палаты прадстаўнікоў

**Спікер ніжняй палаты беларускага парламента Уладзімір Андрэйчанка ад імя дэпутацкага корпуса павіншаваў Велька Кавачавіча з прызначэннем Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Сербіі ў Рэспубліцы Беларусь і пажадаў яму плённай працы. Старшыня таксама запэўніў сербскага пасла ў заўсёднай падтрымцы яго з боку Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.**

— Мы бачым вельмі вялікія перспектывы ў развіцці супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Сербіяй, і не толькі ў гандлёва-эканамічнай сферы (наш тавараабарот ужо склаў 200 млн долараў, але для яго павелічэння застаюцца вялікія магчымасці), — сказаў Уладзімір Андрэйчанка. — Безумоўна, мы спадзяёмся, што вы, як вельмі вопытны дыпламат, акажаце ўсякае садзейнічанне і зробіце вялікі ўклад у актывізацыю нашых міжпарламенцкіх адносін, якія ў нас умацоўваюцца. Мы разлічваем, што нашы адносіны будуць развівацца па нарастаючай і ў гуманітарнай сферы.

Кіраўнік Палаты прадстаўнікоў нагадаў субяседніку пра двухбаковыя міжпарламенцкія сустрэчы на пляцоўках АБСЕ і выказаў меркаванне пра неабходнасць больш актыўна працаваць на міжнародных пляцоўках, і не толькі парламентарыям.

— Для гэтага ў нас ёсць усе падставы. Нашы адносіны грунтуюцца на сяброўстве, узаемапаразуменні, узаемнай падтрымцы, славянскім адзінстве, — сказаў ён. — І гэта створана не сёння, а працуе дзесяцігоддзямі. Сур'ёзны імпульс актывізацыі гэтых адносін надаў абмен візітамі нашых прэзідэнтаў. Мы разглядаем Сербію як партнёра і сябра не толькі на Балканах, але ў цэлым у Еўропе, бо Сербія сёння з'яўляецца кандыдатам на ўступленне ў Еўрапейскі саюз, і мы спадзяёмся, што яна будзе таксама аказваць нам садзейнічанне, дапамогу ў выбудоўванні нармальных, раўнапраўных адносін з Еўрапейскім саюзам, без дыктату апошняга і ўмяшання ў нашы ўнутраныя працэсы.

Велька Кавачавіч без дапамогі перакладчыка падзякаваў старшыні Палаты прадстаўнікоў за брацкі прыём і заўважыў, што гэта не асабістая заслуга ўдзельнікаў сустрэчы, але вынік адносін паміж народамі Сербіі і Беларусі.

— Я заўсёды падкрэсліваю, што паміж нашымі краінамі існуюць традыцыйна сяброўскія, блізкія, брацкія адносіны, — сказаў ён. — Нядаўні візіт Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў Сербію не толькі яшчэ раз пацвердзіў гэта, але і адкрыў новыя магчымасці для развіцця і ўмацавання адносін паміж нашымі краінамі.

Пасол Сербіі заўважыў, што адчувае сябе ў Беларусі як сярод сваіх і паабяцаў унесці максімальны ўклад у развіццё беларуска-сербскага ўзаемадзеяння. Ён дадаў, што ў свеце існуе шмат самай рознай інфармацыі пра Беларусь, але цяпер ужо «немагчыма ўтаіць прагрэс у яе развіцці». Велька Кавачавіч таксама выказаў меркаванне пра важнасць развіцця авіязносін паміж Мінскам і Бялградам, што вельмі дапамагло б развіццю стасункаў паміж краінамі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА** ■

■ Грошы

# КРЭДЫТЫ БУДУЦЬ ТАННЕЦЬ?

## Пакуль што стаўка рэфінансавання працягвае зніжацца

**Да канца года сярэдняя стаўка па крэдытах у Беларусі можа скласці 29% гадавых. Пра гэта стала вядома па выніках выязнога пасяджэння праўлення Нацыянальнага банка, якое прайшло ў Віцебскай вобласці.**

Сёлета Нацыянальны банк у мэтах павышэння даступнасці крэдытных рэсурсаў для суб'ектаў гаспадарання працягне палітыку паступовага зніжэння працэнтных ставак у эканоміцы, не пагаршаючы сітуацыю на дэпазітным і валютным рынках, адзначылі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка.

Удзельнікамі пасяджэння было падкрэслена, што ва ўмовах жорсткай манетарнай палітыкі фінансаванне дзяржаўных праграм і мерапрыемстваў павінна ажыццяўляцца ў межах наяўных крыніц. «Банкам неабходна стымуляваць рэалізацыю высокаэфектыўных праектаў, не дапускаць росту пратэрмінаванай запазычанасці па крэдытах, нарошчваць рэсурсную базу, стала працаваць з прадпрыемствамі па зніжэнні знешняй дэбіторскай запазычанасці. Пры гэтым канкурэнтаздольнасць эканомікі ў цэлым павінна забяспечвацца за кошт павышэння канкурэнтных пераваг самых вытворцаў тавараў і паслуг, а не за кошт курсавой палітыкі», — лічаць у Нацбанку. Зыходзячы з гэтага, сёлета абрана тактыка паступовага паслаблення курсу беларускага рубля. «Гэта дазваляе, з аднаго боку, не перашкаджаць тэндэнцыям рынку і не дапускаць значнага расходавання золатавалютных рэзерваў, з іншага боку, — забяспечваць падтрыманне цанавой канкурэнтаздольнасці экспарту, захоўваць стабільнасць на валютным і дэпазітным рынках, у значнай ступені стрымліваць развіццё інфляцыйных працэсаў».

Мяркуецца, што на канец 2014 года абменны курс беларускага рубля да долара ЗША складзе 10 700 — 10 800 рублёў за 1 долар. «Пры гэтым далейшая дынаміка абменнага курсу будзе шмат у чым вызначацца эфектыўнасцю працы ўсёй эканомікі, сітуацыяй у знешнім гандлі, узважанасцю рашэнняў, што прымаюцца ў галіне макраэканамічнай, бюджэтна-падатковай і грашова-крэдытнай палітыкі», — падкрэслілі ў Нацбанку. Акрамя таго, стаўка рэфінансавання да канца года можа знізіцца да 20% гадавых.

Нагадаем, што з учарашняга дня асноўная стаўка зніжана на 1 працэнтны пункт — да 20,5% гадавых. Лічыцца, што гэты захад будзе спрыяць павышэнню даступнасці крэдытных рэсурсаў і памяншэнню пазыковай нагрузкі на прадпрыемствы рэальнага сектара эканомікі. Пры гэтым уклады ў беларускіх рублях па-ранейшаму будуць больш выгаднымі ў параўнанні з валютнымі. Дарэчы, з пачатку года гэта ўжо трэцяе па ліку зніжэнне стаўкі рэфінансавання: папярэднія былі ў красавіку і маі. Абодва разы стаўка зніжалася на 1 працэнтны пункт.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ** ■


## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ С УСЛОВИЕМ по продаже права заключения договора аренды земельного участка

| | |
|---|---|
| **ЛОТ № 1** | |
| **Адрес объекта и его наименование** | Земельный участок для строительства и обслуживания спортивно-туристического комплекса (без размещения посетителей для проживания) в к.п. Нарочь, ул. Туристская, площадью – 0,3317 га (кадастровый номер 624056300001000400). **Срок аренды 99 лет. Начальная цена 601 773 789 (Шестьсот один миллион семьсот семьдесят три тысячи семьсот восемьдесят девять) белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| **ЛОТ № 2** | |
| **Адрес объекта и его наименование** | Земельный участок для строительства и обслуживания спортивно-туристического комплекса (рекреационная емкость объекта для размещения посетителей на проживание 18 человек и единовременного пребывания 45 человек) в к.п. Нарочь, ул. Набережная, площадью – 0,8754 га (кадастровый номер 624056300001000399). **Срок аренды 99 лет. Начальная цена 918 386 228 (Девятьсот восемнадцать миллионов триста восемьдесят шесть тысяч двести двадцать восемь) белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| **ЛОТ № 3** | |
| **Адрес объекта и его наименование** | Земельный участок для строительства и обслуживания торгового объекта в г. Мядель, ул. Юбилейная площадью – 0,4892 га (кадастровый номер 624050100001001737). **Срок аренды 99 лет. Начальная цена 636 608 924 (Шестьсот тридцать шесть миллионов шестьсот восемь тысяч девятьсот двадцать четыре) белорусских рубля.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| **Порядок оплаты** | Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации, с потерями сельскохозяйственного производства. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. |
| **Продавец** | Мядельский районный исполнительный комитет |
| **Организатор аукциона** | Мядельский районный исполнительный комитет |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность для юридического лица копия свидетельства о государственной регистрации. Сумма задатка: 10% от начальной цены на р/с 3600623001906 ЦБУ № 619 филиала № 601 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Молодечно, код 769, УНП 600537220. Получатель платежа: Главное управление МФ РБ по Минской области, код платежа 04002. |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **15 августа 2014 г. до 16.00, г. Мядель, пл. Ленина, 1, каб. 14, Мядельский районный исполнительный комитет, тел. (факс) (8-01797) 55-5-73, (8-1797) 55-4-00** |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **20 августа 2014 г. в 14.00, г. Мядель, пл. Ленина, 1, каб. 36, Мядельский районный исполнительный комитет** |

■ Абітурыент-2014

# 370 БАЛАЎ, І ТЫ — АКТУАРНЫ МАТЭМАТЫК!

## Міністэрства адукацыі агучыла першыя афіцыйныя вынікі прыёмнай кампаніі ў ВНУ


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Па звестках галоўнага адукацыйнага ведамства, цалкам запоўніць бюджэтныя месцы ўдалося пяці ВНУ. У іх ліку Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы і Мінскі дзяржаўны вышэйшы радыётэхнічны каледж.**

Усяго ў ВНУ, падпарадкаваных Міністэрству адукацыі, запоўнена больш як 96% месцаў на дзённай бюджэтнай форме навучання.

Істотна павысіўся ў гэтым годзе рэйтынг педагагічных спецыяльнасцяў. У БДПУ імя М. Танка было пададзена больш як 1,2 тысячы заяў ад абітурыентаў на дзённую форму атрымання адукацыі. Конкурс 7,6 чалавека на месца зафіксаваны на спецыяльнасці «Выяўленчае мастацтва. Камп'ютарная графіка»; 3,2 чалавека на месца — на спецыяльнасці «Фізічная культура. Фізкультурна-аздараўленчая і турысцка-рэкрэацыйная дзейнасць».

У прыёмную камісію БДПУ падалі заявы 79 чалавек, якія закончылі школы і гімназіі з залатым і сярэбраным медалямі, а таксама выпускнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў з дыпломам з адзнакай: у папярэднім годзе такіх абітурыентаў было ў 4 разы менш.

Па словах **рэктара Аляксандра ЖУКА,** многія абітурыенты прыносілі ў прыемную камісію не толькі свае дакументы, але і лісты з запрашэннем паступаць менавіта у БДПУ імя М.Танка. Такім чынам, індывідуальная работа з будучымі студэнтамі і іх бацькамі прынесла свой плён. Выпускнікі паверылі, што ў іх зацікаўлены...

А тым часам у БДУ, дзе незапоўненымі засталіся месцы толькі на фізічным і ваенным факультэтах, адбылося першае залічэнне ў студэнты. Пасяджэнне камісіі транслiравалася ў анлайн-рэжыме на сайце ВНУ.

На біялагічным факультэце самы высокі прахадны бал быў адзначаны на спецыяльнасці «Біяхімія» — 306. Крыху ніжэйшы на спецыяльнасці «Мікрабіялогія» — 283. На «Біялогію»(кірунак «Біятэхналогіі») трэба было набраць 282 балы.

На факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі рэйтынг спецыяльнасцяў, калі зыходзіць з прахадных балаў, выглядае наступным чынам: «Актуарная матэматыка» (сукупнасць метадаў, якія прымяняюцца, напрыклад, у страхаванні) — 370 балаў; «Прыкладная інфарматыка» — 334; «Камп'ютарная бяспека» — 321; «Эканамічная кібернетыка» — 320; «Прыкладная матэматыка» — 189.

На факультэце філасофіі і сацыяльных навук прахадны бал на спецыяльнасці «Сацыяльныя камунікацыі» склаў 337; «Псіхалогія» — 319; «Сацыялогія» — 286; «Філасофія» — 278. У Інстытуце журналістыкі адбылося залічэнне на спецыяльнасць «Інфармацыя і камунікацыя». Прахадны бал склаў 330.

Што тычыцца правядзення дадатковага набору абітурыентаў на вакантныя бюджэтныя месцы, то рашэнне будзе прынята пасля правядзення ўзгадненняў з усімі зацікаўленымі бакамі. У Міністэрстве адукацыі заспакойваюць: дакладная інфармацыя стане вядомая да 23 ліпеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

# ДОМА АЛБАНЦАЎ НЕ АДОЛЕЛІ. А ШТО Ў ГАСЦЯХ?..



**Барысаўскі БАТЭ стартаваў у 2-м кваліфікацыйным раўндзе Лігі чэмпіёнаў з хатняй нічыёй з албанскім клубам «Скендэрбеу» з горада Корча.**

Я часта чую, як у спрэчцы паўтараюць старое і добра вядомае выказванне: «Для перамогі ўсе сродкі добрыя». У матчы з барысаўчанамі албанскія футбалісты валіліся, як падкошаныя, імітавалі пакуты, сутаргава, нібы ад болю, білі рукамі, нагамі па полі і ўсяляк імкнуліся дацягнуць гэты матч да нічыйнага выніку.

— Гэта, безумоўна, раздражняла, — адзначыў пасля гульні **Аляксандр ЕРМАКОВІЧ, галоўны трэнер БАТЭ.** — Але гэта асаблівасць паўднёвых каманд. Яны часта карыстаюцца футбольнай хітрасцю. Усё гэта непрыемна.

— Напрыканцы сустрэчы мы перасталі на гэта рэагаваць, — працягвае думку трэнера **Ягор Філіпенка,** абаронца барысаўскай каманды. — Мы разумелі, што гэта не столькі ад болю, колькі ад жадання адпачыць.

Але пры нічыёй з чэмпіёнам Албаніі, з далёка не самым рэйтынгавым клубам Еўропы, нарацаць толькі на правакуючыя паводзіны гасцей — ідэя абсурдная. У БАТЭ было два таймы, 90 хвілін «з хвосцікам», каб упэўнена перамагчы і зрабіць зачын перад другой сустрэчай. Але гэтага каманда не зрабіла. У першай палове галкіпер албанцаў наогул сумаваў па працы і мог цалкам засяродзіцца на прыгажосці маляўнічага барысаўскага неба ці паслухаць спевы фанатаў. «Даць прыкурыць» балканцам Віталь Радзівонаў і кампанія змаглі толькі ў другой палове. Менавіта ў Радзівонава, капітана «жоўта-сіняй» дружыны, напрыканцы гульні быў самы небяспечны момант, але форвард прабіў міма. І ўсё — 0:0. Так, лічбы на табло, можа, і сапсавалі настрой балельшчыкам, аднак другі адрэзак прадэманстраваў, што такога апанента беларусы могуць перамагаць. Праўда, хто ведае, як складзецца матч у гасцях і якія футбольныя хітрыкі назапашаны у «Скендэрбеу»?

— Лічу, што шанцы напярэдадні гульні ў адказ не змяніліся. Яны па-ранейшаму 50 на 50, — рэзюмаваў Філіпенка.

**Тарас ШЧЫРЫ,**
*г. Барысаў.*


Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

# РЫХТУЙ ТЭЛЕВІЗАР ЛЕТАМ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Ужо цяпер у кожнай вобласці распрацаваны спецыяльныя праграмы для сацыяльна неабароненых слаёў насельніцтва, якія прызваны дапамагчы людзям у набыцці новага абсталявання. Так, усю выбіпзаваную тэхніку можна будзе набыць у крэдыт або ў растэрміноўку. Гандлёвая нацэнка на такія тавары не павінна перавышаць 30 працэнтаў.

Таксама некаторыя вытворцы (як, напрыклад, беларускі «Гарызонт») прапаноўваюць пакупнікам выбар прадукцыі па каталогу з дастаўкай на дом. Такія каталогі можна замовіць у любым аддзяленні «Белпошты». Увогуле, па словах **намесніка начальніка аддзела маркетынгу кампаніі «Гарызонт» Юрыя ЛЯГЕЗЫ,** айчынны вытворца тэлевізійнай тэхнікі гатовы забяспечыць патрэбы спажыўцоў у абсталяванні для прыёму лічбавага сігналу. На заводзе сёння выпускаюць прыстаўкі, якія, акрамя сваёй асноўнай функцыі, здольныя рабіць стоп-кадр, працягваць прагляд каналу з месца спынення, запісваць тэлепраграмы на флэш-носьбіты, а таксама прайграваць з флэш-карт аўдыя- і відэафайлы. Такая прыстаўка каштуе каля 300 тысяч рублёў.

Пераход на лічбавы фармат вяшчання забяспечыць карыстальнікам высокую якасць відэараду і гуку (сігнал будзе прымацца ў той якасці, у якой ён быў сфарміраваны на тэлестудыі), у тым ліку ў высокай якасці (HD), павялічыць колькасць праграм, што транслiруюцца з аднаго перадатчыка. Сёння для жыхароў краіны, якія перайшлі на «лічбу», бясплатна даступныя 8 тэле- і 1 радыёканал.

Мерапрыемствы па пераводзе тэле- і радыёвяшчання на лічбавы фармат праводзяцца ў Беларусі згодна з заключнымі актамі рэгіянальнай канферэнцыі радыёсувязі, прынятымі ў Жэневе ў 2006 годзе. Паводле гэтых дакументаў, аналагавае вяшчанне павінна быць поўнасцю спынена да 17 чэрвеня 2015 года. Апошнія дзесяць перадавальных аналагавых станцый у Беларусі спыняць сваю працу 15 мая будучага года. Сярод іх будзе і галоўная перадавальная станцыя краіны ў Калодзішчах.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

**Усе пытанні, звязаныя з пераходам на лічбавае вяшчанне, вы можаце задаць спецыялістам бясплатнай справачна-інфармацыйнай службы па нумары 172.**

■ Гучная справа

# ЗАБОЙЦУ СЛОНІМСКАЙ ПРЫГАВАРЫЛІ ДА ПАЖЫЦЦЁВАГА ЗНЯВОЛЕННЯ

## Яго змоўшчыка — да 7 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму з прымусовым лячэннем ад алкагалізму

**Мінскі абласны суд прызнаў 22-гадовага Яўгена К. вінаватым у забойстве 50-гадовай мінчанкі Таццяны Слонімскай. Яго 20-гадовага сябра Мікалая Л. — ва ўкрывальніцтве слядоў злачынства.**

Акрамя забойства, Яўген К. абвінавачаны ў сукупнасці злачынстваў па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэкса. У прыватнасці, у крадзяжы, разбойным нападзенні, знішчэнні і падробцы дакументаў, ідэнтыфікацыйнага нумара аўтамабіля... У двух эпізодах крадзяжу суд прызнаў вінаватым і другога мінчаніна.

Пракурор прасіў суд прыгаварыць Яўгена да пажыццёвага зняволення, а яго змоўшчыка — да 25 гадоў турмы. Дзеці Таццяны Слонімскай настойвалі на смяротным пакаранні для абодвух, бо не бачаць шанцу на іх выпраўленне.

Хутчэй за ўсё, пракуратура будзе абскарджваць прысуд. Бо, паводле слоў дзяржабвінаваўцы, з матэрыялаў справы бачна, што мела месца ўсё ж саўдзельніцтва ў забойстве. Дзеянні Мікалая Л. насілі актыўны характар.

Таццяна Слонімская знікла 3 ліпеня мінулага года. Па словах відавочцаў, яна прыязджала ў вёску Малы Трасцянец да маці, ужо адтуль накіравалася на сваёй «Маздзе-3» у ягады. ...18 ліпеня ў лесе паблізу вёскі Дварэц знайшлі труп жанчыны, закапаны ў зямлю, са шматлікімі нажавымі раненнямі (іх было не менш за 14). Пасля забойства злачынцы выкралі яе машыну і па падробленых дакументах прадалі ў Маскве...

**Надзея ПАЎЛАВА**

Уважаемые акционеры
ОАО «Завод «Белпласт»
15 августа 2014 года в 14.00
СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
по адресу: г. Минск, ул. Гусовского, 2, ОАО «Завод «Белпласт».
ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:
Об участии ОАО "Завод «Белпласт» в объединении юридических лиц – холдинге.
Регистрация участников собрания проводится в день собрания в приемной ОАО «Завод «Белпласт» (2 этаж) с 13.00 до 13.45.
Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность.
Представителю акционера – доверенность и документ, удостоверяющий личность.
УНП 100008342 Наблюдательный совет ОАО «Завод «Белпласт»

Воложинское райпо выставляет на продажу следующие
неэксплуатируемые здания магазинов
по адресу:
• Минская область, Воложинский р-н, в д. Чабаи, общая площадь 82,4 кв. м, инв. № 632/С-26510, расположено на земельном участке площадью 1,1080 га;
• Минская область, Воложинский р-н, в д. Семерники, общая площадь 88,5 кв. м, инв. № 632/С-26383, расположено на земельном участке площадью 0,0921 га;
столовых:
• Минская область, Воложинский р-н, в д. Брильки, общая площадь 132,7 кв. м, инв. № 632/С-24636, расположено на земельном участке площадью 0,1055 га;
• Минская область, Воложинский р-н, в д. Бобровичи, общая площадь 295,2 кв. м, инв. № 374, расположено на земельном участке площадью 0,2124 га;
• Минская область, Воложинский р-н, в д. Камень, общая площадь 255,5 кв. м, инв. № 632/С-26381, расположено на земельном участке площадью 0,2470 га.
Справка о стоимости зданий по телефонам:
8 (01772) 55 967, 8 (029) 33 92 794. УНП 600017988

Печати, свидетельства о государственной регистрации, уставные документы ТЧУП «ИНЬСОНИ», ЧП «Серторг», ЧТУП «СмежТрейд», ООО «Строительное управление-55», ЧТУП «НимбоТех», ТЧУП «ПОЛИМЕРСНАБ», СООО «Мир Релакса», ИП Сенько Евгения Евгеньевича, ИП Вежана Виталия Зеноновича **считать недействительными в связи с их утерей.** УНП 191145300

Кожны хоча сфатаграфавацца з жывой скульптурай.



Фотаздымкі Любові БЛЯЕВАЙ.



Музыкант з Балівіі ўжо аб'ездзіў амаль цэлы свет.



Попыт на керамічную «Ойча наш» ёсць.

# ШПАЦЫР ПА «БАЗАРЫ»

## «Зорны індзеец», пчала Яна і іншыя...

**Карэспандэнты «Звязды» прайшліся ўвечары па пешаходнай вуліцы, якая знаходзіцца недалёка ад дырэкцыі віцебскага фэсту. І вызначылі «топ-5», на іх погляд, самых дзіўных людзей, якія сустрэліся тут, на віцебскім «Арбаце».**

Падчас невялікага падарожжа рэпарцёры зразумелі: «базар» — «сезон цудаў». Бо толькі ў фестывальныя дні можна ўбачыць тое, чаго больш няма ў іншы час. І закахацца з першага погляду магчыма менавіта цяпер.

***

Наша рамантычная прагулка пачалася ля сімвала Віцебска — ратушы. На яе фасадзе знаходзіцца «галоўны» гадзіннік «базару».

Ля ратушы спяваў вельмі экзатычны вулічны музыкант — «тыповы індзеец». Ён адразу сказаў, што не дае інтэрв'ю. Маўляў, кажу адно, а напісана ў газеце іншае. Але вопытныя «звяздоўцы» ўсё-такі «раскруцілі» вулічную «зорку» на адказы. Высветлілася, што музыкант — з Балівіі. Сказаў, што выступаў аднойчы падчас «базару» ў летнім амфітэатры. На віцебскі фэст прыязджае не кожны год, але даволі часта. А ў першы раз прыехаў па запрашэнні сяброў.

— Не памятаю, калі гэта было. Тады быў вельмі ўражаны ўсім, што ўбачыў тут. А раней я і не ведаў, што ёсць такі фестываль. Я езджу па свеце, выступаю ў розных краінах. Выконваю традыцыйную музыку Паўднёвай Амерыкі. Хто хоча са слухачоў, кідае купюры, дыскі з запісам музыкі купляюць, — расказаў іншаземец. Сапраўдная «зорка». А як жа яшчэ назваць музыканта, які збірае цэлы квартал падчас свайго выступлення?

***

Пчолку Маю ведаюць усе, хто глядзеў аднайменны мультфільм. А на «базары» мы ўбачылі яе «сястру». Жывая скульптура ў вобразе пчолкі сказала, што яе імя Яна.

— З Мінска я прыехала. Працую «скульптурай» на святах. Так, сама стварыла «гарнітур», сама грыміруюся. На «базары» ўпершыню, сюды трапіла выпадкова. Мяне ўбачылі ў мінскім парку Горкага жыхары Віцебска, пазнаёміліся. Потым яны даслалі запрашэнне «пабыць пчолкай» на «базары». Маўляў, толькі прыязджай, дапаможам кватэру знайсці, — расказала «пчолка». Яе рэкорд знаходжання ў вобразе на вуліцы — восем гадзін. Было гэта ў Дзень Перамогі ў сталіцы.

***

Жанчына іграе на скрыпцы музыку Вівальдзі: «Времена года». І такім чынам «нясе класіку ў масы». Пазнаёміліся. Святлана прыехала на «базар» з Полацка.

— Мне падабаецца тут. Фестываль — культурнае мерапрыемства, якое аб'ядноўвае людзей. Шкада, што на фэсце нямнога класічнай музыкі. І тут на вуліцы шмат папсы, рок. Таму я штогод на фестывалі стараюся крыху выхоўваць густ людзей. Яны падыходзяць да мяне і дзякуюць за «аазіс класічнай музыкі», — распавядае скрыпачка. Яна выкладае ў полацкай дзіцячай школе мастацтваў. Пасля нашай размовы ёй больш актыўна «дзякавалі грашыма» за музыку, чаму мы вельмі парадаваліся. Іграе яна класна!

***

Абярэгі і побач... пасведчанне ўдарніка камуністычнай працы.

Наш чарговы суразмоўца расказаў, што такое суседства — жарт. Для сувеніраў сам распрацаваў тэхналогію вырабу керамікі. На ёй — малітва «Ойча наш» і абярэг у вобразе святога Мікалая.

— Я — былы навуковы супрацоўнік. Будаўніцтвам займаюся, а творчасцю — у вольны час. Наконт таго, што побач пасведчанне і малітва, дык у савецкія часы, памятаю, падчас перапісу насельніцтва высветлілася, што 75% — вернікі, — разважае майстар.

***

Стаць кавалём свайго шчасця прапаноўваў сімпатычны хлопец.

— Прадстаўляю аб'яднанне магілёўскіх рамеснікаў. Займаемся чаканкай манет. Са свята ў Александрыі — адразу сюды. На «базары» — упершыню. Безумоўна, падабаецца. Горад вельмі прыгожы, асабліва ўвечары, калі падсветку дамоў і мастоў уключаюць. Атмасфера паўсюды прыемная. Стаю тут чацвёрты дзень. Бірулька каштуе 50 тысяч, манетка — 40 тысяч рублёў. Нямала ахвотных самім стаць «кавалём». Можна зрабіць уласнымі рукамі памятны падарунак — літаральна «выкаваць сваё шчасце». Вось, напрыклад, клішэ з выявай двух галубоў. Сярод пакупнікоў былі і іншаземцы: расіяне, украінцы, — распавядае студэнт Павел Габрусевіч.

Прагулкі па пешаходнай вуліцы спрыяюць таму, што падчас іх лёгка можна закахацца. І хочаце верце, а хочаце не, але менавіта падчас фэсту закахаліся некаторыя знаёмыя аўтара гэтых радкоў. Потым — у ЗАГС, нарадзіліся дзеці. У наступным годзе, мяркую, атрымаецца ўбачыць і запісаць «пяцёрку» самых рамантычных «базарных» гісторый пра шчаслівае спатканне і каханне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА

### Закрытого акционерного общества «ТОПЗАПЭЛЕКТРО» (ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»)

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на русском и белорусском языках)**

На русском языке:

полное наименование: Закрытое акционерное общество «Топзапэлектро»;

сокращенное наименование: ЗАО «Топзапэлектро».

На белорусском языке:

полное наименование: Закрытае акцыянернае таварыства «Топзапэлектра»;

сокращенное наименование: ЗАТ «Топзапэлектра».

**2. Место нахождения эмитента**

Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, дом 25, комн. 1а, телефон: 8 (017) 290-89-54, факс: 8 (017) 363-04-16, e-mail: topzapelektro@mail.ru, www.tze.by.

**3. Основные виды деятельности эмитента**

Согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2006:

| Код | Наименование вида деятельности |
|---|---|
| 45211 | Общее строительство зданий |
| 74201 | Деятельность в области архитектуры, инженерные услуги |
| 70110 | Подготовка к продаже недвижимого имущества |

**4. Номер расчетного счета эмитента для зачисления денежных средств при проведении открытой продажи**

Денежные средства при проведении открытой продажи облигаций будут поступать на расчетные счета эмитента:

- № 3012004261000 в ЗАО «Идея Банк», код 755 (г. Минск, ул. К. Маркса, 25, УНП 807000122);

- № 3012132420016 в ЗАО «МТБанк», код 117 (г. Минск, Партизанский пр-т, 6А, УНП 100394906).

**5. Наименование периодического печатного издания, определенное эмитентом для раскрытия информации, сроки ее публикации**

Бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством, будет публиковаться в газете «Звязда», не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года.

Информация о принятом эмитентом решении о реорганизации подлежит публикации в газете «Звязда» не позднее двух месяцев с даты принятия соответствующего решения уполномоченным органом.

Информация о принятом эмитентом решении о ликвидации подлежит публикации в приложении к журналу «Юстиция Беларуси» в порядке, определенном законодательством, но не позднее двух месяцев с даты принятия соответствующего решения уполномоченным органом эмитента.

Информация о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) публикуется в журнале «Судебный вестник Плюс: ЭКОНОМИЧЕСКОЕ ПРАВОСУДИЕ», а также в печатном органе, определенном приказом Председателя Верховного Суда Республики Беларусь, в течение пяти дней с момента получения соответствующего судебного постановления.

Информация об изменениях, внесенных в проспект эмиссии, будет опубликована Эмитентом в газете «Звязда» в семидневный срок с даты государственной регистрации соответствующих изменений в регистрирующем органе.

**6. Размер уставного фонда**

Уставный фонд эмитента сформирован в размере 5 000 000 (Пять миллионов) белорусских рублей. Уставный фонд разделен на простые (обыкновенные) акции в количестве 100 штук номинальной стоимостью 50 000 (Пятьдесят тысяч) белорусских рублей каждая. Уставный фонд сформирован за счет денежных средств.

**7. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**

Депозитарное обслуживание эмитента осуществляет Закрытое акционерное общество «Минский транзитный банк» (ЗАО «МТБанк»), код депозитария 014, зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 14 марта 1994 года, регистрационный номер 38, расположен по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, Партизанский пр-т, 6А.

Специальное разрешение (лицензия) № 02200/5200-1246-1112 на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, продлено Министерством финансов Республики Беларусь на основании решений № 265 от 27.07.2007 на пять лет, № 145 от 16.05.2012 на десять лет и действительно до 29.07.2022.

**8. Дата, номер государственной регистрации эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего**

Закрытое акционерное общество «Топзапэлектро» (далее по тексту – эмитент) зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 14 сентября 2000 года № 1044 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100896485.

**9. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций**

Ознакомиться с проспектом эмиссии можно в течение всего срока обращения жилищных облигаций в офисе эмитента ежедневно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 220121, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 39, офис 8Н.

**10. Форма выпуска и вид облигаций, объем эмиссии, количество, серия, номера**

| | |
|---|---|
| Форма выпуска и вид облигаций | Жилищные, бездокументарные, именные, неконвертируемые |
| Объем эмиссии | 13 420 000 000 (Тринадцать миллиардов четыреста двадцать миллионов) белорусских рублей |
| Количество облигаций | 2 200 (Две тысячи двести) штук |
| Серия, номера облигаций | ТЗЭ-5, №№ 000001-002200 |

**11. Номинальная стоимость облигаций**

Номинальная стоимость одной облигации составляет 6 100 000 (Шесть миллионов сто тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилых помещений в строящихся многоквартирных жилых домах с объектами торгового и общественного назначения по ул. Алибегова, Я. Брыля. Вторая очередь. Жилые дома № 20 и № 28 по генплану.

Эквивалент номинальной стоимости облигаций не подлежит изменению в течение срока обращения облигаций настоящего выпуска.

**12. Цель выпуска облигаций и направление использования средств, полученных от размещения облигаций**

Целью выпуска жилищных облигаций является привлечение денежных средств физических и (или) юридических лиц для осуществления строительства объекта – «Комплекс многоквартирных жилых домов с объектами торгового и общественного назначения по ул. Алибегова, Я. Брыля. Вторая очередь. Жилые дома № 20, № 28, и автостоянка № 20А по генплану», в том числе для хозяйственной деятельности эмитента, связанной с выполнением им функций заказчика (застройщика) по указанному объекту строительства и возможностью временного размещения привлекаемых денежных средств на депозитные счета банков.

Эмитент использует средства, полученные от размещения облигаций в соответствии с целями их выпуска.

**13. Обеспечение выпуска облигаций**

Исполнение обязательств по облигациям 5-го выпуска (далее – облигации) обеспечивается залогом недвижимого имущества в составе машино-мест №№ 45, 46, 47, 48, 49, 50, 51, 52, 53, 54, 55, 56, 57, 58, 59, 60, 61, 62, 63, 64, 65, 66, 67, 68, 69, 70, 71, 72, 73, 74, 75, 76, 77, 79, 80, 81, 82, 83, 84, 85, 86, 87, 88, 89, 90, 91, 92, 93, 94, 95, 96, 97, 98, 99, 100, 101, 129, 135, 136, 139, 141, 142, 143, 144, 145, 146, 147, 148, 149, 150, 151, 152, 153, 154, 175, 176, 177, 178, 179, 180, 181, 182, 183, 184, 185, 186, 187, 188, 189, 190, 191, 192, 193, 194, 195, 196, 197, 198, 199, 200, 201 по ул. Алибегова, 12Б, общей площадью 1 677,4 кв.м.

Недвижимое имущество принадлежит эмитенту на праве собственности. Дополнительные обременения отсутствуют.

Оценка объектов залогового недвижимого имущества произведена собственником в соответствии с Актом о внутренней оценке от 16.06.2014.

Совокупная оценочная стоимость объектов залогового недвижимого имущества в соответствии с Актом о внутренней оценке по состоянию на 16.06.2014 г. составляет 16 795 032 450 (Шестнадцать миллиардов семьсот девяносто пять миллионов тридцать две тысячи четыреста пятьдесят) белорусских рублей без НДС.

**14. Период проведения открытой продажи облигаций**

Дата начала открытой продажи облигаций: 21 июля 2014 года.

Дата окончания открытой продажи облигаций: дата продажи последней облигации, но не позднее 29 марта 2016 года.

**15. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Размещение облигаций осуществляется эмитентом ежедневно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 220121, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 39, офис 8Н.

**16. Порядок размещения облигаций**

Размещение облигаций осуществляется путем открытой продажи физическим и юридическим лицам – резидентам и нерезидентам Республики Беларусь на внебиржевом рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

До момента покупки облигаций, покупатели должны заключить с эмитентом договор в простой письменной форме, предусматривающий обязательства эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций.

Цена размещения облигаций определяется исходя из соотношения спроса и предложения, сложившегося на рынке строительства недвижимости в период размещения облигаций и может отличаться от номинальной стоимости облигаций.

**17. Срок обращения облигаций**

Срок обращения облигаций: 619 календарных дней, с 21 июля 2014 года по 31 марта 2016 года включительно.

**18. Дата начала погашения облигаций**

Дата начала погашения облигаций: 31 марта 2016 года.

Генеральный директор В.Н. Косило.

Главный бухгалтер М.Л. Гришилова.

Сямейная газета
Выпуск № 9 (13)


Батут у летніку ніколі не пыліцца.

# ВЯРНУЦЦА Ў ДЗЯЦІНСТВА

**Жахлівыя байкі нанач, абмазванне пастай і першыя дыскатэкі. Пасля 13-гадовага перапынку карэспандэнт «Звязды» вярнуўся ў дзіцячы аздараўленчы лагер і даведаўся, чым цяпер жывуць маленькія адпачывальнікі.**


Кадр з кінастужкі «Сардэчна запрашаем, або Пабочным уваход забаронены».

## «ВОЧЫ, ЯК У ТЭРМІНАТАРА!»

Алушта-2001. Гэтая дата назаўжды пасялілася ў маёй памяці, як дзясяткі надпісаў на старых парэпаных сценах аўтобусных прыпынкаў чарнаморскіх курортаў. Яна нараджае ўва мне тузін успамінаў, якія звычайна вокамгненна прыходзяць на памяць тым, хто штогод традыцыйна адзін месяц праводзіў на рыпучых ложках, піў замест аднаго два кампоты, апантана мазаў суседа пастай, ненавідзеў ціхі час і чакаў танцаў на дыскатэках. Дарэчы, я нават помню свой апошні танец. На дыскатэцы я так шалёна скакаў пад чорным крымскім небам, што неўзабаве асеў у патухлае вогнішча, а праз дзень апынуўся ў медпункце. Што казаць, класіка жанру...

Цікава, амаль тое ж самае (пра танцы, пасту і кампот) я пачуў і ад хлопчыка Пашы, разам з якім ішоў да дзіцячага аздараўленчага лагера імя Гастэлы, што знаходзіцца ў лясах пад Заслаўем.

— Мне ў лагеры вельмі спадабалася, — кажа школьнік. — Кормяць смачна. Праграма вельмі цікавая. Насамрэч ёсць чым заняцца. Дзеці сюды прыязджаюць адпачываць з усёй Беларусі, але, як мне здаецца, найбольш іх з Мінска.

— На другую змену прыехалі 347 чалавек. На першай было на 20 менш, — прызнаецца **Святлана МАРЫНОВІЧ, намеснік начальніка лагера па выхаваўчай рабоце — старшы выхавацель.** — І гэта пры тым, што многім бацькам прыйшлося адмовіць, бо проста на ўсіх не хапала месца.

Аздараўленчы лагер імя Гастэлы ў жніўні адзначыць сваё 60-годдзе. Узрост, зразумела, паважаны. Аднак выглядае летнік па-сучаснаму. Калі падымаюся разам са Святланай Марыновіч ад галоўнага ўвахода да сталовай, дзе якраз абедаюць дзеці, заўважаю ладную дзіцячую пляцоўку з батутам, прыгожыя альтанкі. Ад таго, што раней было, засталіся адрамантаваныя будынкі атрадаў, а ад сімвалаў савецкіх лагераў — скульптур піянераў і Ільіча — анічога не захавалася. Як няма і тых славутых вагаў, на якіх праз кожны летні тыдзень узважваліся і параўноўвалі свае кілаграмы тысячы савецкіх хлопчыкаў і дзяўчынак. «Але ж было тут усё», — запэўнівае Святлана Васільеўна і прыносіць праз некалькі хвілін старэнькі альбом з пажоўклай фотахронікай жыцця лагера. На адных здымках — вясёлыя дзеці, якія ходзяць у гусарскіх ківерах, на другіх — яны прататыпы сучасных ролевых гульняў; а вось дзеці адзначаюць свята у гонар Кіргізскай ССР.

— Падобным сучасных школьнікаў наўрад ці здзівіш. Усе цяпер сядзяць у планшэтах і мабільніках, — заўважаю, гартаючы чарговую старонку.

— Але ў нашых правілах унутранага распарадку прапісана, што адміністрацыя адказнасці за асабліва каштоўныя рэчы не нясе, — заўважае Святлана Марыновіч. — Таму большасць школьнікаў тэлефоны сюды не прывозіць. Праўда, некаторыя бацькі ўсё роўна пакідаюць спецыяльныя распіскі, каб дзеці маглі хадзіць са сродкамі сувязі. Пэўны час у лагеры дзейнічаў камп'ютарны клас і ад ахвотных пасядзець перад маніторам не было адбою. У выніку вырашылі абмежаваць доступ. Няхай больш часу праводзяць на свежым паветры, займаюцца ў разнастайных секцыях і гуртках, якіх так багата ў нашым лагеры.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*


Раней адпачывальнікі пераўвасабляліся ў паненак і гусараў.



## ДЗЯКУЙ, НЕ ТРЭБА!

**Сустрэла прыяцельку — мякка кажучы, не ў гуморы. Аказваецца, прыехала да іх бабуля, прывезла 3-гадоваму ўнуку 5 пар шкарпэтак і нейкі там «кіндэрсюрпрыз». І ўсё б выдатна, але ярка-чырвоныя шкарпэткі кітайскай вытворчасці, якія малы тут жа нацягнуў і пайшоў гуляць, пафарбавалі яму ногі і сандалеты, а на шакалад у яго наогул алергія — пра што бабулі нагадвалі неаднаразова. «Уяўляеш, — кіпела знаёмая, — у выніку яшчэ і я вінаватая засталася, бо не ацаніла і не аддзячыла за падарункі! Вядома ж, бабуля прыехала і паехала, а нам цяпер адмывай Жэніка і лячы сып...»**

Нашай сям'і таксама, што ўтойваць, сябры і сваякі часам перадаюць непатрэбныя, бескарысныя рэчы. І як тут адмовішся, калі ведаеш — чалавек выбіраў, стараўся і ўсё гэта ад чыстага сэрца? Кажаш мякка: «Дзякуй, не трэба», — не разумеюць. Кажаш жорстка: «А ты ў гэта сваё дзіця апранула б?» — крыўдзяцца. «Пералапаціўшы» бацькоўскія форумы, пераканалася, што з праблемай непатрэбных падарункаў добра знаёмыя многія. «Мае сёстры і свякроў лічаць, што калі мы жывём за горадам, то дзяцей можна апранаць ва ўсякае рыззё, — і рэгулярна прывозяць заплямленыя ўшчэнт курточкі, збіты абутак 40-га памеру — «навырост», — з горыччу прызнаецца мама траіх дзяцей. — І ніякія тлумачэнні не дзейнічаюць. Я ўжо нават не спрачаюся, а потым выношу ўсё гэта «багацце» на сметнік». Выцягнутыя безразмерныя світары, савецкія калготкі, сінтэтычныя касцюмы дзікіх колераў, непрывабныя пластмасавыя цацкі з дрэнным пахам... Можна зразумець старэйшае пакаленне, якое памятае час татальнага дэфіцыту. Але часта рэчы кшталту «На табе, божа, што нам нягожа» дораць людзі маладыя і далёка не бедныя!

Другі пункт у спісе непатрэбнага — прадукты. Так, прыемна часам атрымаць ад родных ласунак «ад зямлі». Няважна, свойскую каўбасу ці шклянку ўласнаручна сабраных, пахкіх лясных суніц — тут дарагі не прэзент, а ўвага. А калі стрыечная цётка праз трэція рукі прысылае мех чарвівых яблычкаў («Шкада ж, калі прападуць!»), слоікі зацукраванага варэння невядомых часоў альбо пару кіло пераспелых, нясмачных пер'яў цыбулі — з прымаўкай «Затое сваё, без усякай хіміі!»? Як і каму тут патлумачыш, што на кіло яблыкаў і іншых «вітамінаў для дзяцей» ты зарабляеш і сам, а тварог карысней для здароўя купіць фабрычны, чым везці дамашні праз паўкраіны? Пры тым абсалютная большасць гэтых людзей шчыра ўпэўненая, што робіць табе дабро. Адмаўляешся — крыўдуюць. «Вучыся развіваць лаянкавую мышцу», — раіць мне ў такіх выпадках муж. Але пасварыцца справа няхітрая. Захаваць мір і згоду ў сям'і — вось дзе навука.

Можна ўсміхацца і цішком выкідваць «прэзенты». Можна адказваць тым жа. А можна рабіць, як адна з маіх сябровак, якая адчула на сабе эстафету перадачы непатрэбных рэчаў. Цяпер, перш чым аддаць камусьці рэчы сваіх дачок-падлеткаў, яна тэлефануе і пытае: «Ці вам што трэба?» Карыстаючыся выпадкам, перадаю вялікі дзякуй, дарагія сябры і сваякі, хто робіць менавіта так. Якая эканомія часу, грошай і нерваў атрымаецца! І не перажывайце, маўляў, як гэта, ехаць да дзяцей і ўнукаў з пустымі рукамі. Галоўнае — прывязіце сябе. Родныя людзі — гэта самае дарагое, што ў нас ёсць.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

А ЯК ДУМАЕЦЕ ВЫ?
ПАДЗЯЛІЦЕСЯ:
WWW.ZVIAZDA.BY

## У вас будзе дзіця

«ЗВЯЗДА» + АНТ

**Трэці год на тэлеканале АНТ існуе рубрыка «У вас будзе дзіця». Кожны тыдзень беларускім гледачам расійскай праграмы «Пакуль усе дома» паказваюць сюжэты пра дзяцей, якія чакаюць усынаўлення. Дзякуючы праграме свае новыя сем'і знайшлі амаль 50 дзяцей. Да праекта далучылася і наша газета.**

### Саша і Уладзік

Дзесяцігадовы Саша і чатырохгадовы Уладзік з Гродзенскага дзіцячага дома — браты. Саша пастаянна няньчыцца з Уладам, нічога для яго не шкадуе.

Уладзік — адкрыты, вясёлы хлопчык — любіць сервіраваць стол, у яго заўсёды добры апетыт. Слодыч без шкадавання прамяняе на бульбяное пюрэ і катлеты. Хлопчык даволі рухавы, задае шмат пытанняў і ўважліва слухае адказы. Любіць гуляць з машынкамі, канструяваць, складваць пазлы. Даволі лёгка адаптуецца да новых абставін, умее спадабацца. Любіць пахвалу, імкнецца яе заслужыць, прывязаны да выхавацеляў групы.



Саша вельмі ашчадна ставіцца да сваіх рэчаў, з задавальненнем наводзіць парадак у пакоі, добра выконвае працоўныя даручэнні. Любіць спорт.

### Коля і Аня



Гадавалы Колечка і крыху старэйшая Ганначка з Віцебскага дома дзіцяці — брацік і сястра.

У Ганулі вельмі прыгожая, адкрытая ўсмешка. Яна кантактная, спакойная і даверлівая. Любіць прыбірацца і разглядаць сябе ў люстэрка. У групе актыўна гуляе з усімі дзецьмі, добразычліва ставіцца да іх. З радасцю выконвае даручэнні дарослых. Любіць гуляць з лялькамі.

Коля цікаўны, добразычлівы. Калі заўважае, што на яго звярнулі ўвагу, адразу ўсміхаецца. І немагчыма не ўсміхнуцца яму ў адказ. Варта ўзяць малога на рукі і загаварыць з ім, ён абавязкова пераключыць увагу на таго, хто з ім размаўляе. Хлопчык вельмі ласкавы. Любіць гуляць і з лялькамі, і з машынкамі, слухаць музыку і падтанцоўваць пад яе.

Усе пытанні, звязаныя з усынаўленнем ці прыёмам пад апеку дзяцей, дапамогуць вырашыць псіхолагі і юрысты Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення па тэл. 8 (017) 284-71-51.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Майстар-клас

# «ВЕЧАРЫ ДЛЯ ЗАКАХАНЫХ» – НЕ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ШУКАЕ САБЕ ПАРУ



Арганізатары і вядучыя праекта Павел і Алена Кузьміцкія з пяццю старэйшымі дзецьмі.

**Трапяткое пачуццё, пяшчотныя матылькі, далікатныя кветачкі і душэўная цеплыня — усё гэта нібыта адчуваецца ў атмасферы «Вечароў для закаханых». Аднак іх наведванне не заўсёды завяршаецца вянцом — нярэдка пары прымаюць рашэнне расстацца. І гэты вынік станоўчы, лічаць арганізатары праекта, лідары Міжнароднай асацыяцыі вернікаў «Сужэнскія сустрэчы» ў Беларусі Павел і Алена КУЗЬМІЦКІЯ.**

— Адразу папярэджу — гэтыя сустрэчы не для тых, хто шукае сябе пару. Яны для тых, хто ўжо сустракаецца, ці для тых, хто ўжо думае аб шлюбе.

Вечары арганізаваны Міжнароднай асацыяцыяй «Сужэнскія сустрэчы», якая развівалася спачатку пад крыламі каталіцкай Царквы і была распаўсюджана ў краінах Усходняй Еўропы. Пяць гадоў таму да нашага руху далучылася праваслаўная Царква. Але працуем мы не толькі для веруючых.

Асацыяцыя ставіць перад сабой задачу ўзмацнення сужэнскіх сувязяў. Яшчэ трыццаць сем гадоў таму ў гэтым узнікла неабходнасць: сем'і пачалі часцей распадацца.

**У нас усіх, веруючых і не веруючых, ёсць адно жаданне: мы хочам любові, кахання і разумення.**

Сёння «Вечары» сталі натуральнай патрэбнасцю. Пасля іх наведвання ў шлюб уступаюць больш падрыхтаваныя пары. Гэта нібыта майстар-клас жыцця не побач, а разам.

**— Але маладыя людзі цяпер не баяцца жыць разам: спрабуюць, не атрымліваецца — разыходзяцца…**

— Гэта так, але ў тым насамрэч і праблема. У маладых людзей ёсць страх перад шлюбам. Адтуль і так званыя «пробныя шлюбы», іншымі словамі — грамадзянскі шлюб, ці свабодныя саюзы без прыняцця адказнасці за будучыню. Гэтая з'ява ў многім вынікае з асабістага страху ў сэрцы маладых перад думкай, што ў іх не атрымаецца стварыць моцную сям'ю. Гэты страх парадзіае з'яву — быць проста побач, каб пры з'яўленні цяжкасцяў была магчымасць разысціся. Так здараецца таму, што моладзь не бачыць вакол сябе прыкладаў устойлівых зносін і сапраўднага кахання ў сваіх бацькоў ці ў іншых сваякоў. Бачаць няшчаслівыя сем'і ці сем'і, якія распаліся. Такія прыклады нібыта паралізуюць маладых перад зносінамі, плюс да гэтага неразуменне значэння шлюбу. Нашы «Вечары» — гэта магчымасць для маладых акунуцца ў асяроддзе, дзе каханне і любоў непадзельныя. Такія сустрэчы вядуць пары, якія разам жывуць і сорак, і дваццаць, і сем гадоў — рознага стажу ў шлюбе. І маладыя на свае вочы бачаць, што калі развіваць адносіны са сваёй «палавінкай», то разам можна пераадолець любыя жыццёвыя цяжкасці.

**— Хто звычайна наведвае «Вечары для закаханых»?**

— Раней да нас прыходзілі маладыя вернікі, якія актыўна ўдзельнічалі ў жыцці Царквы. Сёння гэта часцей за ўсё студэнты, якія цікавяцца разнастайнымі рэчамі ў жыцці, адкрыты да новых ведаў, думак і поглядаў, якія працівяцца стэрэатыпам. Пра «Вечары» студэнты расказваюць адзін адному і самі нас рэкламуюць у студэнцкай брацыі. Да таго ж нашы аб'явы можна знайсці на каталіцкіх сайтах.

**— У якім фармаце праходзяць гэтыя сустрэчы?**

— Адразу на першым занятку пасля знаёмства мы расказваем чым будзем займацца на працягу двух месяцаў. Мы распрацавалі каля дваццаці тэм для абмеркавання. Яны дапамагаюць перш за ўсё спазнаць сябе і партнёра. Тэмы таксама тычацца адносін мужчыны і жанчыны, адносін з блізкімі. Яны часта звязаны з будучым, напрыклад, з прыняццем дзяцей, прывычак, веры, асаблівасцяў. Мы, аніматары-вядучыя, толькі ілюструем, як прымалі тую ці іншую сітуацыю. Некаторыя з маладых, гледзячы на нас і на нашы гісторыі, вырашаюць, што яны так ніколі не будуць жыць, што ў іх будзе інакш, бліжэй да ідэалу. Іншыя лічаць, наадварот, што для іх наш прыклад занадта ідэальны і яны так ніколі не змогуць жыць. Мы ніколі не дэманструем ідэальную карцінку, а паказваем адносіны такімі, якія яны ёсць: цяжкасці, якія перажываем, і радасці, якія атрымліваем. Каб моладзь, размаўляючы на пэўныя тэмы, бачыла розныя шляхі вырашэння і вучылася сама знаходзіць іх.

Вечар доўжыцца дзве-тры гадзіны з кава-паўзамі, а потым закаханыя яшчэ атрымліваюць заданні. З падрыхтоўкай хатняга задання ў маладых праблем не існуе, бо на абмеркаванне тэм даецца тыдзень.

**— Якая тэма больш выклікае цікавасць у закаханых?**

— Тэма, якая выклікае і цікавасць, і спрэчкі — дзеці. Колькі і калі заводзіць, а потым пытанні прыняцця і выхавання дзяцей. Напрыклад, расказваем, як з падобных сітуацый знаходзілі выйсце мы з жонкай. Дарэчы, у нас шасцёра дзяцей. Хаця, калі б нам да шлюбу сказалі, што ў нас будзе іх столькі, то, скажу вам адкрыта, я пакруціў бы пальцам ля скроні. І праўда, ёсць такі стэрэатып, што шматдзетныя сем'і — гэта такія людзі рашучыя, якія з самага пачатку ведаюць, чаго хочуць. Магчыма, яны маюць яшчэ вобраз такіх вар'ятаў, якія ўяўна не былі прыкладам ні для мяне, ні для маёй жонкі. На «Вечарах» мы расказваем, як усё ж прынялі такую колькасць, аб страхах, якія перажылі ў гэтай сувязі, як бунтавалі, калі даведваліся аб кожнай наступнай цяжарнасці, аб думках пра аборт. Як баяліся, што мы не справімся, не асмельваліся сказаць пра новую цяжарнасць бацькам, пасавалі перад фінансавымі і бытавымі цяжкасцямі. Але з другога боку, паказваем радасць, якую адчуваем, калі ў доме з'яўляецца немаўля, ад свайго становішча, ад той падтрымкі і любові, якую адчуваем ад сваіх дзяцей. Мы не прапагандуем шматдзетнасць, проста расказваем, як спраўляемся з тым, што ў нас так атрымалася. Ведаю, што распадаюцца сем'і, дзе і чацвёра, і пяцёра дзяцей. Дзеці — не спосаб «склеіць» адносіны. Для гэтага ёсць зусім іншы шлях. Мы гаворым, што ў нашай сям'і шматдзетнасць — гэта адказ на наша каханне адно да аднаго.

**— А як жа самы распаўсюджаны страх матэрыяльных праблем? Тое, што можна дазволіць сабе з двума дзецьмі, цяжка дазволіць з трыма і гэтак далей. Як вы прапануеце змагацца з гэтым?**

— А мы нічога не прапануем. Мы расказваем, як з гэтым спраўляліся. Такі страх спадарожнічаў і спадарожнічае нам заўсёды. І з першым, і з другім і з трэцім…

Нам заўсёды здавалася, што з'яўленне кожнага наступнага дзіцяці адкіне нас за своеасаблівую мяжу. Але гэта аказалася праўдай не ў фінансавым сэнсе, а ў размеркаванні ўвагі дзецям. Мы заўсёды адчуваем жаль і віну перад сваімі дзецьмі за тое, што не ў стане надаць кожнаму ўвагі столькі, колькі было б увагі аднаму дзіцяці. Малыя так хутка растуць, што я не паспяваю заўважаць час іх сталення, спадарожнічаць з імі ў гэтым часе. Але я прымаю гэтую сітуацыю і раблю ўсё, што ў маіх сілах. Другая праблема, з якой мы сутыкнуліся, — асуджэнне шматдзетнасці асяроддзем і блізкімі. Калі ў нас было адно дзіця, мы нічога не разумелі. Калі два — нам падалося, што мы сапраўдная сям'я. Калі з'явілася трэцяе, то адчулі сябе свяцільняй, быццам бы мы — ідэальная сям'я. І, галоўнае, пра гэта нам гаварылі ўсе навокал: маўляў, малайцы, у такі час асмеліцца нарадзіць траіх. Аднак з нараджэннем чацвёртага ўсё змянілася: нам ужо ніхто не гаварыў, што мы малайцы, у лепшым выпадку маўчалі. У іншых — адкрыта казалі, што гэта безадказна і ненармальна… Для нас цяжка было прыняць рэакцыю бацькоў. І больш за ўсё дасталася маёй жонцы. Немагчыма захоўваць спакой, калі самыя блізкія людзі пыталіся, навошта нам яшчэ адно дзіця. Страх і няўпэўненасць і так жывуць у сэрцы жанчыны, а тут яшчэ асуджэнне асяроддзя і блізкіх людзей… Гэта перарастала ў праблему ўсёй сям'і. Але мы ўсё пераадолелі, таму што кахаем адно аднаго.

**— Вы гаварылі, што на «Вечарах» можна даведацца аб сутнасці шлюбу. У чым жа яна?**

— Для мяне асабіста — гэта відавочнае «перавязванне» людзей паміж сабой на ўсё жыццё. Сімвалічна гэта робіцца яшчэ на вянчанні, калі святар у праваслаўнай ці каталіцкай царкве падчас Таінства перавязвае рукі маладым і яны прамаўляюць абяцанні. Тут мне бачацца два бакі. Адзін — гэта немагчымасць развесціся (гэта спрошчанае разуменне шлюбу, якое мне вельмі не падабаецца). І іншы, больш дасканалы, — жаданне дваіх быць разам, жаданне асаблівай блізкасці, якая пачынаецца падчас Таінства і развіваецца ўсё жыццё. Аднак на «Сужэнскія сустрэчы» і на «Вечары для закаханых» часта прыходзяць людзі, якія далёкія ад Царквы і неадукаваныя ў гэтым сэнсе. Я бачу, як нашы словы і прыклады лёгка кладуцца на іх душы. Больш праблем бывае з людзьмі «вельмі рэлігійнымі», якія закасцянелі ў нейкіх сваіх перакананнях і лічаць, што ўсё павінна праходзіць у нейкіх рамках і межах. Некаторым з іх здаецца, што ўсё, аб чым мы гаворым на сустрэчах, — гэта занадта свабодна. Але патрэбна разумець, што нашы сустрэчы і вечары не маюць адкрытай багаслоўскай рыторыкі. Хоць многія людзі дзякуючы ім наноў адкрываюць для сябе царкву, бо бачаць, што і там людзі з пачуццямі, праблемамі, сваімі радасцямі і болем. У нас усіх, веруючых і не веруючых, ёсць адно жаданне: мы хочам любові, кахання і разумення.

**— Ёсць меркаванне, што ў Царкве ўсё занадта патрыярхальна, што жонка не мае права пярэчыць мужу…**

— У пытанні размяркоўвання функцый у сям'і мы не ўплываем на людзей. Кожная пара робіць свой выбар, як ім будаваць адносіны. Галоўнае, каб жаданне патрыярхату, матрыярхату ці раўнапраўя не зыходзіла толькі ад мужа ці толькі ад жонкі. Мы накіроўваем пару на дыялог, каб яна гаварыла паміж сабой, каб кожнаму ў створанай ці будучай сям'і было камфортна, каб рашэнне прымаць на сябе адказнасць аднаго з сужэнцаў не зняважала і не знішчала годнасці другога. «Вечары для закаханых» — гэта падрыхтоўка да шлюбу. І калі адзін з пары разумее, што ён не згодны і не гатоў пражыць жыццё з чалавекам, з якім яму цяжка дамовіцца ў чымсьці, то лепш адмяніць вяселле, адмовіцца жыць побач з гэтым чалавекам.

**Сёння «Вечары» сталі натуральнай патрэбнасцю. Гэта нібыта майстар-клас жыцця не побач, а разам.**

Больш за тое, мы нават лічым поспехам, калі ўдзельнікі «Вечароў для закаханых» расстаюцца ці адкладваюць вяселле і бяруць час на роздум. Гэта значыць, што мы добра папрацавалі, што пары прымаюць рашэнне ажаніцца ці разысціся не на падставе эмоцый, а на падставе розуму і распазнаных пачуццяў. Бывае і наадварот, прыходзяць маладыя ў самым пачатку сваіх адносін і падчас вечароў разумеюць, што іх пачуцці развіваюцца ў добрым кірунку, што ім разам хораша, у іх атрымліваецца дамаўляцца па самых невераготных пытаннях, і яны прымаюць рашэнне ажаніцца. Спадзяёмся толькі, што сем'і, якія ствараюцца пасля наведвання вечароў, будуць такімі, дзе пануюць любоў і згода, дзе сужэнцы слухаюць адно аднаго, разумеюць сваю «палавінку» і заўсёды гатовы прабачаць.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

*Даведка «СГ»*

**Заснавальнікамі «Сужэнскіх сустрэч» выступілі Ірэн і Ежы Гжэбоўскія, а першыя, арганізаваныя з удзелам святароў, сустрэчы сямейных пар прайшлі ў Польшчы ў 1977 годзе. У нашай краіне аналагічны праект, накіраваны на ўмацаванне духоўнай сувязі ў сем'ях, дзейнічае з 2004 года.**

**«Вечары для закаханых» праходзяць у Мінску пры каталіцкіх храмах два-тры разы на год, звычайна падчас пастоў, калі не спраўляюць вяселлі.**

# ДАЧА: АДПАЧЫНАК ЦІ АДПРАЦОЎКА?



**Андрэй МАЛІНОЎСКІ, кіраўнік аддзела па закупках:**

— Ведаю, знаходзіцца многа ўмельцаў, для якіх увесь сэнс дачы — сабраць з якіх-небудзь 4 сотак мегаўраджай бульбы. Аднак для мяне дача — гэта змена абстаноўкі, найперш, безумоўна, дзеля адпачынку і аднаўлення сіл. І ніякай «фазенды» ў гэтым месцы быць не павінна. Трэба, каб былі мангал для шашлыкоў, альтанка, гамак. Быць можа, яшчэ пара град з зяленівам «на стол», але не ў вялікіх маштабах, не для нарыхтовак.

Зразумела, некалі на дачы трэба і папрацаваць — траву падкасіць, нешта адрамантаваць, іншыя дробныя справы. Але гэта, лічу, абсалютна не праблема, бо робіш для сябе. Галоўнае, выконваць усе дачныя работы без фанатызму, а з задавальненнем.




**Любоў ПАЎЛАВА, інжынер:**

— Для мяне дача — гэта адназначна адпачынак. Калі не было сваёй дачы, я прыязджала да сваячкі. Там мы разам даглядалі агарод і сад. Але я ад такой працы заўсёды адчувала задавальненне. Нават прыемна ўспомніць…

Цяпер у нас з'явіўся свой невялікі кавалачак зямлі. Там і сапраўды шмат працы: дом дабудаваць, на самім участку газон аднавіць, кветкі пасадзіць, сад і агарод прывесці ў парадак. Але гэта мы ўсё робім не напружваючыся, каб атрымаць задавальненне ад добра зробленай працы. Ды інакш мой муж адмовіўся б прыязджаць. Клопаты на дачы для нас — своеасаблівы адпачынак ад гарадскога рытму. Мы ніколі не саджаем агародніну ў прамысловых маштабах, а столькі, каб гэта прыносіла радасць, а не стомленасць.

У нас ёсць правіла: ніколі не прыязджаем на дачу толькі «папрацаваць». Там за кубачкам кавы і абмяркоўваем нашы сямейныя навіны, і шашлыкі робім, і снедаем на свежым паветры… Але, згадзіцеся, адпачываць усё ж лепш і прыемней на дагледжанай тэрыторыі.

■ Кропка на сэрцы

# ЦЯГНІК ДАЛЕЙ НЕ ІДЗЕ...



**У большасці медыцынскіх устаноў урачы пераконваюць хворага чалавека ў тым, што ён хутка паправіцца. Іншая справа — хоспіс.**

Сюды трапляюць тыя, каму ўжо не наканавана паправіцца. І вельмі страшна, калі сярод тых, каму хвароба падпісала смяротны прысуд, які нельга абскардзіць у ніводнай інстанцыі, — дзеці. Няма большага гора для іх бацькоў...

У сваёй працы грамадская дабрачынная арганізацыя «Беларускі дзіцячы хоспіс» кіруецца трыма асноўнымі прынцыпамі. Калі дзіця нельга вылечыць — гэта яшчэ не азначае, што яму нельга дапамагчы. Хоспіс працуе дзеля жыцця, колькі б яго ні заставалася. А каб дапамагчы невылечна хворым дзецям, ва ўсім павінны быць кампетэнтнасць і прафесіяналізм. Бо эмацыянальнае выгаранне на такой працы непазбежнае...

Пацыенты Беларускага дзіцячага хоспіса — гэта дзеці і маладыя людзі, якім яшчэ не споўнілася 24 гадоў. Трапляюць яны сюды пасля заявы бацькоў і заключэння медыцынскай камісіі хоспіса.

Не кожны дыпламаваны спецыяліст здолее дапамагчы бацькам змірыцца з думкай, што надзеі на выздараўленне іх дзіцяці больш няма, усвядоміць, што смерць — гэта пачатак жыцця вечнага... І менавіта таму за сям'ёй, у якой выхоўваецца хворае дзіця, замацоўваецца спецыяльная каманда апекі. У яе ўваходзяць урач, медыцынская сястра, сацыяльны работнік і псіхолаг. Пры неабходнасці сям'ю наведваюць сядзелка і свяшчэннік. Гэтая каманда аказвае паліятыўную дапамогу на даму. Такі падыход скіраваны не толькі на аблягчэнне пакут невылечна хворага чалавека, але і на тое, каб аказаць вельмі важную псіхасацыяльную і духоўную падтрымку як яму, так і родным.

Кожная з медсясцёр робіць штодня два візіты ў сям'ю, дзе выхоўваецца хворае дзіця. Усяго ж летась такую рэгулярную дапамогу атрымалі 240 сем'яў па ўсёй краіне. Для дзяцей з анкалагічнымі захворваннямі паліятыўная падтрымка можа аказвацца кругласутачна. Разам з бацькамі яны могуць засяліцца ў міні-стацыянар, які размешчаны непасрэдна пры хоспісе. Актыўна дапамагаюць супрацоўнікам хоспіса і валанцёры.

— Летась у нашых праграмах і мерапрыемствах удзельнічалі прыкладна 150 добраахвотных памочнікаў, — заначае **дырэктар Беларускага дзіцячага хоспіса Ганна ГАРЧАКОВА.** — Ёсць сярод іх хлопцы і дзяўчаты, якія наведваюць дзяцей як у стацыянары, так і дома. Можна нават сказаць, што яны не даюць дзецям замкнуцца ў сабе, фактычна замяняючы сяброў і аднакласнікаў. Мы вельмі ўдзячны валанцёрам і за прафесійную дапамогу — многія памочнікі замяняюць нам перакладчыкаў, дызайнераў і кіроўцаў.

**Паколькі бацькі даглядаюць цяжка хворых дзяцей няспынна, у іх не застаецца часу нават на самы кароткі адпачынак ці на вырашэнне бытавых праблем. Таму дарослым прадастаўляецца своеасаблівы «кароткі водпуск».**

Шчыльна працуюць валанцёры з дзецьмі ў летнім цэнтры адпачынку «Бусел», які знаходзіцца ў вёсцы Забродзе Стаўбцоўскага раёна. Мінулым летам там адпачылі 62 дзіцяці. Чаго толькі не было ў праграме: разнастайныя гульнявыя, пазнавальныя мерапрыемствы, шматлікія экскурсіі, спартыўныя гульні, дыскатэкі, штовячэрні касцёр... А ў іншыя поры года дзейнічае клуб «Сустрэчы сяброў». Сваёй мэтай ён ставіць сацыяльную адаптацыю дзяцей, якія маюць групу інваліднасці. Спецыяльныя праграмы для выхаванцаў хоспіса рыхтавалі разнастайныя творчыя і студэнцкія калектывы з Універсітэта культуры і мастацтваў, Акадэміі музыкі і Ваеннай акадэміі, курсанты Суворавскага вучылішча разам з вучнямі гімназіі №17, сярэдняй школы №161, Бараўлянскай школы мастацтваў...

Супрацоўнікі хоспіса распрацавалі і спецыяльныя праграмы для бацькоў. Адна з іх носіць назву «Сацыяльная перадышка». Паколькі бацькі даглядаюць цяжка хворых дзяцей няспынна, у іх не застаецца часу нават на самы кароткі адпачынак ці на вырашэнне бытавых праблем. Таму дарослым прадастаўляецца своеасаблівы «кароткі водпуск». А ўсе абавязкі па доглядзе дзіцяці на гэты час супрацоўнікі хоспіса возьмуць на сябе.

Тры гады таму Беларускі дзіцячы хоспіс атрымаў участак узвядзення новага будынка, у які плануе пераехаць з Бараўлянаў. Размесціцца ён у пасёлку Вопытным у Мінскім раёне. Будаўніцтва пачнецца сёлета.

— Наш будаўнічы праект прайшоў экспертызу, і цяпер актыўна ідзе збор сродкаў для пачатку працы, — гаворыць **памочнік дырэктара па пытаннях стратэгічнага развіцця Алена АНІСІМАВА.** — Дзякуючы дабрачыннай дапамозе ад фізічных і юрыдычных асоб мы летась атрымалі крыху больш за паўтара мільярда рублёў.

Што будзе ў новым хоспісе? У ім размесціцца стацыянар на дзесяць месцаў (цяпер тут могуць знаходзіцца адначасова толькі 3-5 дзяцей). Для пражывання бацькоў будзе пабудавана спецыяльная гасцініца. Адкрыецца цэнтр дзённага знаходжання для дзяцей-інвалідаў. У дзяцей і іх родных будзе магчымасць наведаць капліцу...

Акрамя таго, дадае Алена Анісімава, новы будынак пазбавяць звыклай калідорнай сістэмы. У кожным пакоі будзе пражываць толькі адно дзіця, а ўсе вокны пакояў будуць выходзіць толькі на сонечны бок. Для тых дзяцей, якія не могуць рухацца, праектам прадугледжаны спецыяльныя пад'ёмнікі і ліфты. У ім можна будзе знайсці ўсё патрэбнае медыцынскае абсталяванне. І менавіта таму новы дзіцячы хоспіс стане буйнейшым цэнтрам дзіцячай паліятыўнай дапамогі ў Беларусі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

**P.S.** *Сярод сяброў апошняй станцыі дзіцячага жыцця шмат знакамітых людзей. Гэта алімпійскія чэмпіёнкі Аляксандра Герасіменя і Дар'я Домрачава, футбаліст Аляксандр Глеб, саліст групы «J: МОРС» Уладзімір Пугач, спявак і вядучы Георгій Калдун, акцёр Вадзім Галыгін, рэкардсмен кнігі Гінэса Кірыл Шымко...*

■

**На сёння ў Беларусі, паводле неафіцыйнай ацэнкі Міністэрства аховы здароўя, каля 3000 дзяцей пакутуюць на невылечныя захворванні. Дапамогу Беларускага дзіцячага хоспіса штогод атрымліваюць каля 250 дзяцей па ўсёй краіне, аднак гэта менш чым 15% ад усіх, хто мае патрэбу ў паліятыўнай дапамозе.**

**З 2004 года дзіцячы хоспіс знаходзіцца ў асобным катэджы ў пасёлку Бараўляны Мінскага раёна. Гэты будынак, хоць і камфортны як жылы дом, але абсалютна не прыстасаваны для медыцынскай установы.**

**Згодна з планам, агульны кошт будаўніцтва, добраўпарадкавання прылеглай тэрыторыі і неабходнага медыцынскага абсталявання арыенціровачна складзе каля 35 мільярдаў рублёў.**

**Даведацца аб тым, як дапамагчы Беларускаму дзіцячаму хоспісу**
(акрамя фінансавай падтрымкі, тут заўжды рады сродкам гігіены і догляду, расходным медыцынскім матэрыялам),
**можна на сайтах www.hospice.by, www.newhospice.by ці па тэлефоне: (017) 505-27-45 (47).**

# ЖЫЦЬ СЁННЯ

**Восем гадоў таму я трапіла ў Цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі (тады яшчэ ён меў іншую назву) нявопытным валанцёрам, які хацеў змяніць свет. Я дапамагала пацыентам бавіць час, адцягвала ад горкіх думак, заваёўвала ўсмешкі. Праз тры гады з выпадковай неабходнасці нарадзіўся дабрачынны рух "Клуб 5000", дзе 5000 беларускіх рублёў дастаткова, каб выратаваць жыццё. Галоўнае — каб нас было шмат.**

**Работа клуба нагадвае бег на месцы. Бег на месцы — гэта фізічная нагрузка з пэўнай мэтай. Ты трэніруеш мышцы, спальваеш калорыі, набываеш прывабную форму, паляпшаеш здароўе. Але часам здаецца, што гэта бессэнсоўна. Ты бяжыш, але застаешся на месцы. Гэткая імітацыя руху. Вось так і ў нашай справе: якой бы марнай яна часам ні падавалася, вынікі адчуваюць на сабе ўсе бакі.**




Самы галоўны ўрок, які я засвоіла ў гэтай школе жыцця, — безапеляцыйнае перакананне: трэба ЖЫЦЬ! Сёння. Тут і цяпер. Не існаваць, хадзіць, есці. А атрымліваць асалоду, радавацца кожнаму імгненню, любіць тое, што робіш.

Стас ляжаў у аддзяленні пасля складанай аперацыі. Яму выдалілі костку на назе і замянілі пратэзам. Ён вучыўся хадзіць, пераадольваў цяжкасці пасляаперацыйных ускладненняў, пакорліва прымаў дозы хіміятэрапіі. У Стаса была саркома. У 18 гадоў. Хлопец узяў акадэмічны водпуск ва ўніверсітэце і працягваў займацца самастойна, каб не адстаць ад праграмы. Ён перапісваў канспекты, рашаў задачы. Душой ён быў разам са сваімі аднагрупнікамі на лекцыях, капусніках і экзаменах. Яго жыццё працягвалася па-за сценамі бальніцы. Але ён быў вымушаны сядзець у палаце і глядзець на мыліцы.

Аднагодкі Стаса хадзілі на спатканні, сустракаліся з дзяўчатамі, пазнавалі радасць першага кахання і яго расчараванні. А Стас усё глядзеў на мыліцы. Аднойчы ён спытаў:

— А праўда, што «Камасутра» — вельмі карысная для адносін кніжка?

Яму хацелася працаваць над адносінамі, пакуль у тэорыі.

Тады я напісала аб'яву на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы. Маўляў, ёсць такі Стас, лечыцца ад раку, марыць пра «Камасутру», дапаможыце парадаваць хлопца. Магу сабе ўявіць шок чытачоў! Тут жа пасыпаліся каментары: «Гэта што, жарт?!», «Як табе не сорамна!», «Табе вернуцца такія здзекі!» і г. д. Гэта цяпер я пасміхаюся са сваёй наіўнасці. А тады для мяне не было нічога дзіўнага ў тым, што хворыя хлопцы маюць такія ж патрэбы, што і здаровыя. Я нават не адразу зразумела, дзе падвох і чаму на мяне накінуліся.

Карацей, знайшоўся адзін чалавек, які падзяляў мае погляды і падарыў Стасу «Камасутру». Чытала ўсё аддзяленне! Мне яшчэ доўга ўзгадвалі той падарунак. І дарослыя хлопцы, якія «заліпалі» ў сваёй хваробе, да якіх было не дастукацца, прынялі мяне за сваю. Яны паверылі мне, зразумелі, што я ведаю іх сакрэт: яны такія ж, як усе астатнія.

Дарэчы, Стас паправіўся. Скончыў універсітэт, пабудаваў сабе кватэру. І кожны раз, калі прыязджае да мяне ў госці, мы ўзгадваем тую «Камасутру».

Жэньку было 17. Калі ляжаў адзін у палаце, а сон ніяк не прыходзіў, ён глядзеў тэлевізар. У той вечар паказвалі фільм пра каханне. Хлопец пачаў адкрываць для сябе новы свет. Назаўтра ён папрасіў тэт-а-тэт доктарам. Распытваў пра сваю фізіялогію, пра ўплыў хіміятэрапіі на мужчын. Магчыма, ён таксама марыў пра «Камасутру».

Жэньку пашанцавала менш, чым Стасу. Ён ніколі не зможа працаваць над адносінамі, нават у тэорыі. Ён не адкрые новых магчымасцей і не паспрабуе невядомае. Яму назаўсёды засталося 17.

Я радуюся, калі назіраю гісторыі кахання тут жа ў анкацэнтры. Радуюся таму, што яны працягваюць жыць. Магчыма, гэта ўсё, што ім засталося: бальнічныя сцены і сусед з дванаццатай палаты. У іх можа быць мала часу, і яго нельга марнаваць на хваробу і дэпрэсію. Трэба паспець пражыць, адчуць, пасмакаваць.

Вы б бачылі, якія чэргі выстройваюцца, калі мы прывозім у клініку майстраў па манікюры, педыкюры, цырульніцу. Большасць з тых, хто ў чарзе, — гэта мамы, закрытыя горам у чатырох сценах. Але прыходзяць і дзяўчаты-пацыенткі.

Часам бывае і такое: заходзіш у палату, запрашаеш у «салон прыгажосці», а мама пачынае ўсхліпваць, пасля пераходзіць на рыданні.

— Навошта мне тая прыгажосць, калі ў мяне дзіця хворае? Каму мы такія патрэбны?..

Так думалі і тыя, хто абвінавачваў мяне ў пошуку «Камасутры» для Стаса. А яна хвалявала яго больш за выдаленую костку. Бо нельга ўвесь час думаць пра тую злашчасную костку, хваробу і мыліцы.

— Не фатаграфуйце мяне, я лысая.

Але ты прыгожая, нават без валасоў. Любі сябе рознай, любі сябе такой. Радуйся сабе ў любым стане, у любым выглядзе, працягвай жыць. Жыць сёння.

Прыехалі ў анкацэнтр перад Новым годам. Ходзім па аддзяленні з падарункамі. Стукаем у адзіночную палату — тут ляжыць студэнтка. Уваходзім: сядзіць на ложку з закручаным ручніком вакол галавы, твар мажа крэмам. Пра незвычайнасць становішча нагадвае толькі катэтар у вене. Мы адразу разумеем, што ёй падарыць. Дастаём з меха акуратную аксамітавую карабачку. Яе, разам з іншымі падарункамі, перадалі самалётам з Францыі. Серабрыстая падвеска каня на ланцужку паблёсквае маленькімі камянькамі.

— Гэта мне? — не адрываючы вачэй ад каробкі.

— Так, з Францыі даслалі. Добры знак: конь — сімвал года.

Не паспяваем зачыніць на сабой дзверы, як чуецца радасны віскат:

— Мама, ты бачыла?! Гэта мне, з Францыі! Прыгажосць якая! Ты толькі паглядзі!

Мы набываем для дзяўчат упрыгажэнні, абнаўляем гардэроб, дастаём эксклюзіўныя аксесуары, дарагую касметыку. І няхай толькі хто заікнецца пра недарэчныя растраты. Гэта бывае больш важным і патрэбным за лекі. Гэта дапамагае жыць.

Калі мая цётухна захварэла на анкалогію, то вырашыла з'ездзіць у Венецыю. За свае 50 гадоў яна ніколі не была за мяжой, нічога не бачыла. І раптам адчула: час надышоў. У яе не было запасу грошай, але апошнія патраціла на квіток. Яна вельмі дрэнна сябе адчувала, але мужна перанесла пералёт. Боль пранізваў усё цела, але яна ўсміхалася на кожным фотаздымку. Пасля Венецыі цёця Люба яшчэ з'ездзіла праведаць брата ва Украіне, якога не бачыла больш за дзясятак гадоў. Раней у яе не хапала часу, грошай, замінаў побыт, знаходзіліся больш важныя справы. Падарожжа ў Венецыю і сустрэча з братам — гэта тое, што яна паспела ў сваім жыцці. Бо раптам зразумела, што хоча жыць. Тут і цяпер.

Я хачу, каб вы не чакалі апошняга моманту. Каб былі побач з тымі, каго любіце. Каб падарожнічалі. Бачыліся з роднымі. Каб чыталі «Камасутру». Каб траціліся на абноўкі. Каб слухалі сваё сэрца і не адмаўлялі яму. Жывіце сёння.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА, кіраўнік дабрачыннага руху «Клуб 5000».**

# ВЯРНУЦЦА Ў ДЗЯЦІНСТВА



Другая змена ў разгары.

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Пасля заезду прайшоў усяго тыдзень. Дадому амаль ніхто не хоча. Добрым, каларыйным харчаваннем задаволены амаль усе, але па любімых гаджэтах дзеткі насамрэч ужо засумавалі. Пра гэта ледзь не ў адзін голас сцвярджае ўвесь атрад, які мы спынілі каля спальнага памяшкання. Аднак знайшоўся сярод большасці і адзін вучоны хлопчык:

—Тэлефон псуе наш зрок... — ён толькі распачаў свой аповед, як адразу быў спынены астатнімі.

— Ды ў нас сучасны зрок! Мы ніколі не аслепнем. Глядзіце, у нас вочы, як у тэрмінатара!

— А што вы без тэлефонаў і планшэтаў тут робіце?

— Гуляем у футбол, ходзім у гульнявы пакой, дзе ёсць аэрахакей, настольны футбол, дзіцячы більярд, і на дыскатэку. Чытаем, расказваем жахлівыя гісторыі!

Дарэчы, пра кнігі я не аслухаўся. **Вера МАРХОЦКАЯ, сацыяльны педагог, бібліятэкар,** ад адпачывальнікаў у захапленні.

— Вось тут для старэйшых сабрала самую чытаную літаратуру, — кажа Вера Паўлаўна і пераносіць з палічкі на стол у невялічкай бібліятэцы стос кніжак пра Гары Потэра. — Вось тут казкі, а там — творы беларускіх пісьменнікаў, матэрыялы пра знакамітага лётчыка Мікалая Гастэлу, з якімі знаёмім кожны атрад. Рэкамендуем, каб чыталі творы са школьнай праграмы. Днямі адбылася агульналагерная віктарына. У дзяцей таксама пыталіся пра творы беларускіх і рускіх пісьменнікаў. Адказвалі яны, між іншым, правільна.

### ХТО ЎПАЛЮЕ «ЛАСЯ»?

— Ведаю, што ў многіх аздараўленчых лагерах прытрымліваюцца праграмы і праводзяць абавязковыя мерапрыемствы накшталт традыцыйнай лінейкі і конкурсу «Міс і містар», — працягвае размову Святлана Марыновіч. — Мы самі рыхтуем сцэнарый святочнага мерапрыемства, прысвечанага юбілею лагера. Запрасілі выступіць на нашай эстрадзе Георгія Калдуна і іншых беларускіх спевакоў. Акрамя таго, наш культарганізатар і педагог-арганізатар самастойна распрацавалі гульні для дзяцей: «Гары Потэр» паводле кінастужкі і «Паляванне на лася». Сэнс другой забавы ў наступным. Мы ўмоўна аб'яўляем дзяцей, што знаходзімся ў лесе, просім разбіцца на каманды па 10 чалавек і арганізаваць сапраўднае паляванне. Ад паляўнічых па ўсім лагеры хаваюцца важатыя, якія з'яўляюцца звярамі, кожны з якіх мае свой кошт. Самы дарагі жыхар — лось. Цікава, што даведацца пра значасць «трафею» можна толькі тады, калі каманда «прынясе» здабычу на базу. Толькі пасля гэтага «звер» можа прызнацца, хто ён насамрэч. А перамагае той, хто набярэ найбольшую колькасць балаў. Акрамя таго, да нас у госці са сваімі праграмамі прыязджае планетарый, навуковае шоу «Адкрывашка», 3D-кінатэатр. Запланавалі бясплатныя экскурсіі ў Ракаў, Заслаўе і Ратамку.

**Паводле звестак Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва, у Беларусі налічваецца 170 атэставаных стацыянарных аздараўленчых летнікаў на 32 041 ложка-месца.**

Дарэчы, нікуды не знікла і добра вядомая «народная забава» — абмазванне зубной пастай. Кожны свой «дзембель» у летніку дзеткі і сёння адзначаюць, пакідаючы густыя белыя ланцужкі на тварах сваіх сяброў.

**Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара.**



Самая папулярная кніга ў мясцовай бібліятэцы — «Гары Потэр» Джоан Роўлінг.

## Паста, гірлянды з абутку і 7-кіламетровы крос

**Эксперты «Звязды» распавялі аб тым, што варта ведаць бацькам пра дзіцячыя жарты ў аздараўленчых лагерах.**

**Георгій КАЛДУН, спявак, важаты з 12-гадовым стажам:**

— Традыцыя маляваць зубной пастай на тварах таварышаў паступова знікае. І гэта робіцца дзецьмі свядома. Мы пастаянна тлумачым ім, што пасты выраблююць з разнастайных хімічных матэрыялаў, і маляванне імі можа мець негатыўныя наступствы. Тым больш у лагеры цяпер прыязджаюць адпачываць шмат алергікаў. Нягледзячы на гэта, дзеці працягваюць забаўляюцца, як могуць: калі добрае надвор'е, абліваюцца вадой, закідваюць шышкі ў ложак, пэцкаюцца фламастарамі, звязваюць рэчы скотчам і робяць гірлянды з абутку. А нядаўна, пакуль ніхто не бачыў, укралі вечарам ключы ад важацкіх пакояў і пакінулі цыдулку з заданнем, у якім прапаноўвалі важатым адправіцца на пошукі. У выніку ў 11-12 гадзін ночы важатыя бегалі па тэрыторыі і шукалі свае ключы, а той, хто не знайшоў, быў вымушаны шукаць сабе месца для начлегу. Але ўсе разумелі, што гэта жарт, і ніякіх разборак не ўчынялі.

**Ігар ПЕТРУЛЕВІЧ, журналіст:**

— Насамрэч у лагеры небяспечна засынаць раней за ўсіх. У нашым спартыўным летніку па таэквандо рабіць іначай было складана, бо на дзень прыпадала па тры трэніроўкі, і вечарам звычайна вельмі хацелася спаць. У выніку ад пасты аднойчы пацярпеў мой сусед. Многія наогул так соладка спалі, што заўважалі «авангардныя» малюнкі на тварах толькі раніцай. Па вялікім рахунку, ад звычайнага наш лагер нічым не адрозніваўся. Напэўна, толькі фізічнымі заняткамі і асаблівымі дысцыплінарнымі мерамі. Калі сябе дрэнна паводзілі, нам маглі прызначыць 7-кіламетровы крос. Як нас супакойвалі ўначы? Загадвалі адціскацца. Аднойчы адзін з маіх таварышаў разбіў шкло мячом у сваім пакоі, вырашыў пагуляць у бунтара, не захацеў застацца пасля заняткаў і атрымаў за гэта «прыемную» надбаўку ў выглядзе дадатковай трэніроўкі. Але на нашы нагрузкі амаль ніхто не наракаў. Усё было цудоўна! Мы фарміравалі мышачны карсет у несфарміраваным юнацкім арганізме. Насамрэч я часам адчуваю настальгію па тым часе. Мне не хапае нашых трэніровак, дзіцячай бесклапотнасці. І я з вялікай асалодай замест сённяшняга сядзення за камп'ютарам бегаў бы кросы.

■ Справа гонару

# ЛЮБОЎ БЕЗ ПЕРАКЛАДУ,

## або Як студэнт-медык замяніў пляменнікам тату і маму

**Ці ведаеце вы, што ў Арменіі няма і ніколі не было дзіцячых дамоў і дамоў для састарэлых? Чаму? Ды таму, што там нікому ў галаву не прыйдзе пакінуць сваё дзіця ў раддоме ці падкінуць на ганак багатага дома, а роднага чалавека, якому патрэбна дапамога, адштурхнуць ад сябе, здаць на догляд чужым людзям! Нават пасля страшэннага землетрасення 1988 года, калі загінула неймаверная колькасць людзей, калі многія дзеці не знайшлі сярод жывых бацькоў, а бабулі з дзядулямі — сваіх дзяцей, гэтыя богаўгодныя ўстановы не з'явіліся. І дзяцей, і старых забралі сваякі. Блізкія і нават вельмі далёкія. Так тут робіцца спрадвеку.**



Тата і дзеці: Ануш, Карэн, Сафія і пляменнік Артур (здымак 1997 года).

І п'яніц у Арменіі няма. Калі ў 1975 годзе ў сувязі з кампаніяй па барацьбе з п'янствам і алкагалізмам у Ерэване пабудавалі выцвярэзнік, армяне глядзелі на яго як на нейкае дзіва. Можаце сабе ўявіць, праз пару месяцаў давялося выцвярэзнік перабудоўваць пад нейкую іншую ўстанову, бо ніводнага п'яніцы не знайшлі, каб сюды змясціць. Гэта пры тым, што армянскае застолле не абыходзіцца без добрага сухога вінаграднага віна, звычайна хатняга вырабу, і без уласнай... самагонкі. Так, так, самагонкі. Але гоняць яе тут з ягад шаўкавіцы, кізілу, вінаграду, без дражджэй. Заводскую гарэлку мала хто купляе. Ды і п'юць, можна сказаць, напарсткамі, каб падтрымаць вясёлы дух гутаркі за сталом. А на чале застолля — самыя паважаныя ў доме людзі — старэя. Няхай нават яны самі не могуць выйсці, іх выносяць на руках і саджаюць побач. Як рабілі некалі і яны, будучы маладымі. Дзеці бачаць, як ставяцца іх бацькі да сваіх бацькоў, і гэта асядае ў іх памяці назаўсёды. Так падтрымліваецца традыцыя.

Пра гэта расказаў мне пры сустрэчы віцябчанін Эдуард Лявонавіч Мачкалян, які называе сябе беларускім армянінам або армянскім беларусам.

...Так атрымалася, што для некалькіх братоў сям'і Мачкалян Беларусь стала другім домам. Спачатку ў Бабруйск пераехаў старэйшы, Рафаэль, які падчас практыкі пазнаёміўся са студэнткай Бабруйскага хіміка-тэхналагічнага тэхнікума беларускай Верай і, хоць інтэрнацыянальныя шлюбы ў армян не вітаюцца, ажаніўся. Можна было б за непаслушэнства паставіць у фамільным склепе камень, пад якім закапаць сыну вопратку, а на ім напісаць імя праклятага, як гэта робіцца ў Арменіі дагэтуль, — і выкрасліць Рафаэля з сэрца. Але бацькі на такі крок не пайшлі і, калі нарадзіўся першы ўнук, даравалі сыну.

Праз некалькі гадоў Джаан (падамашняму Жэня) прыехаў да брата ў Бабруйск вучыцца — і таксама сустрэў тут сваё каханне. Па тым жа сцэнарыі хуценька абзавяліся дзецьмі — нарадзіліся двое дачок, Ануш і Сафія, і сын Карэн.

Якраз у гэты час паміж Арменіяй і Азербайджанам успыхнуў сумнавядомы Карабахскі канфлікт, а следам за адной бядой — другая: страшэнны землятрус у снежні 1988-га. Хто ж ведаў, што водгалас яго дакоціцца і да Беларусі! Жэня паехаў наведаць бацькоў (маму падчас бамбёжак паралізавала, пахіснулася здароўе і ў бацькі), а назад у Бабруйск не вярнуўся. Ад убачанага ў 26-гадовага, поўнага сіл маладога мужчыны адбылося кровазліццё ў мозг. Трое яго дзяцей засталіся фактычна сіротамі: маці, зразумеўшы, што «не падыме» іх адна, пачала наладжваць асабістае жыццё, і малыя ёй заміналі.

Эдуард, малодшы з братоў, на той час адслужыў у Савецкай Арміі і вырашыў застацца ў Беларусі. Паступаў у Мінскі і Віцебскі медыцынскія інстытуты, але няўдала. Працаваў вадзіцелем тралейбуса ў Віцебску і не пакідаў думкі стаць урачом. У 1989-м стаў студэнтам стаматалагічнага факультэта Смаленскай медыцынскай акадэміі. Атрымаў інтэрнат. Паехаўшы на канікулы ў Бабруйск, убачыў, што пляменнікі не дагледжаны і маці амаль няма да іх справы. Спачатку забраў да сябе Ануш, а пасля Карэна. Дзеці жылі і вучыліся ў школе-інтэрнаце, Эдуард ноччу працаваў грузчыкам на хлебакамбінаце, а днём упарта ўгрызаўся ў медыцынскую навуку. Усе пяць гадоў пляменнікі, якія называлі яго татам, былі побач з ім.

Пасля вучобы (а Савецкі Саюз ужо развалійся) Эдзік — грамадзянін невядома якой краіны — прыехаў у Віцебск, на месца апошняй перад паступленнем прапіскі. Прыняў грамадзянства Беларусі. Спецыялісту-стаматолагу работа знайшлася адразу. Спачатку жылі ў прыгараднай вёсцы Бабінічы, потым знялі аднапакаёўку ў горадзе. Эдуард вымушаны быў забраць з Бабруйска і малую Сафійку: маці і на яе гатова была напісаць адмову.

Пакуль у школе набіраліся ведаў дзеці, разам з імі вучыўся і іх няўрымслівы дзядзька-тата. Завочна скончыў біялагічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава, потым юрыдычны. Спытаеце, навошта тры вышэйшыя адукацыі? Ды каб ведаць больш самому і больш аддаць дзецям. Адначасова глыбока вывучаў практычную стаматалогію. Працуючы ўрачом, заслужыў павагу і пацыентаў, і калег. У 2003 годзе Эдуард Лявонавіч стаў асістэнтам кафедры стаматалагічнага факультэта Віцебскага медуніверсітэта. Тут падрыхтаваў і абараніў дысертацыю. Цяпер кандыдат медыцынскіх навук Эдуард Мачкалян — завуч кафедры агульнай стаматалогіі ВДМУ. Ды і дзеці — не невукі: Ануш — студэнтка 3-га курса эканамічнага факультэта Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, Сафія скончыла Бабруйскі каледж лёгкай прамысловасці. А Карэн упадабаў бацькаву прафесію — за яго плячыма Віцебскі медуніверсітэт. Ён жыве з сям'ёй у Мінску, урач-стаматолаг дзіцячай практыкі з сумяшчэннем дарослай арпедыі. І самае галоўнае: дзеці ўзнагародзілі свайго тату ўнукамі — двума хлопчыкамі і дзяўчынкай.

Эдуард Лявонавіч умее не толькі лячыць і вучыць людзей, выхоўваць на ўласным прыкладзе пляменнікаў і ўнукаў, але і адмыслова забаўляць. Дадзены яму Богам талент — мастацкі свіст. У яго выключны музычны слых. Кожную нотку ён высвіствае так, што складваецца ўражанне, быццам спявае салавей. Эдуард выступае пад акампанемент прафесійнага актэта балалаек «Віцебскія віртуозы». А яшчэ піша вершы з глыбокім філасофскім падтэкстам.

І не пытаецца ў Эдуарда, чаму ён «павесіў сабе на шыю» чужых дзяцей. Ён пакрыўдзіцца. Яны не чужыя, а родная брата. І той бы яго дзяцей не пакінуў. Так у армян заведзена...

**Таццяна КУЗЬМІЧ.**

*г. Віцебск.*

■ Пясочніца

### КРЫХУ ПЕРАБЛЫТАЎ

На дзень народзінаў Ваню спыталі, кім ён хоча быць, калі вырасце. Хлопчык нечакана заявіў: «Алкаголікам». Дарослыя ў шоку, перапытваюць чаму. Ваня тлумачыць: «Бо ў іх шмат грошай». Пасля доўгіх тлумачэнняў, што алкаголікі — далёка не тыя людзі, на якіх варта раўняцца, гаворку пераводзяць на іншую тэму.

Праз некалькі дзён уся сям'я глядзіць тэлевізар. І тут Ваня, пачуўшы знаёмае слова, падхопліваецца і крычыць: «Я пераблытаў — не алкаголікам, а алігархам!»

### НАША ВЯЛІКАСЦЬ

Маці павяла сына ў новую групу ў дзіцячым садку. Выхавацель пытаецца:

— У нас два Колі ў групе. Што будзем рабіць?

— Завіце мяне Мікалай першы, — прапануе малы.

### АЗІРНУЦЦА НЕ ПАСПЕЕШ

Трохгадовая Маша пытаецца ў бацькі:

— Тата, а калі скончыцца рамонт, мне колькі гадоў будзе?



Фота Тараса ШЧЫРАГА.

### ЯК ВАС ТАМ

Антон (6,5 года) звяртаецца да мамы:

— Мам, я забыўся: каровы, гусі, куры, козы — як адным словам называюцца? Скаціна або сволачы?

### ДЗЕ ЛОГІКА?

— Так, Вераніка, нешта мы цябе распесцілі, — канстатуе бацька на капрызы 4-гадовай дачкі. — Давядзецца, відаць, пачаць караць.

— Як гэта, — абураецца малая, — вы распесцілі, а мяне — караць?

### ГЭТА, БРАТ, НАВУКА!

Жонку забралі ў радзільны дом на захаванне, а дома застаўся муж з двума дзецьмі — сынамі 4 і 2 гадоў. Давялося тату карміць малых, а згатаваць ён здолеў толькі макароны — дый тое перасаліў. Першым на кухню прыйшоў старэйшы сын, пакаштаваў макарону і моўчкі выйшаў з-за стала. У дзвярах сустрэў малодшага і ўзяў пад руку:

— Хадзем, не трэба есці! Ты ў мяне пакуль што адзіны брацік...

Давялося тэрмінова выклікаць на дапамогу цешчу.

### ПАВОДЛЕ БАБУЛІ

— Сашуня, хадзі да мяне!

— Я не Сашуня, я прыгажосць не... не... Як там мяне бабуля называе? А, вось: я прыгажосць незямная!

### СТРАШНАЯ ПОМСТА

Маці за нейкую правіну насварылася на 5-гадовага сына. Той дэманстратыўна надзьмуўся, сеў на падлогу, узяў паперу з алоўкамі і заявіў:

— А я тады цябе тоўстую намалюю!

### «СЫШЛА НА БАЗУ»

Аліне 3 гады. Сядзіць з цацачным наборам доктара, бярэ ў рукі фанендаскоп:

— Зараз рыбку палаўлю.

— Дачушка, гэта ж для доктара, — заўважае тата.

— Ну, добра, я доктар. Што ў вас баліць?

— Ды вось, горла баліць. Можаце палячыць?

— Не магу.

— Чаму?

— Я рыбу лаўлю...

■ Школа зносін

# МАЛЕНЬКІЯ ВЯЛІКІЯ СЯБРЫ



## Як выбраць хатняга гадаванца для дзіцяці

«Купі сабаку!». З нежаданнем, а то і з жахам чакаюць бацькі гэтых слоў ад сваіх дзяцей. Рана ці позна гэта можа здарыцца ў кожнай сям'і — дзіця захоча жывёліну. Калі маленькі «цар» перамог у сваім імкненні, паўстае пытанне: як выбраць хатняга гадаванца для дзіця, такога, каб з ім было больш-менш камфортна ў доме і каб сыну ці дачцэ было цікава бавіць з ім час?

**Спачатку:**

— Перш чым заводзіць жывёлу, зрабіце аналіз крыві дзіцяці на алергены. Схадзіце ў госці да знаёмых, у якіх ужо ёсць дома жывёліна, звярніце ўвагу, як дзіця з ёй кантактуе.

— Хатнія жывёлы павінны стаць сябрамі і членамі сям'і не толькі для дзіцяці, але і для вас. Назіраючы, як вы ставіцеся да гадаванца, дзіця будзе пераймаць вашы паводзіны. Не варта заводзіць жывёлу, калі нехта з блізкіх супраць новага члена сям'і.

— Рэальна разлічвайце свае магчымасці — часавыя, прасторавыя і фінансавыя. Ці хопіць месца ў доме/кватэры для вялікага сабакі? Ці ёсць куды паставіць акварыум? Колькі грошай з бюджэту вы гатовы выдаткаваць на набыццё і «абслугоўванне» жывёлы?

— Уявіце хоць бы на паўгода наперад, хто ў сям'і стане «галоўным адказным» за гадаванца — будзе яго карміць, прыбіраць за ім, выхоўваць, вазіць да ветэрынара. Не вядзіцеся на слёзныя абяцанні нашчадка, што ён усё зробіць сам: яго імпэту хопіць у лепшым выпадку на некалькі тыдняў, а далей клопат ляжа ў асноўным на вашы плечы. Самастойна даглядаць свайго гадаванца могуць толькі дзеці сярэдняга або старэйшага школьнага ўзросту.

— Маленькія дзеці часта ўспрымаюць жывёлу як жывую мяккую цацку. Таму выбірайце яе трэба так, каб пры стасунках не пацярпелі ні хатні гадаванец, ні дзіця.

Зносіны з хатнімі жывёламі заўсёды спрыяюць эмацыйнаму росту дзіцяці. Яно вучыцца суперажываць, спачуваць іншым, пераадольвае пачуццё зайздрасці ў дачыненні да братоў і сясцёр, гэта значыць, эмацыянальна развіваецца. Для малых важна, што жывая істота прымае іх без крытыкі і з поўным даверам. Калі дзіця вучыцца адказнасці за іншую, больш слабую за сябе істоту, то пачынае адчуваць сілы і ўпэўненасць у сабе. Асабліва ў апошні час, калі жывыя зносіны часта замяняюцца тэлевізарам або камп'ютарам, дзецям важна не адчуваць сябе адзінокімі і пакінутымі.

**А цяпер абмяркуем непасрэдна варыянты выбару.**

Для дзяцей вельмі важнае значэнне маюць тактыльныя кантакты — дотык і абдымкі азначаюць для іх увагу і любоў. **«Хамякі, дэкаратыўныя трусы** і ўсялякія **грызуны** падабаюцца дзецям тым, што іх можна гладзіць, насіць у руках, браць з сабой на вуліцу, — адзначае **заводчык карлікавых трусоў Настасся КУЗНЯЦОВА.** — Яны збольшага ласкавыя, кантактныя. Праўда, маленькія дзеці могуць не ўсачыць за жывёлай або выпадкова нанесці ёй шкоду. Затое для дзяцей, старэйшых за 6–7 гадоў, асабліва ў сем'ях, дзе ўмовы не дазваляюць завесці ката або сабаку, гэта, бадай, ідэальны першы гадаванец. Тым больш што актыўныя дзеці заўсёды мараць аб пастаянным партнёры для



гульняў». Дарэчы, у выпадку з грызунамі не варта купляць пару жывёл, калі вы не гатовы да таго, што праз паўгода іх вывадак не будзе куды падзець. Да таго ж грызуны жывуць нядоўга, а дзеці вельмі прывязваюцца да сваіх маленькіх сяброў, і для іх будзе стрэсам гібель жывёлы. Паспрабуйце суцешыць і правільна растлумачыць дзіцяці, што адбылося: ад страт у жыцці вы не зможаце яго засцерагчы, але ў вас будзе магчымасць хоць бы падрыхтаваць яго. У цэлым жа, грызуны — самы эканамічны і непатрабавальны да ўмоў жыцця варыянт.

***Важна:** варта даведацца пабольш пра кожны від загадзя. Дэкаратыўныя трусы, напрыклад, не любяць, калі іх бяруць на рукі, таму могуць лёгка падрапаць і дарослага.*

**Рыбкі** не патрабуюць шмат увагі і аддачы, але за імі ўсё адно неабходна прыбіраць, чысціць акварыум, карміць, адсаджваць і г.д. З эмацыйнага пункту гледжання, з імі не пагуляеш, не возьмеш у рукі і не пагладзіш (а многія дзеці спрабуюць — як можна здагадацца, нічым добрым гэта не завяршаецца). У той жа час гэтая акалічнасць можа навучыць ваша дзіця любіць жывых істот, не патрабуючы нічога ўзамен, — што карысна для спешчаных, эгаістычных дзяцей.

***Важна:** галоўнае ў варыянце з рыбкамі — надзейна замацаваны акварыум.*



**Чарапаха,** напэўна, ідэальная жывёла. Але толькі для бацькоў. Гэтыя марудлівыя рэптыліі хутка надакучваюць дзецям. З імі не пагуляеш, не пагаворыш, ды і навобмацак яны не ўяўляюць ніякай цікавасці для малых. Да таго ж дзіця можа неспадзявана ўпусціць чарапаху, што вельмі небяспечна для яе здароўя.

Гіперактыўныя малыя супакойваюцца, калі яны гладзяць **ката** або **сабаку**, вучацца кантраляваць свае эмоцыі і сілу рухаў. Таму, калі ваша дзіця неўраўнаважанае і схільнае да істэрык, лепш за ўсё завесці кацяня або шчанюка. Дзякуючы адрозненню ў характары гэтых жывёл дзіця можа навучыцца ў кошкі незалежнасці і спакою, а ў сабакі — адкрытасці і вернасці. Для таго каб ваша дзіця расло разам з сабакам або кошкай, заводзіць іх лепш за ўсё тады, калі малому споўніцца 3–4 гады. Вядома, тут вам прыйдзецца цалкам браць увесь клопат пра жывёлу на сябе. Калі вы хочаце, каб дзіця клапацілася пра яе само, лепш дачакацца, пакуль яму не споўніцца 10–12 гадоў.

«Сабакі далёка не ўсіх парод добра ўзаемадзейнічаюць з дзецьмі, — нагадвае **ўрач-ветэрынар Аляксей МАКАРЧУК.** — Самымі кемлівымі і ласкавымі лічацца колі, сенбернар, спаніэлі, нямецкія аўчаркі, лабрадоры, баксёры, шнаўцары, эрдэльтэр'еры і дварнякі». Але трымаць вялікага сабаку ў цеснай гарадской кватэры не вельмі зручна. А невялікія сабачкі (таксы, леўрэткі, той-тэр'еры, ёркшырскія тэр'еры) дрэнна ўжываюцца з дзецьмі: яны занадта раўнівыя і бачаць у дзецях сапернікаў у барацьбе за ўвагу дарослых. Вельмі не рэкамендуецца заводзіць для дзіцяці сабак байцоўскіх парод — асабліва бульдога і бультэр'ера. Што ж тычыцца кошак, заўважана, што каты больш цярплівыя, чым коткі, ставіцца да таго, што дзеці іх хапаюць, ціскаюць, цягаюць за хвост. Самымі ласкавымі лічацца ангорская, бірманская, гімалайская, экзот, бенгальская, руская блакітная. А парода рэгдол (даслоўна «лялька») была спецыяльна выведзена для зносін з дзецьмі — гэта кошкі з асабліва мяккім, памяркоўным характарам.

***Важна:** не палянуйцеся, купіце даведнік або добра пакапайцеся ў інтэрнэце і выберыце пароду разам з дзіцем, узважыўшы ўсе «за» і «супраць».*

Розныя **птушкі** — канарэйкі і папугайчыкі — таксама досыць непераборлівыя. Але варта ўлічваць, што, па-першае, яны мо-



гуць пры недаглядзе вылецець у адчыненую фортку, а па-другое, птушкі даволі шумныя. Для дзяцей 3–4 гадоў заводзіць падобных маленькіх сяброў не рэкамендуецца. Але менавіта птушынае цвырканне дазваляе некаторым дзецям наладзіць з імі кантакт: іх можна вучыць гаварыць, спяваць, чаго не атрымаецца, напрыклад, з кошкай або сабакам. Таму розныя птушкі падыходзяць дзецям з парушэннямі маўлення. Прычым не варта адразу заводзіць дарагіх экзатычных папугаяў — падыдуць звычайныя хвалістыя. Адразу ж растлумачце дзецям правілы паводзін з птушкамі: не выпускаць з клеткі і не адчыняць форткі, калі птушка ўсё ж такі вылецела.

***Важна:** птушыны пух і пыл ад корму могуць выклікаць алергічныя рэакцыі. Не варта ставіць клетку з птушкай у пакоі, дзе дзіця знаходзіцца доўгі час.*

Жывёл з дзікай прыроды — **вавёрак, вожыкаў, тхароў** — у сям'ю зусім не рэкамендуецца браць, незалежна ад узросту дзіцяці. Па-першае, вы не ведаеце, якія інфекцыі жывёла можа прынесці ў ваш дом. Па-другое, тыя ж тхары і мілыя на першы погляд вожыкі — драпежнікі, а значыць, ім патрабуецца адпаведны рацыён і выхаванне. Ды і ўкусы незадаволеных вавёрак вельмі хваравітыя і небяспечныя. Вожык у кватэры, напрыклад, дастаўляе шмат турбот і хутка надакучвае. У выніку гаспадары не вытрымліваюць і адвозяць вожыка ў лес. Прычым не заўсёды туды, дзе знайшлі, і гэта можа пагражаць жывёле гібеллю.

**Экзотыка.** Забудзьцеся. Ні павукі, ні слімакі-ахаціны, ні мадагаскарскія прусакі сем'ям, дзе ёсць маленькія (да 7–10 гадоў) дзеці, не падыдуць: гэтыя гадаванцы проста не пражывуць у вас доўга і гуляць з імі даволі складана.

Зносіны з **коньмі** рэкамендаваны дзецям з ДЦП і праблемамі апорна-рухальнага апарату. Дома гэтую жывёлу (пра кватэру і размовы няма), вядома, дазволіць можа сабе далёка не кожны, але звадзіць дзіця ў спецыяльную школу верхавой язды хоць бы раз на месяц можна час знайсці.

І ў заключэнне адзначым: калі ваша дзіця даволі доўга і настойліва просіць завесці яму хатняга гадаванца, пастаўцеся да яго просьбы сур'ёзна і знайдзіце рэзервы. Пастарайцеся не пазбаўляць дзіця такіх важных зносін з жывымі істотамі, якіх не заменяць ніякія, самыя складаныя і дарагія цацкі.

**ВЕЛЬМІ ВАЖНА:**
**Калі дзіця прыносіць жывёлу з вуліцы, не выкідвайце яе назад. Гэта можа нанесці псіхалагічную траўму, якая ў далейшым праявіцца ў жорсткасці і бяздушнасці, звернутых на іншых жывёл або нават на блізкіх людзей. У крайнім выпадку паспрабуйце ўладкаваць жывёлу ў іншых людзей або ў прытулку.**

■ Правілы паводзін для бацькоў

# НЕ КРЫЧЫЦЕ І НЕ «ТЫКАЙЦЕ»



**Самае важнае ў стасунках паміж дарослымі і дзецьмі — гэта роўнасць ва ўсім. У правах, адказнасці і супрацоўніцтве. Роўнасць — але не тоеснасць. Інакш кажучы, падлетак не павінен працаваць столькі ж, колькі яго бацька. Гэта тоеснасць, а не роўнасць. Працаваць, калі ўжо гаварыць пра гэта, падлетак павінен столькі, колькі яму дазваляюць сілы. А вось якой будзе прастора правоў, абавязкаў і супрацоўніцтва дзіцяці, гэта бацькі павінны вырашыць у кожным канкрэтным выпадку — самі або пры актыўным удзеле дзяцей.**

— Намаганні бацькоў павінны быць увесь час скіраваны на выяўленне прычын непрымальных паводзін дзяцей, — тлумачыць **псіхолаг Рэспубліканскага інфармацыйна-метадычнага рэсурснага цэнтра «Ювентус» 17-й гарадской дзіцячай клінічнай палiклінікі Мінска Кацярына БАРШЧЭЎСКАЯ.** — А крытыка той формы, у якой гэтыя прычыны праяўляюцца (лянота, агрэсіўнасць, непаслухмянасць), выдае бацькоўскую некампетэнтнасць. Бацькі не павінны крычаць, абвінавачваць, пагражаць, чытаць натацыі. Трэба пастаянна высвятляць, чаму здарылася тое і тое... Выхоўваючы дзяцей, выхоўвайце сябе. Дзеці капіруюць усе звычкі і манеру паводзін дарослых. Дзіця будзе крычаць на бацькоў падчас спрэчак, калі яно бачыла, як бацька і маці менавіта з «дапамогай» крыку высвятляюць адносіны. Калі ў сям'і не прынята праяўляць пачуцці, суперажываць, то і дзіця не будзе дзяліцца асабістым...

Вельмі карысная для глыбокага разумення працэсу выхавання будзе кніга Томаса Гордана «Трэнінг бацькоўскай эфектыўнасці». Па меркаванні гэтага аўтара, эфектыўнае бацькоўства трымаецца на трох важных рэчах. Гэта актыўнае слуханне, «я» — паведамленні і бяспройгрышнае вырашэнне канфліктаў.

### АКТЫЎНАЕ СЛУХАННЕ

Дапусцім, у дзіцяці нешта «здарылася»: «Вася дрэнны, я яго ненавіджу! Не пайду больш на вуліцу!» Што рабіць? Не ўспрымаць праблему малога дзіцяці як сваю ўласную! Дарослы ўсё роўна не зможа наладзіць стасункі свайго малога з іншымі людзьмі замест яго. Актыўнае слуханне заключаецца ў тым, каб добра ўсведамляць сутнасць паведамлення, бясконца пераконвацца, што вы ўсё зразумелі правільна. Напрыклад:

**Дзіця будзе крычаць на бацькоў падчас спрэчак, калі яно бачыла, як бацька і маці менавіта з «дапамогай» крыку высвятляюць адносіны.**

*— Вася пхнуў мяне...*

*— Ты упаў. Табе баліць. Табе, напэўна, крыўдна.*

*— Угу. Ніколі больш не буду з ім гуляць.*

*— Думаю, ты на яго вельмі злуешся.*

Эмацыянальнае ўзрушэнне звычайна хутка праходзіць. Між тым у працэсе такой простай размовы можна даведацца шмат цікавага і нечаканага, бо тут мае быць поўная адкрытасць. Гэта цудоўны спосаб устанавіць з дзіцем блізкія, даверальныя стасункі.



Бацькам усяляк неабходна змагацца са спакусай наставіць дзіця на правільны шлях, нават калі яно скажа, што падпаліць ненавісную школу. Іначай давер будзе страчаны назаўсёды. Пачуцці ўсё ж такі мінаюць. Калі эмацыянальны ўсплёск сцішыцца, дзіця і само знойдзе разумнае рашэнне. А ў гэты момант яму патрэбна проста падзяліцца сваімі эмоцыямі.

### «Я» — ПАВЕДАМЛЕННЕ

Стомлены пасля працы бацька лёг на канапу і разгарнуў газету.

Пяцігадовы сын пачынае караскацца на тату, хапаецца за газету, камячыць яе. Тата крычыць:

— Адчапіся! Не перашкаджай! Ты аглух? Як мне гэта абрыдла!

Тата сфармуляваў свае патрабаванні вельмі зразумела. Аднак дзіця і не думае «адчапіцца». У вачах дзіцяці дарослы чалавек — гэта нехта вялікі, важкі, у каго не могуць быць непрыемнасці на працы, не можа балець галава. А вось у маленькага чалавечка шмат вялікіх праблем. Яго пастаянна непакояць пытанні: «Хто я? Які я? Каму патрэбны? Навошта жыву?» Значыць, дзіця ў гэтым выпадку чуе: «Ты дрэнны. Без цябе мне лепш. Я хачу, каб цябе не існавала». Ва ўсіх падобных сітуацыях у дзяцей рушыцца свет і да іх свядомасці даходзіць толькі адно: «Ты дрэнны».

Адмоўцеся ад слоў «ты», «цябе», «табе», «твае». Гаварыце толькі пра сябе! «Я», «мне» і г.д.

— Я вельмі стаміўся. Мне трэба перадыхнуць. Я хачу пагартаць газету, але не магу спакойна ляжаць, калі па мне нехта коўзаецца.

Аднак трэба пазбягаць фраз кшталту «я злуюся». Бо ў любым выпадку гэта азначае «ты дрэнны». «Я злуюся» ўказвае не на наяўнасць праблем у таго, хто так кажа, а падкрэслівае жаданне пакараць таго, хто гэтыя праблемы выклікаў. Значыць, неабходна называць тыя пачуцці, якія папярэднічалі гневу. Напрыклад: «Я так хвалявалася, пакуль цябе не было дома! Што я толькі не перадумала!».

**Бацькам усяляк неабходна змагацца са спакусай наставіць дзіця на правільны шлях, нават калі яно скажа, што падпаліць ненавісную школу. Іначай давер будзе страчаны назаўсёды.**

Бывае, што дзеці праяўляюць залішнюю ўпартасць.

*— Ты штодня кажаш, што стомлены,* — можа заявіць наш хлопчык.

Значыць, трэба прыгадаць тэхніку актыўнага слухання.

*— Ты хочаш, каб я з табой пагуляў? Табе весела гуляць менавіта са мной? Але мне цяпер цяжкавата на працы, і вечарам сапраўды не застаецца ніякіх сіл. Што ж нам рабіць?*

Паступова можна высветліць, што дзіця гатова пачакаць і да выхадных, або яму трэба пачытаць любімую кніжку, або, нарэшце, дзіця гатова проста пасядзець у нагах і паводзіць сябе вельмі ціха.

Правільнае пагадненне — гэта калі задаволены ўсе ўдзельнікі і няма тых, хто прайграў. На этапе выканання дамоўленасцяў трэба таксама вытрымліваць працэдуру выпрацоўкі сумеснага рашэння.

### БЯСПРОЙГРЫШНАЕ ВЫРАШЭННЕ КАНФЛІКТАЎ

Стрымлівайце імкненне дзіцяці правакаваць спрэчкі з іншымі дзецьмі. Адцягвайце яго ўвагу.

Не абвінавачвайце другое дзіця, хоць тут цяжка будзе заставацца аб'ектыўным. Варта выслухаць усіх. Пасля канфлікту трэба высветліць прычыны ўзнікнення такой сітуацыі, вызначыць няправільныя дзеянні свайго дзіцяці.

Не абмяркоўвайце праблемы паводзін дзіцяці ў яго прысутнасці — яно пераканаецца, што канфлікты непазбежныя, і будзе працягваць правакаваць іх.

Не заўсёды трэба ўмешвацца ў спрэчкі дзяцей. Дзіця павінна само вырашыць канфлікт, яму неабходны такі вопыт. Аднак калі дзіця просіць дапамогі, то дапамагчы трэба.

Забарона і павышэнне голасу — самыя неэфектыўныя спосабы пераадолення агрэсіўнасці. Гэта, хутчэй, правакацыя. Ціхі, спакойны тон здольны крыху ўраўнаважыць.

Не дазваляйце сабе ў прысутнасці дзіцяці дрэнна выказвацца пра іншых людзей, успыхваць у гневе.

Дзіця пастаянна павінна адчуваць, што вы цэніце і прымаеце яго любым. Гаварыце з дзецьмі, слухайце іх, расказвайце пра сябе. Агрэсіўныя паводзіны дзіцяці могуць быць яго адказам на халоднае сямейнае асяроддзе.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

■ Парады псіхолага

# ЛАМАЦЬ НЕ БУДАВАЦЬ



**На пытанні чытачоў адказвае старшы выкладчык кафедры псіхалогіі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, псіхолаг-кансультант Алена ОСІПАВА.**

## ЯК АБУДЗІЦЬ ЧАРОЎНАГА ПРЫНЦА?

*«Мы жанаты ўжо 5 гадоў, а ў мяне такое адчуванне, быццам мінула вечнасць. Пакуль я была ў дэкрэце, муж паводзіў сябе так, быццам бы мы з дзіцем для яго абуза, а ён «цар гары»: даваў грошы, і на гэтым яго ўдзел у сямейных справах і побыце заканчваўся. Перад выхаднымі дома ён аддаваў перавагу рыбалцы і футболу з сябрамі, жыў сваімі інтарэсамі. Нават агульны сямейны адпачынак у нас быў усяго адзін. Увесь астатні час мы — на дачы, а тата — дзесьці ў горадзе. Паколькі я цалкам залежала ад яго і ў матэрыяльным, і ў псіхалагічным сэнсе, то ўсе яго выбрыкі цярпела, згладжвала канфлікты, першай ішла на прымірэнне. Але на пачатку гэтага года мне ўдалося ўладкавацца на новую працу, з'явіліся ўласныя грошы, і пакрысе вярнулася ўпэўненасць у сабе. Я ўзгадала, што не толькі хатняя гаспадыня, але яшчэ і сімпатычная жанчына, заўважыла, што падабаюся іншым мужчынам і адзначыла, як паважліва яны да мяне ставяцца. І цяпер усур'ёз задумалася: а ці сям'я гэта, калі толькі адзін партнёр падладжваецца пад настрой другога? Ці ў нас проста ўзаконенае сужыццё? Часам вельмі хочацца развесціся і пачаць з нуля, хоць разумею, што гэта стрэс для дзіцяці і фінансавая яма для нас. Як разабрацца: гэта гаворыць ува мне назапашаная крыўда за мінулыя гады або мы сапраўды сталі з мужам чужымі людзьмі?»*

**Наталля,** *г. Гомель.*

Наталля, развесціся вы заўжды паспееце. Я ж прапаную вам усё-такі прыкласці пэўныя намаганні для захавання сям'і. Зыходзячы з таго, як вы апісалі паводзіны свайго мужа, можна меркаваць, што ён, беручы шлюб, не быў гатовы ў поўнай меры выконваць ролі мужа і бацькі; магчыма, гэта звязана з некаторай яго інфантыльнасцю, запозненым сталеннем. А вы, верагодна, узялі на сябе лішнія абавязкі па забеспячэнні функцыянавання сям'і, тым самым выключаючы ўмовы, пры якіх ён мог бы «сталець». Сітуацыя, якая стварылася, для вашага мужа прывабная, бо ён можа задавальняць свае эмацыянальныя, сексуальныя і іншыя патрэбы і мець пры гэтым мінімум абавязкаў. У яго няма неабходнасці што-небудзь мяняць. Пры гэтым хачу заўважыць, што гэтую сітуацыю ён успрымае як нармальную і нічога не робіць спецыяльна, «са злосці».

Што можна зрабіць, каб змяніць становішча, якое склалася? Паступова перадаваць сужэнцу адказнасць за справы сям'і, выхаванне дзіцяці (заўважу, што за дзіця ваш муж нясе роўную з вамі адказнасць). Безумоўна, напачатку вы будзеце адчуваць супраціўленне, магчымыя канфлікты, пры якіх вам неабходна захоўваць, наколькі гэта магчыма, роўны эмацыянальны стан, разумеючы і прымаючы тое, што адбываецца з вашым мужам. Гэты працэс можа быць дастаткова працяглым, і, натуральна, у вас будуць спакусы кінуць усё і пачаць жыццё з нуля; але дзе гарантыя, што вам зноў не прыйдзецца прайсці гэты шлях?

## ТЫ МНЕ ШЧЫРА СКАЖЫ...

*«Я заўважыў, што мы з жонкай пачалі часта сварыцца. Прычым ніхто іншы не можа мяне так вывесці са стану душэўнай раўнавагі, як гэта робіць яна. Мінімум раз на дзень з той ці іншай прычыны, часта зусім дробязнай, у нас адбываецца разлад, пасля якога я доўга не магу супакоіцца. Стараюся трымаць сябе ў руках, але ўсё часцей раздражняюся з-за нічога — нават сябры гэта заўважылі. У апошні раз пасля сваркі па тэлефоне шпурнуў яго аб сцяну і разбіў... Проста баюся, што аднойчы магу яе ўдарыць. Стараюся «выпускаць пару» ў трэнажорнай зале, але не вельмі дапамагае. Што рабіць?!»*

**Без подпісу.**

Шаноўны Невядомы, у кожнага з партнёраў ёсць свае патрэбы ў шлюбе. У жанчыны гэта патрэбы ў дэманстрацыі любові і адданасці, у шчырых і адкрытых стасунках, размовах, выкананні мужам сямейных абавязкаў, фінансавай стабільнасці. Для мужчыны важнае задавальненне сексуальных жаданняў. Ён таксама мае патрэбу ў тым, каб яго жонка была партнёрам у яго захапленнях і занятках ці, прынамсі, прымала іх як штосьці важнае для яго. Акрамя таго, мужчыну ў сям'і патрэбны мір і спакой, падтрымка ў дасягненнях і праблемных сітуацыях. Калі базавыя патрэбы партнёраў знаходзяць задавальненне ў шлюбе, сямейныя сувязі становяцца мацнейшымі, што з'яўляецца надзейнай асновай для любові, павагі і сужэнскай вернасці, гэта значыць, для шчаслівага шлюбу.

Калі вы хочаце захаваць вашу сям'ю і разам пераадолець прычыны напружання, якое ўжо ўзнікла, адным з крокаў у гэтым кірунку можа стаць адкрытая размова пра вашы ўзаемныя чаканні і патрэбы. А сваркі і непаразуменні, якія суправаджаюць ваша сённяшняе жыццё, — гэта сімптом незадаволеных патрэб, сурагат нармальных зносін, але адначасова сваркі з'яўляюцца яшчэ і дэманстрацыяй таго, што вы адно аднаму неабыякавыя.

■ У нагах праўда ёсць

# «НЯПРАВІЛЬНА ХАДЗІЦЬ — ГЭТА СЯДЗЕЦЬ НА КАНАПЕ!»

## Як знайсці новых сяброў, умацаваць пачуццё гумару і скінуць 19 кілаграмаў, ведае інструктар па скандынаўскай хадзьбе з Мінска

**У нашай краіне гэты спорт зусім малады — больш-менш арганізавана займацца скандынаўскай хадзьбой беларусы пачалі ўсяго некалькі гадоў таму. Але для пераважнай большасці сустрэтыя на бегавых дарожках людзі з палачкамі — усё яшчэ экзотыка.**

— Можам прагуляцца, хоць я сваю норму на сёння ўжо адхадзіла, — сустракае мяне каля ўвахода ў сталічны парк Чалюскінцаў маладжавая, усмешлівая жанчына. — Або, калі хочаце, прысядзем... разоў 50.

### ПЛЮС ВЕДЫ МІНУС КІЛАГРАМЫ

**Ірына СЕНЦЮРОВА** водзіць «свае» групы тут і ў парку Горкага. Але перш чым вучыць іншых, яна выпрабавала на сабе, што гэта за такое моднае еўрапейскае захапленне — скандынаўская хадзьба.

— Актыўна займаюся менавіта ёй крыху больш за год. Раней проста хадзіла — таму, што займацца актыўнымі відамі спорту, кшталту бегу ці аэробікі, ужо не дазвалялі праблемы са здароўем, а не займацца нічым наогул не дазваляў склад характару: я ўсё жыццё, гадоў з 6, займалася то танцамі, то аэробікай... Гуляла штодня, незалежна ад надвор'я, у хуткім тэмпе не менш чым 2—2,5 гадзіны. А неяк сын з нявесткай, вярнуўшыся з Еўропы, спыталі: «Мама, чаму ты ходзіш проста так, калі ўся Еўропа ходзіць з палачкамі?» Літаральна праз тыдзень, істотна «перылапаціўшы» інтэрнэт, я даведалася, што ў нас такое ўжо ёсць, — знайшла ў Мінску інструктара, які праводзіў для ахвотных пробныя заняткі. І толькі ўзяўшы палкі ў рукі, я адразу адчула, што гэта — маё. Праз некалькі месяцаў атрымала сертыфікат інструктара і пачала ўжо сама вучыць іншых.

У цэлым скандынаўская хадзьба грунтуецца на дзвюх тэхніках: спартыўная хадзьба (ад пояса і ніжэй) і хадзьба на лыжах (плечы). «Калі чалавек больш-менш ведае анатомію, дзе якая мышца знаходзіцца, то гэтую хадзьбу вельмі лёгка «апрануць» на сябе, на ўласнае цела. У хуткім часе пачынаеш адчуваць, якія мышцы працуюць, і можаш распрацаваць індывідуальную праграму — што і як рабіць для падтрымання тонусу, пахудзення, дыхальнай гімнастыкі. Як бы чалавек ні хадзіў, ён сабе не нашкодзіць, карысць будзе ўсё адно. Немагчыма «няправільна хадзіць». Няправільна хадзіць — гэта сядзець на канапе! Але для дасягнення найлепшага эфекту хоць бы 1—2 разы ўсё ж лепш займацца з інструктарам, які пакажа і падкажа, як правільна ставіць ногі, каб пасля дзвюх гадзін хадзьбы назаўтра не «разваліцца» і некаторыя іншыя нюансы.

**— У асноўным хто прыходзіць вучыцца? З Еўропы да нас скандынаўская хадзьба прыйшла як спорт для пажылых...**

— Спачатку сапраўды гэта быў кантынгент пажылых — 65, плюс-мінус тры гады. Больш актыўныя, безумоўна, жанчыны, сярод якіх ёсць некалькі заўсёднікаў. Цяпер — мабыць, гэта сезонная з'ява — многія са старэйшых вучняў займаюцца «дачным фітнесам», і прыходзіць вялікая колькасць жанчын маладзейшых, ад 30 да 40 гадоў. Што радуе, сярод іх шмат тых, хто займаецца спортам прафесійна, інструктараў пілатэса, ёгі. Спалучаючы прыёмы з розных відаў фітнесу, можна дасягнуць вельмі цікавых вынікаў. Што да моладзі, прыходзілі некалькі чалавек мінулай восенню і зімой. Але хлопцы і дзяўчаты наведвалі ўсяго па некалькі заняткаў, потым



куплялі палачкі і адпраўляліся ў вольнае плаванне. ...Аднойчы я ішла міма стадыёна, дзе займаліся хлопцы-футбалісты. Спачатку пакпілі з мяне. Калі ж праз некалькі месяцаў мы сустрэліся зноў (а з мінулага жніўня да сёння ў мяне мінус 19 кілаграмаў!), то падышлі ўдакладніць, ці праўда гэта я. А потым

**Калі хочаце мець вынік, трэба да яго планамерна ісці. Але не прымушаць сябе, ні ў якім выпадку! Тое, чым займаешся без задавальнення, не прынясе карысці, а толькі стрэс.**

вырашылі і самі паспрабаваць, і мы нейкі час хадзілі разам. Вельмі цікавы, карысны для абодвух бакоў вопыт атрымаўся — мы далучылі эспандары, давалі нагрузку на плечавы пояс, змянялі тэмп... Я рада абсалютна кожнаму навічку і не ўтойваю ніякіх сакрэтаў. Наадварот, заўжды тлумачу, што і дзеля чаго мы робім: навошта размінка,




замінка, тыя ці іншыя практыкаванні. А будзем мы потым хадзіць разам або людзям зручней займацца асобна, не істотна. Галоўнае, што яны будуць хадзіць і паляпшаць сваё здароўе.

### «ЛЫЖЫ ЗАБЫЛІСЯ ДОМА»

— Ці не самае частае пытанне, якое задаюць, сустракаючы на дарожцы: «Дзе вашы лыжы?» Мы нават нейкі час хадзілі ў майках з надпісам «Лыжы забыліся дома», — смяецца Ірына. — Але збольшага наваколныя ставяцца прыязна і зацікаўлена. Многія цікавяцца: а для чаго вам гэта?

На заняткі прыходзяць з рознымі мэтамі: адным трэба пахудзець, другім — замацаваць дасягнутыя дыетамі і гімнастыкай вынік. «Адна з маіх вучаніц у жніўні збіраецца ў водпуск і хоча важыць 74 кілаграмы, а ў яе 90. Прыйшла актыўна змагацца з вагой. Вынік ёсць: за месяц скінула 7 кілаграмаў». Старэйшаму пакаленню, асабліва жанчынам, якія засталіся ўдовамі, часта проста самотна, адчуваецца недахоп стасункаў. Некаторым не хапае матывацыі займацца самастойна, таму прыходзяць сем'ямі: з мужамі, дзецьмі, пляменнікамі, — а потым уцягваюцца.

Ірына падкрэслівае: пахудзець раз і назаўжды за некалькі прагулак з палачкамі немагчыма. «Калі вы хочаце заставацца падцягнутымі, маладымі, прыгожымі, здаровымі, гэта вялікая праца і перагляд усяго ладу жыцця: тут і правільнае харчаванне, і пітны рэжым, і сон, і заняткі фітнесам — абавязкова рэгулярныя».

Нават калі ў вас пэўныя праблемы са здароўем (скажам, адкладанні соляў у суставах) — гэта не нагода адмяніць фізічныя нагрузкі. Менавіта такім людзям, сцвярджае інструктар, скандынаўская хадзьба якраз паказана:

— У нас жа часта як адбываецца: «Ой, у мяне тут баліць, значыць, нічога рабіць нельга, лепш паляжу». А потым чалавеку ўсё горш і горш. Ды нават калі машыну на 5 гадоў паставіць у гараж, яна пасля такога прастою не завядзецца! Тое ж і з суставамі: яны прыдуманы прыродай дзеля таго, каб рухацца. Пры тым палкі дапамагаюць знізіць нагрузку на суставы, на пазваночнік і калені, прыкладна на 15-17% вага цела адчуваецца менш, паляпшаецца крывацёк, сілкаванне тканак — паволна, але ідзе аднаўленне.

Галоўны прынцып заняткаў, як, зрэшты, і любых іншых, — пастаянства. Калі хочаце мець вынік, трэба да яго планамерна ісці. Але не прымушаць сябе, ні ў якім выпадку! Тое, чым займаешся без задавальнення, не прынясе карысці, а толькі стрэс. Зрэшты, тыя, хто займаецца даўно, сцвярджаюць, што радасць ад спорту — справа звычкі. «Напачатку сам з сабой хітрыш, перад трэніроўкай знаходзіцца процьма неадкладных, тэрміновых спраў... Калі тыдзень, другі гэта перааадолееш, то арганізм ужо не супраціўляецца, а потым і настойліва вымагае заняткаў».

**— Ірына, а вы дасягнулі тых мэт, дзеля якіх пачалі хадзіць?**

— Перадусім — вагу скінула. Амаль пазбавілася сваіх праблем з пазваночнікам. Палепшылася агульнае самаадчуванне, нават стала маладзей выглядаць. Калі глядзішся ў люстэрка і разумееш, што хочацца сабой любавацца, — жанчыны мяне зразумеюць... Цяпер стаўлю новыя мэты. Напрыклад, нядаўна быў калектыўны заход з Серабранкі ў Ждановічы, па шагамеру атрымалася 29,6 км — крышачку не дацягнулі да 30. Прайшлі мы іх за 6 гадзін. Гэта была для мяне першая такая доўгая дыстанцыя. Стомленасць, безумоўна, адчувалася, але гэткая... камфортная. І пэўны гонар, што мы прайшлі своеасаблівую праверку сіл. Значыць, цалкам рэальна здзейсніць і наступную ідэю — заход на тры дні вакол возера Нарач. А што яшчэ вельмі важна — пачуццё задаволенасці, калі людзі пасля заняткаў гавораць словы падзякі, і ты бачыш, што ім рэальна робіцца лепш, то разумееш, што час і сілы былі не змарнаваны, а ўкладзены асэнсавана.

### 5 ПЫТАННЯЎ АД ПАЧАТКОЎЦАЎ

***— У чым карысць скандынаўскай хадзьбы?***

— Пачнём з таго, што скандынаўская хадзьба спальвае прыкладна на 50% больш калорый, чым звычайная, і трэніруе да 90% мышцаў цела. У працэсе заняткаў паляпшаецца пастава, стан плячэй і шыі, каардынацыя рухаў, умацоўваецца вынослівасць і агульны імунітэт. Хадзьба разрэджвае кроў, што змяншае рызыку развіцця трамбозаў і інфарктаў. Да таго ж гэты від фітнесу з'яўляецца прафілактыкай хвароб апорна-рухальнага апарату, бяссонніцы, дэпрэсіі, стрэсаў (бо расце ўзровень гармонаў радасці — эндарфінаў), упадку сіл. І што самае прыемнае — ён не вымагае спецыяльнай падрыхтоўкі.

***— Ці ёсць супрацьпаказанні?***

— Практычна няма. З асцярожнасцю падыходзіць да заняткаў трэба хіба толькі людзям з высокім артэрыяльным ціскам, хворым на дыябет, ВРЗ у вострым перыяд і тым, у каго ёсць сур'ёзныя праблемы з пазваночнікам. У гэтых выпадках лепш папярэдне параіцца з урачамі.

***— Ці падыходзяць для заняткаў звычайныя лыжныя палкі?***

— У прынцыпе, падыходзяць, пры адной умове: іх трэба крыху ўкараціць. Бо ў адрозненне ад бегу на лыжах, тут даўжыня кроку меншая, адпаведна, меншая і даўжыня палкі. Палкі для скандынаўскай хадзьбы падбіраюцца па формуле: рост чалавека, памножаны на 0,66 — калі мы гаворым пра навічкоў і тых, каму трэба проста падтрымліваць фізічную форму, або на 0,7 — для падрыхтаваных спартсменаў, якія хочуць павялічыць нагрузку. Неабходны элемент — пятля на руку, або цямляк — даволі шчыльна прылягае да рукі, распрацаваны такім чынам, каб палка не «збегла» і не звалілася з рукі. Дарэчы, у палачак для скандынаўскай хадзьбы (яны ёсць і беларускай вытворчасці) таксама ёсць вострыя наканечнік, прадугледжаны для хадзьбы зімой альбо па прасёлачных дарогах, але пры хадзьбе па асфальце, цвёрдым пакрыцці ён закрываецца спецыяльным, крыху скошаным «башмаком».

***— Колькі трэба праходзіць у дзень?***

— Гэта залежыць ад стану і жадання чалавека. Пачаткоўцам і тым, у каго істотныя праблемы са здароўем, пажадана займацца зусім няшмат, але часта — скажам, праз дзень па 20-30 хвілін. Тым, хто і жадае падтрымліваць форму, варта займацца 3 разы на тыдзень па 1—1,5 гадзіны. І не забывайцеся: чым большая нагрузка, тым больш часу патрэбна на аднаўленне. Калі вы адпрацавалі 2 гадзіны ў добрым тэмпе, з дадатковымі нагрузкамі, то мінімум на двое сутак зрабіце перапынак.

***— Аднаму займацца сумна дый няёмка. Дзе шукаць аднадумцаў?***

— Сёння інструктары і клубы аматараў скандынаўскай хадзьбы працуюць не толькі ў Мінску, але і ў Віцебску, Брэсце, Полацку, Баранавічах, Горках, Жлобіне. У вашым горадзе ці пасёлку іх няма? Значыць, ёсць шанц стаць першым і стварыць свой клуб!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## ДЛЯ ВЯЛІКІХ СЕМ'ЯЎ ПАТРАБУЮЦЦА... БАЦЬКІ

### У чатырох сталічных кватэрах ствараюцца дзіцячыя дамы сямейнага тыпу

**Сямейныя пары запрашаюцца на пасаду бацькоў-выхавальнікаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу ў сталіцы, а дакладней, у Фрунзенскім раёне, на Каменнай Горцы, дзе ў новабудоўлях адкрываюцца чатыры новыя дамы для выхавання дзяцей-сірот і тых, якія засталіся без бацькоўскай апекі.**

— Бацькі-выхавальнікі — гэта і прафесія, і адначасова лад жыцця для тых, хто гатовы даць дзецям шанс атрымаць сям'ю, дом, адчуванне бяспекі і веру ў будучыню, — кажа **дырэктар сацыяльна-педагагічнага цэнтра з прытулкам Кастрычніцкага раёна г. Мінска Алена КАРЦАВА.** — Падчас адбору кандыдатаў у бацькі-выхавальнікі перавага аддаецца поўным сем'ям. Ідэальны варыянт, калі такім бацькам ад 25 да 45 гадоў.

З бацькамі-выхавальнікамі дзіцячых дамоў сямейнага тыпу заключаюцца працоўныя дагаворы, на падставе чаго выплачваецца заработная плата. На адзін такі дзіцячы дом прызначаюцца 1,5 штатныя адзінкі, паколькі звычайна бацька як галава сям'і мае і іншае месца працы. У дзіцячых дамах сямейнага тыпу можа выхоўвацца ад 5 да 10 дзяцей, уключаючы сваіх уласных. Зразумела, што на такую вялікую сям'ю ў загарадных умовах прадугледжаны прыватны дом з прысядзібным участкам, а ва ўмовах горада гэта могуць быць дзве кватэры, размешчаныя ў адным тамбуры.

Паколькі пры выбары такіх сем'яў размова ідзе пра конкурсны адбор, то сацыяльна-педагагічны цэнтр з прытулкам Кастрычніцкага раёна аказвае садзейнічанне ў псіхалагічнай падрыхтоўцы кандыдатаў, якія не абавязкова павінны быць сталічнымі жыхарамі.

**БАЦЬКАМІ-ВЫХАВАЛЬНІКАМІ НЕ МОГУЦЬ БЫЦЬ:**

- ✓асобы, прызнаныя судом недзеяздольнымі ці абмежавана дзеяздольнымі;
- ✓асобы, у судовым парадку пазбаўленыя бацькоўскіх правоў ці абмежаваныя ў бацькоўскіх правах;
- ✓асобы, адхіленыя ад абавязкаў апекуна (папячыцеля) за неналежнае выкананне абавязкаў, ускладзеных на іх законам;
- ✓былыя ўсынавіцелі, калі ўсынаўленне адменена судом па іх віне;
- ✓асобы, якія па стане здароўя не могуць ажыццяўляць правы і абавязкі па выхаванні дзіцяці.

**P.S.** *Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па нумарах:*

*8 (017) 222 76 26, 222 82 37, 222 82 35.*

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ПРА ЧОРНА-БЕЛЫЯ КАРТКІ І СТРАКАТЫЯ ЛЁСЫ

Што насілі ў маладосці нашы бабулі, як апраналі дзяцей на святы, якія прычоскі лічыліся моднымі паўстагоддзя таму? Для таго, каб дазнацца пра гэта, зусім не абавязкова пераглядаць старыя кінастужкі або наведваць музеі. Часам дастаткова ўважліва пагартаць уласны сямейны альбом і звярнуць увагу на дэталі...

«Сапраўды, у нашых фотаальбомах, а іх у мяне каля дзясятка, захоўваецца гісторыя некалькіх пакаленняў нашай сям'і, нашай краіны, — адзначае ў сваім лісце **Галіна Пятроўская з вёскі Ардашы Смаргонскага раёна.** — Разглядваеш старыя фота, і шмат чаго прыходзіць на памяць.

Пачну з бабулі Ганулі і дзеда Якуба, якія жылі ў Заходняй Беларусі, на Гродзеншчыне. Нарадзілі і выхавалі чатырох дачок: Гандзю (яна на верхнім фота ў чорным касцюме), Зіну (у белай сукенцы), Вольгу (маю маці — яна на другім здымку, датаваным 1952-ім годам, у паласатай блузцы) і Ніну. На настаўніцу пачатковых класаў вывучылася толькі Зіна — астатнія дочкі былі калгасніцамі. Здаецца, быў у іх таксама сын, які рана памёр, але цяпер мне гэтага ніхто не пацвердзіць, не абвергнуць не можа, бо няма ўжо ў жывых ні бабулі Ганулі (яна на першым здымку ў сукенцы ў гарох), ні дзеда (ён памёр, калі я вучылася ў 4-м класе, фотаздымка яго не захавалася), ні маёй мамы і цётак...

Гісторыя жыцця кожнай з іх па-свойму цікавая і няпростая. Гандзя выйшла замуж рана, гадоў у 16. Я памятаю, як дзядзька Аляксей расказваў, што ён яе доўга "гадаваў", пакуль у іх з'явіліся дзеці — сын і дачка. Цётка Зіна ўсё жыццё, як я памятаю, мучылася са сваім мужам, які надта ўжо любіў хадзіць налева. Нажыла чацвёра дзяцей (2 хлопчыкі і 2 дзяўчынкі), ды не вытрымала: калі ўжо была на пенсіі, развялася. І, як часта бывае, новая маладая жонка хутка выгнала небараку, забрала яго дачка да сябе ў Гродна. Цётка Ніна пры мне ўжо выходзіла замуж. На другі дзень вяселля госці пабачылі маладых на печы, а на нагах у іх сядзелі чамусьці куры. А яшчэ дзіцячая памяць захавала з таго вяселля успаміны, як адфільтроўвалі самагонку, бо нейкі аболтус змяшаў яе з газай... Вельмі хутка цётка Ніна пакінула свайго мужа і пераехала з сяброўкай у далёкі Казахстан — асвойваць цаліну. Там выйшла замуж за казаха. Цяпер іх сям'я жыве недзе на Кубані, але сувязі ў мяне з імі няма, таму і не ведаю, ці жывая мая цётухна.





І, нарэшце, мае бацькі. Тата Валодзя — сірата, які сваіх бацькоў нават у вочы не бачыў. Дагледала яго радня, у якой было багата зямлі. (Нашмат пазней сваякі папрасілі татаву цётку, якая пераехала жыць у Канаду, даслаць здымак яго бацькоў. Тая даслала дзве карткі: на адной сядзіць на кані мужчына ў форме арміі Будзённага — зразумела, што бацька. А на другім дзве жанчыны: адна сядзіць на крэсле, другая стаіць, паклаўшы руку ёй на плячо. Каторая маці — невядома: цётка не здагадалася прыпіску зрабіць ці хоць нейк пазначыць.) Падчас вайны бацька працаваў на ўральскім заводзе. Якім ветрам яго, 17-гадовага хлопца, туды занесла, цяпер няма ў каго спытаць. Аднойчы спазніўся на 5 хвілін на завод, дык давялося адсядзець за парушэнне працоўнай дысцыпліны!.. Маці таксама 17-гадовай дзяўчынай немцы вывезлі ў Германію. Ведаючы, з якой агідай германцы ставіліся да хворых, яна ў дарозе басаног доўга прастаяла на снезе, каб захварэць. У выніку яе пакінулі падлячыцца, а ўсю астатнюю партыю захопленай моладзі павезлі далей — і ўвесь састаў разбамбілі самалёты саюзнікаў. У Германію мама трапіла пазней, працавала поруч з рускімі і ўкраінцамі ў баўэра. Там давялося паспытаць ліха, дый на зваротным шляху таксама: у Баранавічах, калі папрасілася ў хату пагрэцца, скралі чамадан з усёй вопраткай... Бацькі пабраліся шлюбам пасля вайны. Я нарадзілася ў 1948-м, адна ў іх. Успамінаю, як цяжка давялося бацьку будаваць хату, без братоў, без сваякоў-памочнікаў. Я ўжо ў 4-ы клас пайшла, як тая хата была дабудавана. Неўзабаве на той свет пайшоў дзед Якуб: дах крыў — прастыў, дый захварэў на запаленне лёгкіх. Тады, напэўна, слаба лячылі яго... Калі ў 76 гадоў памёр мой тата, маці я перавезла да сябе, яна на 7 гадоў перажыла бацьку...».

Пра сябе Галіна Уладзіміраўна расказала, што шмат гадоў працавала настаўніцай, мае значок «Выдатнік народнай асветы», а цяпер знаходзіцца на пенсіі. Выхавала 3 сыноў — дарэчы, усе яны атрымалі вышэйшую адукацыю.

❍ ❍ ❍

*Шаноўныя чытачы! Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры здымкі) дасылайце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а, або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны каштоўным прызам.*

***Увага!*** *Да ўдзелу ў конкурсе НЕ ПРЫМАЮЦЦА вясельныя фотасесіі, леташнія здымкі з курорта і сучасныя фота дзяцей. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.*

# Купанне з сэнсам:

## дзяўчынкам — жыта, хлопцам — дзівасіл

Залатыя правілы народнай культуры

Ва «ўжыўленні» немаўляці ў свет яго сям'і, роду ўсё тое, што адбывалася з дзіцем у першы раз, мадэлявала розныя аспекты яго будучага жыцця. Важным складнікам гэтых абрадаў было купанне.

Каб зразумець яго сімвалічнае значэнне, узгадаем традыцыйныя абрады, у якіх абмыванне мела рытуальны сэнс. Сярод іх, напрыклад, абавязковае абмыванне памерлых, а таксама абрад ачышчэння вадой, які праходзілі жаніх і нявеста напярэдадні вяселля. У кожным з іх закладзена адна і тая ж ідэя: «сціранне», або «змыванне» ранейшай інфармацыі і яе перанастройка ў сувязі з атрыманнем новага сацыяльнага статусу.

З моманту нараджэння да першых 40 дзён жыцця дзіця праходзіла тры падобныя этапы.

1 **Першае купанне** павінна «змыць» сляды ніядаўняга жыцця дзіцяці ва ўлонні маці. Наступным, даволі адказным абрадам было **рытуальнае купанне,** якое праходзіла на 9-ы дзень пасля нараджэння і задавала найважнейшыя аспекты будучага жыцця. Пазней атрымаў распаўсюджанне абрад хрышчэння немаўляці з поўным або частковым **акунаннем** у святую купель, галоўным сэнсам якога быў пачатак шляху спазнання і набліжэння да Бога.

2 Пры купанні **дзяўчынкі** ў ваду клалі 9 або 40 зярнятак жыта, каб яна вырасла здаровай і змагла нарадзіць дзіця, працягнуць свой род; сярэбраную або медную манету — прычым самую дробную, каб тым самым «звесці» да мінімуму працягласць і хваравітасць яе месячных; дадавалі некалькі кропель малака, каб твар дзяўчынкі быў белы і чысты; некалькі вугольчыкаў з печы, каб не паддавалася сурокам; выкарыстоўвалі таксама гаючыя зёлкі, сабраныя на Купалле (рамонкі, чабор, падтыннік).

3 **Пад ночвы** клалі грабеньчык, верацяно, іголку, лён, каб дзяўчынка стала добрай гаспадыняй.

4 Пры першым рытуальным купанні **хлопчыка** здзяйснялі прыкладна такія ж дзеянні, а ў ночвы клалі збожжа (з той жа мэтай працягу роду); маглі дадаць трохі мёду, каранёў дзівасілу, сярэбраную манету, каб хлопчык быў здаровым, прыгожым і багатым.

5 Таксама пры купанні хлопчыка ў ваду **апускалі заручальны пярсцёнак** бацькі. Мужчынскія заняткі збольшага праходзілі па-за прасторай хаты (земляробства, паляванне, рыбалка), таму вакол мужчыны ўжо ў пачатку жыццёвага шляху ўзводзілі магічнае кола, каб тое ахоўвала яго на працягу ўсяго жыцця.

6 **Пад ночвы** клалі сякеру, малаток, цвік і да т.п., каб закласці навыкі, неабходныя добраму гаспадару.

7 У больш позні час у некаторых рэгіёнах Беларусі пад ночвы клалі **кнігу** (часцей за ўсё Біблію), каб дзіця было разумным і стала адукаваным чалавекам. Меркавалася, што ў таго, хто навучыцца пісаць і лічыць, жыццё будзе лягчэйшым і багацейшым.

# 5 КНІГ для сямейнага чытання

<u>**Надзея КУРДЗЮК, дырэктар Маларыцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы:**</u>

**1. Уладзімір Ліпскі, «Залаты домік».** Казкі гэтага аўтара з'яўляюцца жывымі ўрокамі душэўнай дабрыні, любові да прыроды і да людзей. Яны напоўнены жыццёвым аптымізмам, тонкім гумарам, якія натхняюць жыць і няспынна адкрываць, удасканальваць сваё «Я».

**2. Валянціна Асеева, «Чароўнае слова», «Дзінка».** З моманту падзей, якія апісваюцца ў аповесцях, карэнным чынам змяніліся жыццё і людзі. Але нязменнымі засталіся вечныя каштоўнасці, пра якія пісала Валянціна Аляксандраўна: сяброўства, прыстойнасць, уменне прыйсці на выручку, пачуццё локця і, безумоўна, любоў.

**3. Аркадзь Гайдар, «Цімур і яго каманда».** Цудоўная, вельмі добрая аповесць, напісаная напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. І сёння гэтая кніга чытаецца з вялікім інтарэсам, таму што такія чалавечыя якасці, як дабрыня, уменне спачуваць, велікадушнасць застаюцца самымі каштоўнымі ва ўсе часы.

**4. Элеанор Портэр, «Поліанна».** Аповесць пра дзяўчынку, якую бацька навучыў радавацца, не зважаючы ні на што, — адна з лепшых кніг пра дзяцінства. Даказваючы сваю тэорыю, «тэорыю аптымізму», аўтар змяшчае маленькую гераіню ў абсалютна невыносныя ўмовы: з-за няшчаснага выпадку дзяўчынка, такая цікаўная і актыўная, перастае хадзіць... Але і ў гэтай, здавалася б, безвыходнай сітуацыі дзіця знаходзіць нагоду для радасці: «Я нарэшце зразумела, што мне ёсць чаму радавацца. Я магу быць рада, што ўсё ж хадзіла».

**5. Рыгор Остэр, «Шкодныя парады».** Дзіцячыя вершы паэта задорныя, поўныя добрага гумару і цеплыні. Магчыма, дзякуючы простай, зразумелай дзецям мове і персанажам, у якіх яны пазнаюць сябе, гэго вершы заўсёды ўспрымаюцца дзіцячай аўдыторыяй на «ўра». Остэр пакідае дзецям права самім разбірацца ў тым, што такое добра і дрэнна. І ў сваіх вершах робіць стаўку на выхаванні ад процілеглага.

# УСЕ СЫНЫ НА ФРОНЦЕ

## ГЕРАІНІ — МАЦІ ГЕРОЯЎ

*Шаноўныя чытачы! Нагадваем, сёлета, у межах святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, «Сямейная газета» збірае — з мэтай далейшай публікацыі — гісторыі пра сем'і, якія падчас Вялікай Айчыннай вайны страцілі на фронце траіх і больш дзяцей. Калі ў вас ёсць дакументальныя сведчанні, фотаздымкі або проста ўспаміны (занатаваныя ці не) па гэтай тэме, дасылайце іх, калі ласка, на адрас рэдакцыі. На падставе гэтых публікацый, калі іх назбіраецца дастатковая колькасць, у будучыні пры ўдзеле журналістаў і пісьменнікаў Выдавецкі дом «Звязда» плануе выданне асобнай кнігі.*

**Будзем удзячны ўсім за водгукі!**

На заклік рэдакцыі адгукнуўся вядомы **беларускі ваенны гісторык, кандыдат гістарычных навук Барыс Далгатовіч.** «Я назаву толькі некалькі беларускіх сем'яў, у якіх на фронт або ў партызаны пайшлі пяць і больш дзяцей, — напісаў ён у лісце. — Сярод іх, напрыклад, сям'я Настассі Купрыянавай з Жодзіна — 5 яе сыноў сышлі на фронт, а адзін з іх, Пётр, стаў Героем Савецкага Саюза. На фронце былі і 5 братоў у сям'і Супіталевых з вёскі Сурвы Бялыніцкага раёна. У сям'і Паўла Васільевіча Гузка з вёскі Забалацце Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці было 8 дзяцей: 5 сыноў і тры дачкі. Сыны Уладзімір, Васіль, Рыгор і Сцяпан ваявалі падчас Вялікай Айчыннай на розных франтах; трое з іх дадому не вярнуліся.

У многіх выпадках на фронт ішлі шасцёра і больш дзяцей, як, напрыклад, у сям'і Мікалая Лісікава з горада Чэрыкаў (6 сыноў былі на фронце), сям'і Тэадоры Храбрай з пасёлка Бялынічы (6 сыноў), сям'і П.І. Платокава з Касцюковіцкага раёна (6 сыноў, усе ваявалі, 4 — Андрэй, Мікалай, Віктар і Фёдар — загінулі), сям'і Грыгор'ева з вёскі Зайцава Слабада Магілёўскага раёна (6 сыноў служылі ў танкавых войсках), сям'і быхаўскага калгасніка Акіма Красоўскага (6 сыноў біліся на розных франтах; адзін з іх, Сцяпан, стаў маршалам авіяцыі, Героем Савецкага Саюза). З 6 братоў Чыбірай са Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці 5 загінулі на розных франтах; старэйшы з усіх, Пётр — у савецка-фінскую вайну. 6 братоў у сям'і Гусакоўскіх з Магілёўшчыны былі афіцэрамі на франтах Вялікай Айчыннай; Іосіф Гусакоўскі стаў двойчы Героем Савецкага Саюза, генералам арміі, удзельнічаў у Курскай бітве, абароне Масквы, Берлінскай аперацыі.



**Гэта скульптура, усталяваная ў расійскім горадзе Задонску (Ліпецкая вобласць) — помнік маці Марыі Фраловай, якая страціла на фронце 8 сыноў...**

А часта на фронт ці ў партызаны ішлі цэлымі сем'ямі. Так, у сям'і Гурскіх з вёскі Сітнік Уздзенскага раёна Мінскай вобласці сыны Антон, Аляксандр, Уладзімір і Канстанцін пайшлі на фронт, а браты Мікалай, Анатоль і сястра Саша далучыліся да партызанскага руху; бацькі ж іх былі партызанскімі сувязнымі. З 8 сыноў сям'і Аксяневічаў з в. Застарынне Стаўбцоўскага раёна аддалі жыццё за вызваленне Радзімы сямёра; трое з іх служылі ў адным танкавым экіпажы Т-34. У сям'і Дзям'яна Андрэевіча Рабчынскага з горада Ельска ваявалі ў партызанах бацька, тры сыны і тры дочкі. У сям'і Пятра Андрэевіча Свечнікава з Клімавіцкага раёна было 5 сыноў і 3 дачкі, прычым чацвёра братоў ваявалі на фронце, а астатнія дзеці былі ў партызанскіх атрадах...» І гэта, відаць, толькі кароткі пералік...



**Адказная за выпуск Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**



Абласны конкурс кветкаводаў.

## *Толькі ў пачатку шляху*

**ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ!**

*Сёлета нашаму прадпрыемству спаўняецца ажно 70 гадоў. Ці, лепш сказаць, калектыву, бо ўсё змяняецца, а калектыў застаецца. Я вельмі рад, што ён у нас склаўся такі дружны і шчыры. Шмат зроблена за сем дзесяцігоддзяў, але мы яшчэ толькі ў пачатку шляху. Мне вельмі хочацца, каб статус работніка жыллёва-камунальнай гаспадаркі быў самым высокім і годным, каб людзям было за шчасце тут працаваць. І я ўпэўнены, што мы дасягнем гэтага сваёй працай. Нам важны ўклад кожнага — дворніка, сантэхніка, кіроўцы, майстра... Мы вельмі ўдзячны вам усім.*

*У гэты святочны час хочацца падзякаваць таксама кіраўніку нашага раёна Аляксандру Астроўскаму за штодзённую падтрымку, за разуменне праблем.*

*Вы добра ведаеце, што мы стараемся знайсці лепшых, заўважыць іх. І прымаем на працу толькі лепшых. Я ганаруся тым, што на нашым прадпрыемстве ёсць дынастыі. Дзеці работнікаў прыходзяць і кажуць, што хочуць працаваць у нас. Гэта значыць, што яны давяраюць нам. Гэты давер і з'яўляецца вытокам моцнага калектыву.*

*Дзякую ўсім за шчырую працу і віншую з чарговым юбілеем нашай жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Зычу вам шчасця і дабрабыту!*

***Сяргей САЎКО, дырэктар Лідскага ГУП ЖКГ.***

# Яны наводзяць парадак на планеце

### ГІСТОРЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВА

*Датай станаўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Ліды лічыцца 20 ліпеня 1944 года, калі быў створаны камунальны аддзел. Горад толькі нядаўна быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і трэба было наводзіць чысціню, наладжваць быт. З гэтым справіліся на «выдатна» і працягвалі тое самае рабіць далей. Што казаць, калі Лідская ЖКГ нават атрымлівала сцяг ВДНГ.*

*Цяпер прадпрыемства мае 16 структурных падраздзяленняў у Лідзе і Лідскім раёне: гасцініца «Ліда», вытворчасць водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі, дарожна-эксплуатацыйная вытворчасць, вытворчасць камунальных кацельняў і цеплавых сетак, вытворчае падраздзяленне зялёнай гаспадаркі, служба грамадзянскага абслугоўвання «Рытуал-Сэрвіс», жыллёвая рамонтна-эксплуатацыйная вытворчасць, аддзел па капітальным рамонце жылога фонду, разлікова-даведачны цэнтр Лідскага ГУП ЖКГ, рамонтна-будаўнічая вытворчасць, служба лазневага абслугоўвання насельніцтва, служба вонкавага электраасвятлення, служба па абслугоўванні энергетычнага абсталявання, служба па наладцы прыбораў уліку і размеркаванні цеплавой энергіі, служба па эксплуатацыі цеплавых сетак і цэнтральных цеплавых пунктаў, аварыйная служба.*

*Таксама ёсць музей, дзе можна даведацца пра гісторыю стварэння прадпрыемства і паважаных людзей, якія працавалі ў структуры ЖКГ на працягу 70 гадоў.*



Валерый ГОЙДЗЬ, слесар ЦЦП службы па эксплуатацыі цеплавых сетак і ЦЦП (узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі»).

**Зразумела, што Антуан дэ Сэнт-Экзюперы ў сваёй геніяльнай казачнай аповесці «Маленькі прынц», гаворачы аб парадку на планеце, меў на ўвазе ў першую чаргу парадак унутры кожнага чалавека. Аднак дасканаласць людзей пачынаецца менавіта з даведзенага да ладу наваколля. Бо гэта вучыць любові да прыгажосці і захаванню яе.**

Хто лічыць, што няма ў нас такіх «маленькіх прынцаў», якія, устаўшы раніцай, прыводзяць у парадак сябе, а пасля ідуць наводзіць парадак на планеце, той вельмі памыляецца. Гэтых людзей шмат. І менавіта такія людзі з'яўляюцца работнікамі Лідскага гарадскога ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Іх штодзённая праца робіць шыкоўны горад Гродзенскай вобласці яшчэ прыгажэйшым і больш утульным. Яны — гаспадары зямлі, на якой жывуць, і таму з задавальненнем сумленна даглядаюць кожны свой кавалачак агульнай планеты.

Вячаслаў ЖАЛНЕРЧЫК, рабочы дарожна-эксплуатацыйнай вытворчасці, Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі.





Марыя БУЙКО, рабочая па комплексным прыбіранні і ўтрыманню домаўладанняў жыллёва-эксплуатацыйнай службы №1.



Іван МЕЛЕВІЧ, трактарыст вытворчага падраздзялення зялёнай гаспадаркі (узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі»).

І робяць гэта, між іншым, вельмі якасна. У сярэдзіне мая па выніках рэспубліканскага агляду санітарнага стану і добраўпарадкавання населеных пунктаў Беларусі за 2013 год Ліда была названа пераможцам сярод гарадоў сваёй катэгорыі (з насельніцтвам больш за 50 тысяч чалавек). Міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй Шорац і начальнік упраўлення аналізу і прагнозу развіцця галін народнай гаспадаркі пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Віктар Кандратаў наведалі Ліду і асабіста ўручылі кіраўніку раёна Аляксандру Астроўскаму пасведчанне аб прысваенні гораду статусу пераможцы агляду, а таксама пераходны вымпел, які ўжо трэці раз аказаўся ў Лідзе. А значыць, у раёне клапоцяцца пра тое, каб ён быў больш чыстым і прыгожым. Відавочна, што ў горадзе праводзіцца сістэмная работа ў гэтай сферы. І гэта ўжо вынік якаснай працы кіраўніцтва раёна, якое вельмі дапамагае ў вырашэнні шматлікіх праблем, паказваючы бацькоўскі клопат. Ніколі не адмовіць абласное ўпраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Шмат было зроблена дзякуючы асабістым намаганням былога кіраўніка ўпраўлення Сяргея Неўмяржыцкага.

Але вернемся да работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, бо ў любым выпадку ўсе дасягненні сталі магчымымі толькі з дапамогай рук кожнага з іх. Гэтых рук безліч, і ўсе яны прафесійна выконваюць сваю працу. Узровень дапамагае падтрымліваць спецыяльны конкурс «Лепшы па прафесіі», вынікі якога падводзяцца штогадова перад Днём камунальніка. Лепшы майстар, лепшы сантэхнік, лепшы дворнік... Зразумела, што ўсе яны лепшыя, бо, каб патрапіць на працу ў Лідскую ЖКГ, усе работнікі праходзяць самы жорсткі адбор, але ж лёгкая канкурэнцыя ўнутры калектыву ідзе на карысць. Чалавек заўсёды адчувае, што ён патрэбны. А таму і кадравага голаду на прадпрыемстве няма. Наадварот, вельмі многія імкнуцца патрапіць на працу сюды. Але трапляюць сапраўды лепшыя. Вы ведаеце, у некаторых работнікаў ёсць нават дзяржаўныя ўзнагароды. Сёлета адзначылі медалём «За працоўныя заслугі» траіх з калектыву прадпрыемства — слесара па абслугоўванні цеплавых сетак вытворчасці камунальных кацельняў і цеплавых сетак Валерыя Гойдзя, слесара-сантэхніка жыллёва-эксплуатацыйнай службы №3 Роберта Карымава, слесара-рамонтніка вытворчасці водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі Леаніда Мацiеўскага.

З моцных і добрых людзей — такі ж самы і калектыў. Усе згуртаваны ў адну каманду гонарам за сваю прафесію, адказнай працай і ўзаемапавагай сярод калег. Гэтыя людзі разам не толькі ў працы, але і ў адпачынку. Яны імкнуцца трымаць на ўзроўні не толькі прафесійныя, але і спартыўныя дасягненні. Адно тое, што Лідская ЖКГ ужо больш за 15 разоў займала ў абласной галіновай спартакіядзе першае месца, шмат аб чым гаворыць. І такія вынікі невыпадковыя. Бо работнікі маюць магчымасць і (самае галоўнае!) жаданне пастаянна трэніравацца. Прадпрыемства разам з прафсаюзам арандуюць неабходныя спартыўныя залы — для валейбола, футбола. Ёсць свае трэнажорная і тэнісная залы. А калі да «Дажынак» у Лідзе пабудавалі Лядовы палац, на прадпрыемстве ўтварылася аматарская хакейная каманда. Людзі нават не лянуюцца прыязджаць у 5 гадзін раніцы на трэніроўкі, бо іншага вольнага часу на арэне няма. Прымусіць да такога вельмі цяжка — людзі самі цягнуцца. Пры гэтым у некаторых відах спорту створана па дзве каманды — мужчынская і жаночая. Напрыклад, у валейболе. Ёсць і тыя, хто займаецца гіравым спортам, лёгкай атлетыкай. Умовы створаны для ўсіх ахвотных. Прафсаюз нават аплачвае палову абанемента ў басейн ці на аэробіку.

А па шашках, шахматах, тэнісе, більярдзе, боўлінгу штогод праводзіцца ўнутраная спартакіяда. За перамогу падраздзяленне атрымлівае сапраўдныя прызы. Можна выбраць альбо спартыўнае абсталяванне, альбо новую мэблю, альбо спецыяльнае адзенне больш высокай якасці. У людзей ёсць стымул удзельнічаць і перамагаць. І яны перамагаюць — у спорце, жыцці і працы.



Пасля ўручэння пераходнага вымпела пераможцы рэспубліканскага агляду санітарнага стану і добраўпарадкавання населеных пунктаў Беларусі за 2013 год.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**
**Здымкі з архіва прадпрыемства.**

УНП 100153376

■ Сустрэча з пісьменнікам

# СТРАХ — НЕ ТОЛЬКІ Ў ЗАБОЙСТВАХ І ЗДРАДАХ

## У ЗЛОБЫ НЯМА МЕЖАЎ. АЛЕ ТОЛЬКІ ТАДЫ, КАЛІ Ў ЧАЛАВЕКА НЯМА КАРАНЁЎ, НЯМА СУМЛЕННЯ, НЯМА САПРАЎДНАГА ЛЮДСКОГА ПАДМУРКА

**Валерый КАЗАКОЎ — член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Жыве і працуе ў Маскве. Узначальвае Федэральную нацыянальна-культурную аўтаномію «Беларусы Расіі». Піша прозу, займаецца паэзіяй. Кандыдат сацыялагічных навук. Кнігі выдае ў Мінску і Маскве. Нядаўна ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Журналіст «Звязды» сустрэўся з земляком у Маскве і задаў пытанні, якія звязаны з мастацкімі інтарэсамі Валерыя Мікалаевіча. Але так атрымалася, што размова пайшла ўвогуле пра жыццё.**



**— Валерый Мікалаевіч, у вас ёсць такі раман — «Цень гобліна». Дык што ж гэта такое — «эпоха габлінізацыі»?**

— З аднаго боку, гэта тое ж самае, што і перамога камунізму ва ўсім свеце… Звычайная падманка, якая дае магчымасць нейкай меншасці зручней латошыць кішэні безумоўнай большасці. Нашы з вамі кішэні. А з іншага боку — гэта даволі складаная дэградацыя чалавечай істоты, адвечнай сутнасці чалавека, яго душы. «Гоблін» — гэта нейкі сімвал разбэшчанасці нашага часу, вобраз істоты ў людскім абліччы, якой усё дазволена ў гэтым свеце. І гэты нячысцік жыве не ў казках і містычных трылерах, а зусім побач з намі. Ён ходзіць на працу, абдымае кабету, выкладае нейкія, часам зусім не зразумелыя, навукі… Нават можа кіраваць чым заўгодна. Але ён не зусім чалавек, бо пад скурай і нятаннымі строямі няма нічога людскага, там толькі адно — прага да багацця і задавальненне самалюбства. «Габлінізацыя» ў нейкім сэнсе сугучная глабалізацыі, якую нам і навязваюць ужо не першае дзесяцігоддзе сапраўдныя гобліны. І дзіўныя адбываюцца рэчы: масточылі амаль стагоддзе Савецкі Саюз і калгасы, а цяпер тых барацьбітоў ужо і не відаць. Яны ўжо самі ў вялікім «калгасе» Еўрасаюза, дзе ўсё настолькі агульнае, што неяк і няёмка робіцца. Сёння гэтыя «еўракалгаснікі» аж пенай пырскаюць у падтрымку нейкай талерантнасці. І нашы габляняткі ім падскугольваюць: цярпімасць, цярпімасць! Толькі неяк другое чуецца: «Цярпі, Ясь, цярпі, Іванка!». А ці трэба нам цярпець усю іх гідоту? А галоўнае: які з гэтага сэнс? Можа быць, трэба трохі паварушыць мазгамі і ўспомніць: гэта якраз талерантнасць дала магчымасць спаліць мільёны людзей у Першай і Другой сусветных войнах, гэта якраз хаваючыся за талерантнасць, тыя гобліны прывялі да ўлады Гітлера і Сталіна. Гэта ўсё тая ж прага цярпець, дабіваючы традыцыйную сям'ю і мараль. Толькі чамусьці цярпець павінны тыя, каму загадалі. Сёння загадаюць нам?.. Надта неяк аднабока адбываецца. Двайныя стандарты выяўляюць усё сваё нутро…

**— На пачатку аднаго з вашых раманаў чытач адразу бачыць такую будучыню: «У лясах лютуюць ліхія людзі, а ў гарадах — не менш ліхія чыноўнікі…» Зло выцісне дабрыню, спагаду, цеплыню чалавечых зносін?**

— Ад таго і лютуюць, што мы самі далі ім такую магчымасць. Мы да іх як да людзей, а яны ўжо даўно гобліны. Мы неяк усе разам разгубіліся і стаім, здзіўлена назіраючы, як ліхвярыстыя людцы расцягваюць супольную маёмасць. Мы дзівімся, а яны пхаюць сабе ў кішэні, у торбы, у банкі — і за мяжу. Там жа сёння, лічаць яны, калгас! Дзе, хто, каго і як спыніць… У такім калгасным гармідары, маўляў, нешта дакладна і палічыць немагчыма. Я, у большасці, не паважаю сучасных багацеяў, яны надзвычай шэрыя і нецікавыя людзі. Вы калі-небудзь зазіралі ў іх маёнткі?

**— Не, не той сацыяльны статус…**

— Вось там — музеі! Што таннейшае з каштоўнасцяў — тут, дома, а галоўнае — па замежных вілах. Я жыву ў цэнтры Масквы. І часта хаджу на працу пехатой. Цудоўнае старасвецкае дойлідства запаскудзілі шыльдамі скрозь адных банкаў і гандлёвых кампаній! Уся іх дапамога Расіі, Айчыне сваёй,— даць якую капейку таму-сяму на выбары на ўсялякі выпадак, і ўсё. За дваццаць з лішнім гадоў што яны зрабілі для сваіх постсавецкіх краін і для тых, хто сёння на іх гарбаціцца? Можа быць, стварылі якія музеі, а можа, хтосьці пабудаваў за свой уласны кошт дзіцячы садок, дом, школу ці той жа Лядовы палац? Я не ведаю, можа быць, хтосьці з вас і чуў пра такое? Ужо цяпер паміж імі і намі бездань! Сумна, але жыццё ўсё паставіць на свае месцы. Дабро неўміручае, калі ты сам не адкрыеш сваю душу гобліну. На тым і стаім!

**— Вы на свае вочы пабачылі тое, што рабілася ў Афганістане, прымалі ўдзел у антытэрарыстычнай аперацыі ў Чачні… Ёсць межы ў чалавечай злобы, агрэсіі?**

— Павінен заўважыць, што я не лічу сябе «афганцам». Камандзіроўкі журналіста — гэта адно, вайна па-сапраўднаму — зусім іншае. Па-другое, я не браў удзел у вайне на Каўказе. Так, быў, шмат што бачыў і там і там, але зброі ў руках не трымаў. Я згодны з самой пастаноўкай пытання: у людскога бязлюддзя няма мяжы. Звер спіць у кожным з нас. І складваюцца такія абставіны, што ён раптоўна прачынаецца. І суняць тады гэтую нечалавечую істоту немагчыма, на крайні выпадак — даволі цяжка.

> **«Габлінізацыя» ў нейкім сэнсе сугучная глабалізацыі, якую нам і навязваюць ужо не першае дзесяцігоддзе сапраўдныя гобліны.**

Я цяпер пішу кнігу пра цяжкі лёс людзей, якія былі знявечаны Другой сусветнай вайной. Сустракаюся з жывымі сведкамі. Корпаюся ў архівах. Божа мой, Божа, што мы, людзі, рабілі самі на сваёй зямлі… Як здзекаваліся адзін з аднаго, як катавалі, трушчылі, нішчылі самі сябе!.. Страх — не толькі ў забойствах і здрадах, страх — у тым, што і адны, і другія ўдзельнікі страшэннай, жахлівай бойкі былі перакананы ў сваёй слушнасці. Так, у злобы няма межаў, але ж гэта толькі ў тым выпадку, калі ў чалавека няма каранёў, няма сумлення, няма сапраўднага людскога падмурка, які складаецца з ведаў, традыцый, кахання, сям'і.

**— Васіль Быкаў хаця і пісаў заўжды пра вайну, на самой справе даследаваў унутраны канфлікт чалавека, часцей звяртаў увагу на слабыя бакі ў паводзінах самай разумнай істоты на Зямлі. Вы сваім мастацкім досведам сцвярджаеце сілу чалавека? Ці ўсё ж лічыце, што паводзінамі кіруюць слабыя бакі характараў і ў цэлым слабыя бакі жыццядзейнасці?**

— Васіль Уладзіміравіч — чалавек ад Бога! Ён як быццам выпадкова трапіў да нас на Зямлю. Трапіў, вобразна намаляваў словам, якія мы ёсць насамрэч, пакінуў нам гэтыя малюнкі, а сам кудысьці адышоў на хвілінку. На Беларусі шмат было талентаў і не менш яшчэ будзе. Але такі, як Быкаў, за ўвесь час быў толькі адзін. І невядома, ці прыйдзе яшчэ пісьменнік такога маштабу ў гісторыі нашай Айчыны. Так, як пісаў Быкаў, ніхто не напіша. У яго часам і вайна нейкая шэранькая, адзін «дождж», без баталій і ўра-атак, без прыгожых момантаў і прыгожых подзвігаў, якія, вядома ж, былі. Але якія волаты ў яго прозе жывуць, змагаюцца, кахаюць, гінуць… Гінуць, каб перамагло жыццё.

Што датычыцца маіх сціплых пісанняў. Спрабую пісаць тое, што бачыў, чуў, што на сэрцы тоіцца, што не дае спакою. Апошнім часам нават сам сабе здзіўляюся: у кніжках неяк нязручна хлусіць, у жыцці там-сям браханеш, не заўсёды праўду скажаш, а на старонках не атрымліваецца. Там пэўная чысціня кіруе. Яна — гаспадыня галоўная…

Мне крытыкі ляпяць розныя мянушкі: «песіміст», «не мае веры ў перамогу над…». А калі такі цяпер час? І якую чалавек павінен мець веру, калі яго самога за чалавека не лічаць? Ён жа так налаўчыўся адно толькі да працы, гарэлкі і тэлевізара! Нягледзячы на ўсё сучаснае паскудства, я ўпэўнены, што сонечных людзей на свеце больш і мы пераможам!

**— Вы рэалістычны літаратар у сваіх мастацкіх пошуках? Ці рэалізм як мастацкі метад чужы для вас шлях?**

— Уявіце сабе, што Гогаль альбо Дастаеўскі ці Чэхаў пайшлі сёння ў тэатр на пастаноўку свайго твора якімсьці «...юком»!.. А я толькі і ўяўляю, як пасля першага акта яны нема равуць, крычаць ад болю фізічнага і мастацкага. Крычаць: «Я гэтага не пісаў!..» А следам іх забірае «хуткая дапамога»… Навокал — так званы «сюр»… Таму я і рэаліст да мозга касцей!.. З журналісцкай памяці трымаецца ўва мне такі выпадак. Калісьці я патрапіў на выставу хворых на галаву небарак, якая праходзіла ў шпіталі Скліфасоўскага. Таленавітымі і вельмі цікавымі падаліся мне малюнкі, якія прадстаўляліся побач з тлумачэннем дыягназу пацыентаў-мастакоў. Да гэтага часу шкадую, што не меў тады фотакамеры… Дык вось, калі я сёння выпадкова трапляю на сучасныя выстаўкі модных «творцаў», то скрозь у вочы кідаюцца рэчы, вельмі падобныя на малюнкі душэўна хворых мастакоў са шпіталя Скліфасоўскага. Толькі чамусьці арганізатары выставак забываюць указаць дыягназ.

**— Валерый Мікалаевіч, неяк не пасучаснаму падыходзім да шматаблічнага мастацтва…**

— Не хачу нават патакаць вам у магчымых развагах пра свабоду творчасці і іншыя парадыгмы волевыяўлення, светапогляду… Адно скажу: не, я ніякі не цемрашал. Я і Далі люблю. Але не за тое, што яго жонка была са славянскага свету, а за незвычайны рэалізм…

**— Ёсць пытанне адносна рэалізму ў Далі…**

— Пачуйце маё перакананне: увесь «не рэалізм», калі размова пра сапраўднае мастацтва, жыве толькі ў рэальным наваколлі, жыве ў рэалістычным свеце.

**— Дазвольце яшчэ раз працытаваць пісьменніка Валерыя Казакова: «Я не ведаю, якой акажацца будучыня паміж нашымі дзяржавамі. Я ведаю, якая будучыня ў стасунках нашых народаў — у прыватнасці, беларускага, украінскага і рускага. Яна будзе добрай. Як бы хто ні стараўся сапсаваць гэтыя адносіны». І сёння вы падпішацеся пад гэтымі словамі, азіраючыся на Украіну?**

— Гадоў сем таму я ў адным з інтэрв'ю казаў і такое: мне не страшная вайна Расіі са Штатамі, такая наўрад ці будзе. А вось вайны паміж Украінай і Расіяй я баюся, бо гэта будзе страшэнная бойка! Хвала Богу, што я пакуль памыліўся, але ж украінцы страляюць ва ўкраінцаў! Дзікунства! І свет маўчыць, бо гобліны забаранілі! А бомбы і міны рвуць на кавалкі добрых і злых, дзяцей і пажылых, а таксама розных па «колеры» перакананняў… Трэба быць людаедам, каб не разумець, да чаго гэта прыводзіць…

На вайне ёсць яшчэ эфект натоўпу. Ты бяжыш туды, куды ўсе бягуць. І робіш тое, што робіць грамада, якая цябе акружае, большасць. У натоўпу няма твару. Ніякі сведка яго не апазнае. Але як толькі ў разбураныя вайной мясціны прыходзіць цішыня, боль застаецца матулям і ўдовам. Праз год-другі сціхне крыўда, а яшчэ праз год сябрам стане вораг учарашні. І дзеці пабяруцца шлюбам. Паціху ўсё ўладкуецца. Не людзі ваюць, іх да гэтага прымушаюць…

**— Дык будзем верыць, што галоўныя прыярытэты — за цішынёй, спакоем і мірным развіццём жыцця?..**

— Без веры ў гэта нельга. Асабліва — мастаку слова, пісьменніку, які імкнецца зрабіць чалавека лепшым.

**Гутарыў Павел АЛЬСОВЫ.**

North European Bank
Норд Европеан Банк

**Закрытое акционерное общество «Норд Европеан Банк» ЗАО «Н.Е.Б. Банк»**

220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, 51, пом. 1
тел./факс +37517 306 06 90
www.nebbank.by

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 г.**

Наименование банка: ЗАО «Н.Е.Б Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2014 | 01.07.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 409 | 1 651 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 576 | 919 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 20 555 | 46 464 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 43 818 | 35 390 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 80 025 | 60 528 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 17 788 | 14 976 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 582 | 1 145 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 164 753 | 161 073 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | 61 615 | 69 330 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 409 | 7 025 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 4 967 | 698 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 66 991 | 77 053 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 46 710 | 46 710 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 13 861 | 5 734 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 13 260 | 10 338 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 23 931 | 21 238 |
| 30 | ВСЕГО капитал | 121 | 97 762 | 84 020 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 164 753 | 161 073 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2014 г.**

Наименование банка: ЗАО «Н.Е.Б Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2014 | 01.07.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 7 726 | 5 533 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 1 622 | 1 027 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 6 104 | 4 506 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 82 | 78 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 245 | 332 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | (163) | (254) |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 6 251 | 1 355 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (24 177) | (22 361) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 63 | 50 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 7 409 | 6 562 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 2 | 1 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 29 021 | 21 455 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 5 090 | 217 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 23 931 | 21 238 |

**Председатель Правления** **В.В. Гарькавый**

**Главный бухгалтер** **Л.И. Кислюк**

**Дата подписания: 15 июля 2014 года**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 32 от 06.05.2013. УНП 807000227

## Минский районный исполнительный комитет 1 августа 2014 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Инженерная инфраструктура * | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Колодищанский с/с, аг. Колодищи, квартал 7131, участок № 4 | 623683403101007616 | 0,1646 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 741 000 | 308 000 000 | 61 600 000 |
| 2 | Крупицкий с/с, д. Самуэлево, участок № 16 | 623683908601000079 | 0,1506 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 84 000 | 82 000 000 | 16 400 000 |
| 3 | Михановичский с/с, аг. Михановичи | 623684204601001426 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 8 000 000 | 150 000 000 | 30 000 000 |
| 4 | Новодворский с/с, д. Большой Тростенец | 623684301101001027 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 5 322 950 | 360 000 000 | 72 000 000 |
| 5 | Новодворский с/с, д. Большой Тростенец | 623684301101001028 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 5 322 950 | 360 000 000 | 72 000 000 |
| 6 | Самохваловичский с/с, д. Мариполь, участок № 6 | 623686302601000030 | 0,1243 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 7 812 530 | 60 000 000 | 12 000 000 |
| 7 | Хатежинский с/с, д. Ореховская | 623687505101000052 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 6 887 773 | 80 000 000 | 16 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **01.08.2014 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **28.07.2014 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204-11-62.

Задаток за участие в аукционе на лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3641900000020 Колодищанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052304, код платежа – 04901.

На лот 2 перечисляется на расчетный счет № 3641900000091 Крупицкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На лот 3 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 Михановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На лоты 4-5 перечисляется на расчетный счет № 3641900000176 Новодворского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600230217, код платежа – 04901.

На лот 6 перечисляется на расчетный счет № 3641900000088 Самохваловичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424, код платежа – 04901.

На лот 7 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 Хатежинского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
3. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.
4. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

4.1. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион в отношении каждого земельного участка признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано только одним участником аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов); для участия в аукционе не было подано ни одного заявления; на аукцион явился один из участников или ни один из участников не явился на аукцион.

Аукцион в отношении каждого земельного участка признается нерезультативным в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона не предложил свою цену.

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

Результаты аукциона аннулируются, если победитель аукциона в установленный срок: не внес плату за земельный участок; не возместил затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не выполнил условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, а также иные условия участия в аукционе. При этом внесенный победителем аукциона задаток возврату не подлежит.

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.*

## Минский районный исполнительный комитет 15 августа 2014 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Инженерная инфраструктура * | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Боровлянский с/с, д. Скураты, участок № 5 | 623680607601000046 | 0,1437 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 3 187 600 | 185 000 000 | 37 000 000 |
| 2 | Горанский с/с, аг. Чачково, участок № 14 | 623681319101000511 | 0,1200 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 4 596 974 | 73 000 000 | 14 600 000 |
| 3 | Ждановичский с/с, д. Ляховщина, участок № 4 | 623681706601000188 | 0,1258 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 7 484 000 | 119 000 000 | 23 800 000 |
| 4 | г. Заславль, ул. Центральная, 29А | 623650100001004822 | 0,0902 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ, водопровод | 7 815 395 | 133 000 000 | 26 600 000 |
| 5 | Колодищанский с/с, аг. Колодищи, квартал 780, участок № 26 | 623683403101006258 | 0,1519 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 741 000 | 124 000 000 | 24 800 000 |
| 6 | Луговослободской с/с, д. Обчак | 623684109101000707 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 5 957 332 | 70 000 000 | 14 000 000 |
| 7 | Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, участок № 48 | 623684206601000218 | 0,1541 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 465 000 | 71 000 000 | 14 200 000 |
| 8 | Папернянский с/с, д. Селюты, участок № 6 | 623685509601000035 | 0,0939 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 5 785 234 | 250 000 000 | 50 000 000 |
| 9 | Папернянский с/с, д. Чучаны, участок № 7 | 623685513101000102 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 4 709 100 | 300 000 000 | 60 000 000 |
| 10 | Петришковский с/с, д. Щёки | 623685710101000028 | 0,1598 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, водопровод | 450 000 | 80 000 000 | 16 000 000 |
| 11 | Самохваловичский с/с, д. Валицковщина, участок № 2 | 623686301101000098 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 6 642 080 | 95 000 000 | 19 000 000 |
| 12 | Хатежинский с/с, д. Рыжики, участок № 5 | 623687506601000033 | 0,1391 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 5 321 310 | 130 000 000 | 26 000 000 |
| 13 | Хатежинский с/с, д. Старое Село, участок № 84 | 623687507101000504 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 1 275 000 | 150 000 000 | 30 000 000 |
| 14 | Щомыслицкий с/с, д. Заболотье, участок № 2 | 623688000001000837 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 8 652 623 | 206 000 000 | 41 200 000 |
| 15 | Юзуфовский с/с, д. Абрицкая Слобода | 623688200101000041 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 6 812 000 | 36 000 000 | 7 200 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **15.08.2014 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **11.08.2014 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204-11-62.

Задаток за участие в аукционе на лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3641900000163 Боровлянского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На лот 2 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 Горанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На лот 3 перечисляется на расчетный счет № 3641621030047 Ждановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052317, код платежа – 04901.

На лот 4 перечисляется на расчетный счет № 3641621200079 Заславского горисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999, код платежа – 04901.

На лот 5 перечисляется на расчетный счет № 3641900000020 Колодищанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052304, код платежа – 04901.

На лот 6 перечисляется на расчетный счет № 3641900000075 Луговослободского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600219251, код платежа – 04901.

На лот 7 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 Михановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На лоты 8–9 перечисляется на расчетный счет № 3641621120061 Папернянского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

На лот 10 перечисляется на расчетный счет № 3641900000277 Петришковского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052386, код платежа – 04901.

На лот 11 перечисляется на расчетный счет № 3641900000088 Самохваловичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424, код платежа – 04901.

На лоты 12–13 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 Хатежинского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

На лот 14 перечисляется на расчетный счет № 3641000000076 Щомыслицкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052373, код платежа – 04901.

На лот 15 перечисляется на расчетный счет № 3641900000147 Юзуфовского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052332, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
3. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.
4. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

4.1. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион в отношении каждого земельного участка признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано только одним участником аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов); для участия в аукционе не было подано ни одного заявления; на аукцион явился один из участников или ни один из участников не явился на аукцион.

Аукцион в отношении каждого земельного участка признается нерезультативным в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона не предложил свою цену.

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

Результаты аукциона аннулируются, если победитель аукциона в установленный срок: не внес плату за земельный участок; не возместил затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не выполнил условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, а также иные условия участия в аукционе. При этом внесенный победителем аукциона задаток возврату не подлежит.

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.*

**Крынічка**

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ.

## КАЛІ І ЯК ПРАВІЛЬНА ПАСЫНКАВАЦЬ ПАМІДОРЫ

**Гэты агратэхнічны прыём заключаецца ў выдаленні бакавых парасткаў на таматным кусце, якія фарміруюцца з пазух лісця на працягу ўсяго вегетацыйнага перыяду. Калі гэтыя парасткі пакінуць, пасля на іх з'явяцца суквецці з вялікай колькасцю пустой завязі і плады, што ўтвараюцца на цэнтральных сцёблах, не паспяваюць выспяваць, паколькі пажыўныя кампаненты, якія расліна атрымлівае з глебы, ідуць на фарміраванне зялёнай масы.**

Для прадуктыўнага вырошчвання памідораў, схільных сваімі сартавымі характарыстыкамі да ўтварэння пасынкаў, кусты варта пазбаўляць уручную ад лішніх парасткаў, пакідаючы два сцёблы з некалькімі суквеццямі. Першую апрацоўку мэтазгодна пачынаць праз паўмесяца пасля высадкі таматаў у адкрыты грунт або ў цяпліцы. Парастак, на якім з'явіцца першае суквецце, прынята лічыць асноўным. Фарміруючы куст, пакідаюць 1-3 парасткі: цэнтральны і 1-2 верхнія бакавыя, найбольш моцныя. Ніжнія парасткі ўтвараюцца пазней — менавіта іх мэтазгодна абарваць. Праводзіць пасынкаванне варта акуратна з дапамогай нажніц ці канцылярскага нажа.



Трэба таксама пакінуць пянёк у 1-2 см, які затармозіць з'яўленне новых атожылкаў на тым жа месцы. Выдаляць парасткі трэба тады, калі іх даўжыня складае 5-6 см. Для працэсу менш за ўсё падыходзіць раніца.

Да канца ліпеня на пакінутых суквеццях фарміруецца завязь памідораў. У гэты час верхавіну расліны варта прышчыпнуць над парай лістоў, размешчаных над гронкай. Такая працэдура праводзіцца для таго, каб прыпыніць рост парасткаў і ўтварэння лішкаў зеляніны. Пасля правядзення пасынкавання плады становяцца буйнейшымі і смачнейшымі.

Да ручной фарміроўкі высакарослых таматных кустоў неабходна падыходзіць індывідуальна і з улікам кліматычнай зоны. Але звычайна індэтэрмінантныя разнавіднасці пасынкуюць, пакідаючы 4-5 асноўных сцёблаў.

Пры акучванні таматаў ніжнія лісты трэба абавязкова выдаляць, паколькі яны спрыяюць захаванню залішняй вільгаці і перашкаджаюць нармальнай цыркуляцыі паветра, што можа прывесці да прысцябловага загнівання з далейшым узнікненнем грыбковых захворванняў.

Усе працы, звязаныя з фарміраваннем пладовых кустоў, варта рабіць у сухое цёплае надвор'е — так ранкі, атрыманыя пры выразанні пасынкаў, хутчэй падсохнуць і зажывуць, чым у непагодлівы дзень.

## РАЗМНАЖАЕМ ЧАРНІЦЫ НАСЕННЕМ

**З мэтай садовага вырошчвання чарніцы можна размнажаць насеннем, якое атрымліваюць як са спелых ягад, так і з замарожаных. Праўда, у адрозненне ад сваіх родных культурных формаў — журавін, буякоў, чарніцы да гэтага часу прадстаўлены толькі дзікімі відамі, паколькі іх афіцыйная селекцыя не праводзілася.**



Сабраны ўраджай размінаюць у шкляных з вадой і аддзяляюць скурку з мякаццю — на практыцы гэта няцяжка зрабіць, паколькі якаснае і здаровае насенне адразу асядае на дно. Пасля аддзяляем жамерыны, акуратна зліваем ваду, з дапамогай маленькай лыжкі вымаем насенне з ёмістасці і раскладваем вузкім радком на папяровых сурвэтках. Падсушаны і «прылеплены» да паверхні насенны матэрыял потым наразаецца стужкамі і высаджваецца на папяровым лісце, як гэта робіць з насеннем морквы ці радыскі.

Паколькі чарнічнае насенне практычна не схільнае да захоўвання ў чыстым выглядзе, але мае патрэбу ў стратыфікацыі, падрыхтаваны матэрыял размяшчаюць адразу на запланаваны ўчастак вырошчвання сеянцаў альбо прыкопваюць у кантэйнеры з рачным пяском і прыбіраюць да вясны ў халодны склеп. У абодвух выпадках чарніцы, перазімаваўшы, масава пойдуць у рост бліжэй да вясны.

Можна паступіць па-іншаму — проста прыкапаць саспелыя ягады ў глебу і чакаць вясновых усходаў, але, у адрозненне ад садовай культуры, такое размнажэнне лясной «дзічкі» малапрадуктыўнае і сеянцы фарміруюцца нядружна, расцягваючы працэс свайго з'яўлення з ягад, якія разлагаюцца, да 3 гадоў.

Пры выкарыстанні замарожаных ягад працэдура атрымання новых раслін значна спрашчаецца, бо ўмовы захоўвання чарніц у маразільных камерах імітуюць натуральныя зімовыя ўмовы, што выключае неабходнасць далейшай іх стратыфікацыі і дае магчымасць апераваць тэрмінамі высадкі. Гэта значыць, непасрэдна перад вясновай пасадкай ягады размарожваюць, з іх атрымліваюць насенне, суткі вымочваюць у растворы стымулятара росту і пасля праводзяць пасеў.

Пры правільным захаванні ўмоў вырошчвання, якое ў асноўным датычыцца падкісленай структуры грунту і падтрымання яго балансу, усходы чарніц са стратыфікаванага насення з'яўляюцца на працягу 18—30 дзён. Склад глебы для чарніц павінен паўтараць натуральнае асяроддзе. Таму ў чарнічных пасадках катэгарычна не рэкамендуецца выкарыстоўваць для падкорму актыўную арганіку, мел, даламітавую муку і попел, а акісленне нейтральных грунтоў і стварэнне камфортнага асяроддзя праводзіць з дапамогай мінеральных рэчываў, змяшаных з іглічнымі драўнянымі адходамі, сфагнумам і лясным ападам. Расліннія рэшткі мэтазгодна ўносіць не толькі ў грунт, але і ўжываць у якасці мульчы.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.59 | 21.31 | 16.32 |
| Віцебск — | 4.42 | 21.28 | 16.46 |
| Магілёў — | 4.49 | 21.21 | 16.32 |
| Гомель — | 4.54 | 21.10 | 16.16 |
| Гродна — | 5.16 | 21.45 | 16.29 |
| Брэст — | 5.25 | 21.38 | 16.13 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 19 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

*Пр. Аляксандры, Анастасіі, Вольгі, Марыі, Тацяны, Аляксея, Андрэя, Мікалая, Фёдара, Яфіма.*
*К. Ядвігі, Аляксея, Багдана, Марціна.*

## ЗАЎТРА



Фота Надзеі БУЖАН.




**НАРОДЖАНЫЯ 17 ліпеня**

**Гэтыя людзі дэманструюць жаданне стаць «зоркай» або ўзысці на самую вяршыню службовай лесвіцы і пры гэтым паводзяць сябе стрымана, сціпла, сарамліва. У сферы сваёй дзейнасці яны — непераўзыдзеныя прафесіяналы. За сур'ёзным выглядам хаваецца бліскучае пачуццё гумару. Яны могуць быць сканцэнтраваны на грошах ці аб'ектах улады, але часцей расходуюць час і энергію на сябе. Яны могуць мець добры забяспечаны тыл, але пераважна выконваюць сола. Упэўненасць у асабістых сілах у іх настолькі вялікая, што яны гадамі могуць чакаць грамадскага прызнання і ўвесь гэты час упарта працаваць дзеля яго.**


**Дарагія і паважаныя пляменнікі**
**Святлана і Анатоль ШПЛЕЎСКІЯ**
**са Слуцка!**
Ад сябе асабіста і Вашых родных прыміце нашы сардэчныя віншаванні з нагоды сярэбранага вяселля!
Няхай ліпеньскае сонейка асвятляе сцяжынку да роднай хаты, а водар і смак ліпавага мёду саладзяць Вашы сэрцы і каханне!
**Вашы родныя і Новік Т.І.**




**Даты | Падзеі | Людзі**

**1846** год — нарадзіўся Мікалай Міклуха-Маклай, славуты рускі падарожнік, этнограф, антрапограф, этнолаг. Ён пражыў кароткае жыццё, але стаў вядомым дзякуючы сваім даследаванням многіх краін свету. Вучоны ажыццявіў некалькі цікавых падарожжаў у экзатычныя куткі планеты. Пабываў на Канарскіх астравах і ў Марока, на берагах Чырвонага мора. Але самыя каштоўныя, з навуковага пункту гледжання, яго падарожжы ў Аўстралію і Акіянію. Міклуха-Маклай старанна запісваў свае назіранні за туземцамі. Гэтыя запісы прынеслі вялікую карысць навуцы.



**1914** год — 100 гадоў таму на алімпійскім кангрэсе ў Парыжы ў сувязі са святкаваннем дваццацігоддзя сучасных Алімпійскіх гульняў адбылася афіцыйная прэзентацыя алімпійскага сцяга: на белым палатне пяць пераплеценых рознакаляровых кольцаў, якія сімвалізуюць пяць частак свету: Еўропу, Азію, Афрыку, Аўстралію і Амерыку.

**1942** год — пачалася Сталінградская бітва — ці не самая галоўная падзея Другой сусветнай вайны. У ліпені 1942 г. нямецка-фашысцкія войскі зрабілі спробу завалодаць левым берагам Волгі ў раёне Сталінграда. Чатыры месяцы савецкія войскі ў напружаных баях адбівалі нападзенні. Затым два з паловай месяцы ажыццяўлялі контрнаступленне. Баі за Сталінград доўжыліся больш за паўгода. Страты абодвух бакоў перавысілі 2 мільёны чалавек. Для Савецкага Саюза перамога ў Сталінградскай бітве азначала пачатак вызвалення краіны і ажыццяўленне ў будучыні пераможнага маршу па краінах Еўропы, які прывёў да канчатковага паражэння нацысцкай Германіі.

**Было сказана**

**Антуан дэ Сэнт-Экзюперы, французскі пісьменнік:**

***«Дзяцінства — гэта вялікі край, адкуль прыходзіць кожны! Адкуль я родам? Я родам з майго дзяцінства, быццам з якойсьці краіны».***

## УСМІХНЕМСЯ

— Алё, Сцёпа, а ты дзе?
— У адпачынку, на курорце!
— І як там вадзіца?
— Мокранькая!
— А колькі градусаў?
— Безалкагольная!

**Не шукайце ідэальнага чалавека. Сёння я дома.**

— Тата, а ў цябе ў дзяцінстве быў ноўтбук або планшэт?
— Ды дзе там — тады і камп'ютараў не было.
— А на чым ты тады гуляў?
— На вуліцы, сынок, на вуліцы!




**З жыцця кантрабандыстаў**

## АНАБОЛІКІ Ў ТАМАТАХ

Мытнікі ў аўтамабільным пункце пропуску «Новая Рудня» праверылі грузавы аўтамабіль Volvo, якім кіраваў грамадзянін Малдовы. Машына «пад завязку» была нагружана таматамі. Пры апытанні кіроўца заявіў, што, апроч агародніны, у якасці асабістай маёмасці перавозіць скрынку ветэрынарных прэпаратаў, якую яго папрасіў даставіць у Мінск знаёмы. Аднак пры правядзенні агляду мытнікі сумесна з памежнікамі выявілі 8 скрынак анабалічных стэроідаў. Растворы для ін'екцый былі расфасаваны ў 3638 флаконаў, не задэклараваных ва ўстаноўленым парадку. Як паведамілі ў аддзеле ідэалагічнай работы Гомельскай мытні, тавар, які каштуе прыкладна 1,7 млн беларускіх рублёў, канфіскаваны. Распачаты адміністрацыйны працэс.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар—галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.662. Індэкс 63850. Зак. № 2932.

Нумар падпісаны ў 19.30 16 ліпеня 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12